ЛіМ

ГАЗЕТА
ТВОРЧАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ
БЕЛАРУСІ

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

18 лістапада 1994 г. № 46 (3768) Кошт 75 руб.

РДК

ВОНКАВА НІБЫТА ПАРУЖАВЕЛІ, АЛЕ ЎНУТРЫ ЧЫРВОНЫЯ

Анатоль СІДАРЭВІЧ: "БСДГ ад сваіх папярэднікаў засвоіла, што змаганне за сацыяльную справядлівасць і дэмакратыю цесна звязана з барацьбою за нацыянальнае вызваленне. Партыі спсп.Бухвостава, Нятылькіна і Кузняцова хочуць дамагчыся сацыяльнай дзяржавы і дэмакратыі ў Беларусі без культурнага, палітычнага і эканамічнага самавызначэння беларускага народа. Вось у чым розніца паміж ...БСДГ і тымі партыямі, якія прэтэндуюць быць носьбітамі ідэй сацыяльнай дэмакратыі ў Беларусі".

3

БАЛІЦЬ МАЁ СЭРЦА ЗА БЕЛАРУСЬ

Рыгор ЛЯВОНЦЬЕЎ: "Ёсць усе прыродныя і геаграфічныя перадумовы для таго, каб праз 2-3 гады Беларусь стала багацець, а праз пяць гадоў яе назвалі багатай. Толькі трэба адкрыць прастору народнаму працалюбству".

5, 12

ЗАГАДКА ВЯЛІКАГА МІСТЫФІКАТАРА

Тайнае жыццё Сальвадора Далі на сцэне Маладзёжнага тэатра Беларусі.

11

Пра ролю міс Ані, настаўніцы, якая навучыла сваю слепаглуханямую вучаніцу адчуваць і спазнаваць жыццё, пісалі ўжо, як пра выбітную, адметную работу Раісы АСТРАДЗІНАВАЙ, актрысы Рэспубліканскага тэатра юнага гледача. На кастрычніцкім трыенале Беларусі, Расіі і Нямеччыны "Тэатр—дзецям" спектакль "Стваральніца цуду" У. Гібсана сыгралі самым першым: ён задаў тон мастацкай праграме і пацвердзіў кірунак абмеркаванняў навукова-практычнай канферэнцыі "Псіхалагічная рэабілітацыя дзяцей сродкамі тэатральнага мастацтва". Усе абмеркаванні — і навуковыя, і практычныя, і кулуарныя, — пачыналіся з работы нашага тэатра. Ці не кожны вылучаў дуэт актрыс Веры Кавалеравай і Раісы Астрадзінавай, вядомай і — па званні — заслужанай актрысы і яе годнай калежанкі. Але не кожны мог сабе ўявіць, што, перайграўшы матылёў і стракозак, вылучыўшыся ў ролі Дзюймовачкі, Раіса Астрадзінава, паводле аднаго з крытыкаў, здзейсніла цуд пераўтварэння сваёй акцёрскай індывідуальнасці, можна сказаць, што яна падначаліла сабе абставіны жыцця ў дзіцячым тэатры, выбавілася з так званай спецыфікі, — гэта значыць, шчасліва пераканала калег і рэжысуру ў сваіх шырокіх, адметных прафесійных магчымасцях! Вядома, дзякуй масквічу Уладзіміру Салюку, які паставіў спектакль і запрасіў на ролю Ані Раісу Астрадзінаву. Вядома, дзякуй мастацкаму кіраўніку тэатра Мадэсту Абрамаву, які толькі і робіць, што ўсяляк мяняе звыклую "тюговскую" спецыфіку, — чаго вартыя аншлагі і паўнюткая зала чатыры гады запар! Але, шчыра кажучы, каму з нас не выпадала "змяніць амплуа"? І ці шмат хто здолеў яго змяніць?

У Раісы Астрадзінавай шчасліва супалі магчымасці і патрэбы. Сваю мастацкую вартасць і падрыхтаванасць да самай складанай працы на падмостках яна ўжо давяла.

Ж. Л.

Фота В. СТРАЛКОЎСКАГА

БУДЗЬМА РАЗАМ!

Паважаныя чытачы "ЛіМа"! Усяго сем дзён засталося да заканчэння падпіскі на першае паўгоддзе 1995 года. Сем дзён — сем шанцаў застацца нам разам. І тым не менш — не адкладвайце на заўтра тое, што варта зрабіць сёння. Падпішыцеся на "ЛіМ" — і наш тыднёвік кожную пятніцу будзе сам прыходзіць да вас. Падпішыцеся на "ЛіМ" — і вы сэканоміце час і грошы.

Падпісны кошт: на паўгода — 3000 рублёў, на 3 месяцы — 1500 рублёў, на 1 месяц — 500 рублёў.

Наш індэкс: 63856

ЛІМ КОЛА ДЗЁН

Наш прэзідэнт на мінулым тыдні яшчэ раз даказаў Беларусі і ўсяму свету, што ягонай "ідэйнай платформай" быў і застаецца папулізм. І толькі. Вярнуўшыся з лячэння на водах, спадар Лукашэнка першай справай вырашыў аднавіць парушаную без яго ведама сацыяльную справядлівасць: знізіць павышаныя ў некалькі разоў цэны. Ніякія запэўніванні чыноўнікаў з Кабінета Міністраў у тым, што ўсё ідзе па плану: па прэзідэнцкай антыкрызіснай праграме, — яго не пераканалі. Не прыслухаўся ён ні да слоў прэм'ер-міністра М. Чыгіра, што і цяпер на Беларусі цэны ў некалькі разоў ніжэй, чым у Расіі і Прыбалтыцы, з-за чаго зноў узнікае праблема вывазу прадуктаў за межы; ні да слоў віцэ-прэм'ера В. Ганчара, што няма высокіх цэн, ёсць нізкія даходы... Прэзідэнт на сваім настаяў. Што з таго выйшла, мы ўбачылі ў панядзелак у крамах: шмат шуму з нічога. На лічаныя "зайчыкі" былі зніжаны толькі цэны на хлеб і малако. Усе астатнія спусціцца з завоблачных вышыняў па загадзе прэзідэнта не пажадалі. Цяпер чакаем-с абяцаных арыштаў тых, хто не паслухаўся... Прэзідэнт тым часам наведаў колькі крамаў, каб праверыць, як выконваецца ягоны загад, і паабяцаў расчараваным пакупнікам, што зніжэнне цэн часовае, праз тыдзень-другі яны будуць павышаны ў два разы... Дык навошта было агарод гарадзіць і некалькі дзён трымаць у напружанні краіну?

ВЫСТУПЛЕННЕ ТЫДНЯ

Вяртанне прэзідэнта на радзіму ажывіла палітычна-эканамічнае жыццё ў краіне. З паветранага карабля сп. Лукашэнка адразу ж накіраваўся на "баль" — у прамы эфір БТ. Кіраўнік дзяржавы выступаў не па-пісанаму, а па тэзісах, накіданых на шматках паперы. Колькі разоў Саша Фядута прасіў яго не рабіць гэта, уважаючы найперш залішнюю эмацыйнасць. На гэты раз сам Фядута прасачыць за падрыхтоўкай прэзідэнцкага выступлення, пэўна, не мог, бо рыхтаваўся да ўласнага вяселля. І таму ў гэты вечар на экране было ўсё: непрыхаваныя дыктатарскія замашкі, жаданне самому кіраваць усім — і цэнамі, і прэсай, і тэлебачаннем, катэгарычныя загады, пагрозы і абяцанні, апеляванне да 80 працэнтаў народу, які абраў сабе прэзідэнта... Назаўтра прэзідэнт сабраў на экстранную нараду кіраўнікоў усіх галін улады нашае дзяржавы. Што з гэтага выйшла — вы ведаеце з папярэдняй інфармацыі.

ПАТРАБАВАННЕ ТЫДНЯ

Выступаючы перад калегамі, народны дэпутат Беларусі Сяргей Навумчык запатрабаваў апублікаваць афіцыйнае заключэнне пра стан здароўя прэзідэнта краіны А. Лукашэнкі, як гэта робіцца ў цывілізаваным свеце. Думаем, што да гэтага патрабавання далучаюцца тысячы грамадзян нашае краіны, якія хочуць ведаць праўду: чым хварэе прэзідэнт і дзе ён лячыўся. Аднак Адміністрацыя прэзідэнта адказу пакуль не дала, ні С. Навумчыку, ні ўсім нам. "Не заўважылі" ў Адміністрацыі і скандальную інфармацыю карэспандэнта "Народнай газеты" пра тое, як ён хацеў даведацца, дзе лечыцца прэзідэнт, але так і не даведаўся нічога. Дзіўнае маўчанне.

КАНФЛІКТ ТЫДНЯ

Канстытуцыйны суд прыпыніў дзейнасць прынятага парламентам Беларусі Закона "Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь аб мясцовым самакіраванні і мясцовай гаспадарцы". Тым самым было спынена стварэнне так званай "прэзідэнцкай вертыкалі". Каманда прэзідэнта адразу загаварыла аб залішняй палітызаванасці Канстытуцыйнага суда і аб антыканстытуцыйнасці прынятага рашэння, а Д. Булахаў прапанаваў унесці на разгляд сесіі шэраг паправак, якія пазбавяць суд права прыпыняць дзейнасць закона. Нягледзячы на небывалы ціск з боку прэзідэнта і яго каманды, в. а. старшыні Канстытуцыйнага суда В. Ціхіня пакуль стаіць на сваім. "Мы будзем стаяць на абароне канстытуцыйнага ладу і канстытуцыйнай законнасці ў Беларусі. Як бы нехта ні спрабаваў накінуць аброць на Канстытуцыйны суд", — заявіў В. Ціхіня. Кола канфлікту толькі пачынае раскручвацца...

СКАНДАЛЬЧЫК ТЫДНЯ

Газеты абляцела паведамленне Белінфарма пра тое, што адзін з бліжэйшых паплечнікаў прэзідэнта Д. Булахаў у хуткім часе можа заняць пасаду мэра сталіцы Беларусі. Нягледзячы на тое, што гэтую інфармацыю адразу ж абверглі А. Фядута, сам Д. Булахаў ды і цяперашні мэр А. Герасіменка — пытанні засталіся, бо, як кажуць, дыму без агню не бывае. "Звязда", напрыклад, мяркуе, што "адбой" плануемаму прызначэнню Булахава быў дадзены пасля таго, як Канстытуцыйны суд прыпыніў пабудову "прэзідэнцкай вертыкалі", а інфармацыю пра мажлівае прызначэнне Д. Булахава мэрам сталіцы пусцілі ў свет яго шматлікія нядобразычліўцы.

ЗАЯВА ТЫДНЯ

Дэпутаты апазіцыі БНФ у Вярхоўным Савеце Беларусі выступілі з заявай, у якой аналізуюць чатырохмесячную дзейнасць А. Лукашэнкі на пасадзе прэзідэнта. Дзе барацьба з карупцыяй, дзе абяцанае зніжэнне цэн, дзе абяцанае спыненне інфляцыі, дзе абяцаны запуск вытворчасці, што наогул палепшылася ў нашым жыцці за чатыры месяцы, — пытаюць дэпутаты і адказваюць, — нічога. Наадварот, становішча пагоршылася: "З 10 ліпеня 1994 года па канец верасня кошт мінімальнага харчовага кошыка жыхара Беларусі павялічыўся ў тры разы, мінімальная зарплата ў доларавым эквіваленце паменшылася амаль удвая, хуткасць росту цэн на асноўныя спажывецкія тавары перагнала рост заработнай платы ў 14 разоў (такога яшчэ ніколі не было), інфляцыя перавышае ўжо 50 працэнтаў у месяц..." "Сумбурныя дзеянні і выказванні, якія зыходзяць зараз ад кіраўніка краіны і яго адміністрацыі, вядуць у глухі тупік беларускую эканоміку і ўсё грамадства, штурхаюць людзей да жабрацтва, што стварае рэальную пагрозу існаванню — нашай дзяржавы і нацыянальнай уласнасці". Дэпутаты апазіцыі БНФ заклікалі грамадзян Беларусі разам шукаць выйсце з пагрозлівага становішча стварэннем і падтрымкай нацыянальнай дэмакратычнай альтэрнатывы разбуральнай папулісцкай палітыцы.

КРАДЗЕЖ ТЫДНЯ

З могільніка "Шапятовічы", што ў Чачэрскім раёне, выкрадзена 6 тон радыеактыўных адыходаў. Грабежнікаў зацікавіла медзь, якая складае да 80 працэнтаў гэтых адыходаў. Міліцыя пакуль не можа знайсці сляды злодзеяў. "Каштоўны" метал, хутчэй за ўсё, "засвеціцца" далёка за межамі Беларусі.

СЮРПРЫЗ ТЫДНЯ

Такога не памятаюць нават доўгажыхары: ранкам 15 лістапада на некалькі гадзін Беларусь была паралізавана... галалёдам. Тонкі, у некалькі міліметраў, пласт лёду пакрыў усё наваколле. Спыніўся грамадскі транспарт, слізгаючы па лёдзе, нібы па шкле, людзі гадзінамі дабіраліся да працы. Да капрызу надвор'я зусім не гатовымі аказаліся дарожнікі, падвяла, як заўсёды, метэаслужба. Нас супакойваюць: пацярпелых у гэтую раніцу было няшмат — чакалі большага... Да пацярпелых з-за надвор'я можна аднесці і беларускіх футбольных заўзятараў. Доўга не было вядома, ці адбудзецца гульня мік зборнымі Беларусі і Нарвегіі з-за стану поля на стадыёне "Дынама". Урэшце матч адбыўся, але лепш бы яго перанеслі на вясну: беларусы прайгралі 4:0.

АБСУРД ТЫДНЯ

На Беларусі з'явілася яшчэ адна афіцыйна зарэгістраваная грамадская арганізацыя — Беларускі патрыятычны рух. Выступаючы па ТБ, міністр юстыцыі адзначыў, што з рэгістрацыяй руху не было праблем, бо яго статут цалкам адлавядае мэтам і задачам руху. Гэта добра, але, на наш погляд, мэтам і задачам руху не адлавядае яго назва: што гэта за беларускія патрыёты, якія збіраюцца змагацца супраць дзяржаўнасці Беларусі?

З нагоды

"І ГАРАЧАЕ СЭРЦА ПРЭЗІДЭНТА"...

І ўсё-такі я вынес у загаловак менавіта гэтыя словы прэм'ер-міністра М. Чыгіра, якімі ён без усякай іроніі паспрабаваў вытлумачыць апошні афронт кіраўніка нашай краіны А. Лукашэнкі, — яго тэлевыступленне ў мінулую пятніцу, якое нарабіла столькі шуму.

І хоць на ўрадавай прэс-канферэнцыі, якая адбылася ў панядзелак, 14 лістапада, старшыня Кабінета Міністраў М. Чыгір, віцэ-прэзідэнты С. Лінг, В. Ганчар і У. Гаркун, як кажуць, дэманстравалі перад журналістамі бадзёрасць духу і нават вясёлы настрой, можна было сабе ўявіць, што яны перажылі пасля прэзідэнцкага выступлення па Беларускім тэлебачанні. Тым больш, што, як высветлілася, і для Кабінета Міністраў, і для адміністрацыі прэзідэнта ў асобе яго бліжэйшых паплечнікаў усё, пра што гаварыў прэзідэнт, як, дарэчы, і само яго рашэнне выступіць па тэлебачанні, было поўнай нечаканасцю. Як было, відаць, нечаканым і пачуць з вуснаў кіраўніка выканаўчай улады ў краіне знішчальную крытыку па адрасе Кабінета Міністраў, з такім, здаецца, стараннем ім падабранага. Менавіта гэтымі абставінамі можна было растлумачыць прагучаўшае на прэс-канферэнцыі пытанне прэм'ер-міністру аб тым, ці не збіраецца ўрад цяпер падаць у адстаўку, на што М. Чыгір, міла ўсміхаючыся, пакруціў галавой адмоўна, не без падставы спасылаўшыся на тое, што прэзідэнт, нягледзячы на ўсе свае "грамы і маланкі", не зрабіў ніякіх кадравых змен у Кабінеце Міністраў. І наогул, маўляў, не трэба абсалютызаваць усё пачутае ў той вечар з вуснаў Аляксандра Рыгоравіча, бо многае тлумачылася яго залішняй эмацыянальнасцю, гарачым сэрцам і жаданнем як мага хутчэй зрабіць жыццё народа Беларусі лепшым.

У такім прыблізна ключы выказаліся на прэс-канферэнцыі і намеснікі прэм'ер-міністра, не ўпусціўшы моманту, каб запэўніць журналістаў, што прынятая парламентам антыкрызісная праграма будзе праводзіцца ў жыццё.

І, усё ж, спытаем, якую, кажучы тэатральнай мовай, звышзадачу ставіў перад сабой спадар А. Лукашэнка, звярнуўшыся да народа Беларусі адразу пасля свайго вяртання ў Мінск? Не аднымі ж эмоцыямі ён кіраваўся, робячы гэты крок, які віцэ-прэм'ер В. Ганчар ахарактарызаваў, як адназначна палітычны. Я б дадаў — і як класічна папулісцкі.

У тэлевыступленні прэзідэнта было аддадзена шмат месца рэзкай крытыцы Вярхоўнага Савета і Канстытуцыйнага суда, дзе нібыта плятуцца супраць яго змовы. Але, мне здаецца, пры ўсім сваім палымяным жаданні паставіць вышэйшыя заканадаўчы і судовы органы на "месца", Аляксандр Рыгоравіч дзеля гэтага не стаў бы бударажыць шматмільённую тэлеаўдыторыю, якая ў сваёй масе слаба разбіраецца ў такіх складаных матэрыях, як заканадаўчая і судовая дзейнасць у кантэксце захавання духу і літары Канстытуцыі краіны. І хоць гэтыя пытанні прэзідэнт вынес на пачатак свайго выступлення, нібы падкрэсліваючы гэтым іх першаступеннае значэнне, уся тэлеакцыя была ім скіравана ў першую чаргу тым праславутым 82-м працэнтам выбаршчыкаў, якія аддалі за яго галасы на мінулых прэзідэнцкіх выбарах і сярод якіх папулярнасць А. Лукашэнкі апошнім часам пачала рэзка падаць. Тлумачэння гэтаму доўга шукаць не трэба — гэта збядненне значнай колькасці насельніцтва, абумоўленае ў першую чаргу абвальным ростам цэн на ўсё і ўся, нягледзячы на яго публічныя абяцанні ні ў якім разе гэтага не дапускаць. З тэлеэкрана кіраўнік краіны, ратуючы ўласны імідж, аб'явіў пра сваё рашэнне "адматаць" цэны назад, да першалістападаўскага ўзроўню, даўшы зразумець пры гэтым, што павышэнне рознічных цэн падчас яго адсутнасці ў краіне адбылося без яго ведама і насуперак яго ўстаноўкам.

Ці паверыла ў гэта насельніцтва? Мяркуючы па размовах, якія можна было пачуць у магазінах, транспарце, іншых людных мясцінах, — паверыла. У чарговы раз спрацавала старая, як свет, казачка пра добрага "цара" і благіх "баяр". У дадзеным выпадку, відаць, міністраў, якія наўмысна шкодзяць прэзідэнту, сабатуюць яго ўказы.

Так што імкненню А. Лукашэнкі павысіць свой рэйтынг сярод выбаршчыкаў, па маім разуменні, спадарожнічаў поспех. Іншая справа, як доўга гэты рэйтынг удасца захаваць. Тут перспектывы, здаецца, не вельмі вясёлыя. Па-першае, дэкларавана зніжэнне цэн, і гэта адразу раскусіў народ, тычылася толькі невялікай часткі спажывецкага кошыка. Па-другое, абяцаны ўзровень цэн на першае лістапада, ад якога меркавалася "танцаваць" пановаму, быў адразу вызначаны з 18-працэнтнай надбаўкай, бо прэзідэнт абяцаў у свой час выбаршчыкам не павышаць цэны вышэй гэтага паказчыка. Па-трэцяе, усе пачынаюць разумець, што з павышэннем з першага лістапада ўдвая мінімальнай зарплаты і з пачаткам першых выплат па новых тарыфных стаўках не сёння-заўтра можна чакаць новага, мо яшчэ больш крутога вітка цэн. Тое, што адбылося з імі на гэтым тыдні, прэм'ер-міністр М. Чыгір назваў "тактычным кароткачасовым адступленнем ад рэформ". Паводле апублікаваных звестак, адступленне гэтае абышлося дзяржаве ў 100 мільёнаў рублёў. Але ж ніякімі грашыма не вымераць страт, якія панёс міжнародны імідж нашай краіны, дзе, аказваецца, магчымы яшчэ падобныя рэцыдывы метадаў былой камандна-адміністрацыйнай сістэмы.

М. ЗАМСКІ

Пошта

ПА ПРЭЗІДЭНЦКАЙ ВЕРТЫКАЛІ Ў НОВЫ 1995...

Вось і здарылася тое, што павінна было здарыцца, — дэпутаты Вярхоўнага Савета дружна прагаласавалі за прэзідэнцкую вертыкаль — скасавалі Саветы пярвічнага ўзроўню, а потым... 82 дэпутаты звярнуліся ў Канстытуцыйны суд з заявай аб парушэнні Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

Што ні кажыце, а кожная сесія Вярхоўнага Савета абавязкова выдае нам такое, што не ведаеш — ці смяяцца, ці плакаць!

З 1 лістапада, згодна прынятым змяненням і дапаўненням Закона "Аб мясцовым самакіраванні і мясцовай гаспадарцы ў Рэспубліцы Беларусь", павінны былі пачаць работу ліквідацыйныя камісіі ва ўсіх сельскіх, пасялковых, раённых, у гарадах і гарадскіх раённага падпарадкавання Саветах. Але... але пасля рашэння Канстытуцыйным судом па заяве дэпутатаў дзеянне прынятых змяненняў прыпыняецца. Радавацца ці сумаваць з гэтай нагоды, бо ўся гэтая валтузня дэмаралізавала Саветы гэтага ўзроўню?

Паспрабую выказаць, як кажуць, погляд з глыбінкі на тое, што адбываецца, як бачыцца сітуацыя намі — супрацоўнікамі такога Савета.

Знакаміты лозунг бальшавікоў, кінуты ў натоўп у кастрычніку 1917 года, — "Уся ўлада Саветам!" па сваёй сутнасці быў антыдэмакратычным. Бо прынцып дэмакратычнага ладу краіны — гэта незалежнасць трох галін улады: заканадаўчай, выканаўчай і судовай. Гэтая трыяда стварае раўнавагу. Любое парушэнне ў гэтай трыядзе прыводзіць, у лепшым выпадку, да дэстабілізацыі грамадства, а ў горшым — да таталітарызму і дыктатуры. Што і адбылося ў былым СССР.

І вось сёння першы Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь праз 77 гадоў скасоўвае антыдэмакратычны бальшавіцкі лозунг "Уся ўлада Саветам!" і ...бярэ гэтую ўладу ў свае рукі.

Як кажуць, прыехалі... Засталося толькі крыху падправіць стары лозунг, каб усё было без падману: "Уся ўлада прэзідэнту!".

Калі існаваўшая сістэма (не вельмі дэмакратычная) усё ж праз абранне дэпутатаў давала магчымасць выбаршчыкам уздзейнічаць на вынікі выбараў мясцовай улады, дык што цяпер? Паспрабую ўзяць на сябе адказнасць, сказаўшы, што прызначэнне кіраўнікоў выканкамаў і вясковай адміністрацыі прывядзе да таго, што галоўнай якасцю, якую павінен мець кандыдат на пасаду, павінна быць адданасць свайму суверэну — асобе, якая прызначае на пасаду, а прафесійныя і асабліва маральныя якасці не будуць мець рашаючага значэння. Наўрад ці знойдзецца месца сапраўды самастойным, незалежным людзям у гэтай прэзідэнцкай вертыкалі, тым, хто не пабаіцца не пагадзіцца са сваім суверэнам, калі гэтага патрабуе справа. Па-першае, такіх людзей не вельмі будуць запрашаць у гэтую вертыкаль. Па-другое, гэтыя людзі, калі іх нават і запросяць, добра падумаюць, перш чым даць згоду, бо не прымаюць яны правілы, па якіх трэба будзе працаваць: "Как прикажете, ваша экселенция!". Прэзідэнцкая вертыкаль у такім выглядзе — гэта пагібель для кволых парасткаў дэмакратыі ў Рэспубліцы Беларусь. Я не супраць прэзідэнцкай вертыкалі ўвогуле. Але я за цывілізаваную прэзідэнцкую вертыкаль.

Паспрабую даць агульную схему рэфармавання Саветаў. Яно павінна несці ў сабе прагрэсіўныя ідэі. Бо нічога не зменіцца, калі фарміраванне бюджэту будзе ісці так, як ідзе цяпер, — зверху ўніз па размеркавальным прынцыпе. Нічога не дасць і фарміраванне бюджэту знізу, калі Саветы застануцца без уласнасці, як і цяпер. Мясцовая ўлада будзе сапраўднай уладай толькі тады, калі яна будзе гаспадаром на сваёй адміністратыўнай тэрыторыі, гэта значыць, калі яна будзе валодаць уласнасцю. З гэтай умовы вынікае і безумоўнае абранне прамымі выбарамі мясцовай адміністрацыі.

Але як жа быць тады з прэзідэнцкай вертыкаллю, якая будзе яе роля, якое ўздзеянне на мясцовае самакіраванне?

Прэзідэнт прызначае сваіх прадстаўнікоў у адміністрацыйныя адзінкі так, як ён лічыць неабходным. Яны кантралююць выкананне мясцовымі органамі самакіравання Канстытуцыі, указаў прэзідэнта, пастаноў Кабінета Міністраў. Калі прадстаўнік прэзідэнта заўважыць парушэнне з боку мясцовых улад, ён выносіць пісьмовае папярэджанне аб маючым месца

«ЭТНАКАСМАЛОГІЯ УСХОДНЯЙ ЕЎРОПЫ: БАЛТЫЙСКАЯ МАДЭЛЬ СВЕТУ»

Пад гэткай назвай у Мінску ў Інфармацыйна-культурным цэнтры СМ Рэспублікі Беларусь плённа працавала Міжнародная навуковая канферэнцыя, арганізаваная мінскім Цэнтрам этнакасмалогіі "Крыўя". Гэта не першая падобная акцыя Цэнтра. У беларускім і замежным друку ўжо паведамлялася пра арганізаваныя "Крыўяй" Міжнародную канферэнцыю "Балты і этнагенез беларусаў" (май 1993 г.) і Міжнародныя Балтыйскія дударскія фэсты (1992 і 1993 гг.). Пра адметную рэгіянальную скіраванасць дзейнасці Цэнтра сведчаць самі назвы праведзеных мерапрыемстваў.

Даследаванні па тэме "Балтыйская мадэль свету" яшчэ толькі пачынаюцца. Таму істотна было на прадстаўнічай сустрэчы адмыслоўцаў з розных галін ведаў накрэсліць перспектыўнае праблемнае кола і галоўныя накірункі даследаванняў, ад якіх у бліжэйшыя гады можна было б чакаць цікавых вынікаў.

На мінскую канферэнцыю сабраліся навукоўцы з 6 краін (Беларусі, Літвы, Латвіі, Польшчы, Расіі, Вялікабрытаніі), сярод іх археолагі, антраполагі, лінгвісты, этнографы, фальклярысты, этнамузыколагі, кожны са сваім адмысловым бачаннем праблем. Але гэткая стракатасць і шматспектавасць у зыходных пазіцыях удзельнікаў канферэнцыі не толькі не шкодзіла працы і пошуку адлаведнай тэматыцы "мета-мовы", але й стварала своеасаблівы стэрэаскапічны эфект, які спрыяў больш дзейснаму арыентаванню ў азначанай праблемнай прасторы.

Усяго былі заслуханы 42 даклады. Сярод удзельнікаў — як даследчыкі вядомыя (Г. Штыхаў, Л. Побаль, Е. Бартмінскі, С. Прохарава, А. Відугірыс, І. Мацыеўскі, І. Назіна, Э. Ляўкоў), так і таленавітая моладзь (Е. Вайшкунас, В. Губіна, Т. Валодзіна, Я. Цыгліс, Ж. Кошалева і інш.).

У часе фармальных і нефармальных абменаў думкамі неаднаразова гучала прапанова зрабіць падобныя сустрэчы рэгулярнымі і па магчымасці перыядычна праводзіць іх па чарзе ў адной з краін Балтыйскага рэгіёна.

Н.К.

ВОНКАВА НІБЫТА ПАРУЖАВЕЛІ, АЛЕ ЎНУТРЫ ЧЫРВОНЫЯ

ПРА НОВЫЯ ПАРТЫІ

Ужо каторы месяц я хачу займець тры дакументы: праграму і статут Беларускай Сацыялістычнай Партыі, а таксама спіс сяброў яе паліткамітэта. Мне вядома толькі адно: што старшынёй партыі з'яўляецца Вячаслаў Кузняцоў — былы сакратар райкама КПБ. Кажуць, што партапарат узначальвае Міхась Падгайны — былы сакратар ЦК ЛКСМБ па ідэалогіі і старшыня Камітэта па справах моладзі пры Вячаславе Кебічу. З вартых даверу крыніц вядома таксама, што партыю меліся стварыць "пад Кебіча", але няўдача Францавіча на выбарах трохі паламала планы.

Устаноўчы з'езд Сацыялістычнай Партыі адбываўся, можна сказаць, патаемна. Нідзе не быў апублікаваны склад аргкамітэта, нейкі зварот з выкладам мэтаў. На з'езд не былі запрошаныя прадстаўнікі іншых партый. Наколькі мне помніцца, сацыял-дэмакраты запрасілі на свой І з'езд усіх — ад БНФ да камуністаў. Не кажу пра тое, што склад ініцыятыўнага (потым арганізацыйнага) камітэта быў апублікаваны за тры месяцы да Устаноўчага з'езда.

Сакрэтнасць, пры якой ствараліся Сацпартыя, наводзіць на роздум. З аналізу дзеянняў яе "айцоў" можна зрабіць адну выснову: былыя кампартапаратчыкі стваралі новую партыю апаратным метадам.

Калі б на з'езд Сацпартыі былі запрошаныя прадстаўнікі іншых партый, калі б былі апублікаваныя дакументы партыі, не трэба было б строіць ніякіх здагадак і аналізаваць сутнасць партыі паводле ўскосных матэрыялаў.

Адзіны больш-менш падрабязны дакумент, з якога можна штоколечы ўведаць пра БСП... (Стоп! У нас ужо ёсць партыя з такой абрэвіятурай — Беларуская Сялянская Партыя. Цікава, як яны паразумеюцца 1 красавіка наступнага года —калі настане час перарэгістроўваюцца ў адпаведнасці з законам аб палітычных партыях?) Дык вось, адзіны больш-менш падрабязны дакумент, з якога можна што-колечы ўведаць пра БелСП (ці БСацП?), — гэта інтэрв'ю В.Кузняцова "Народнай газеце". Паспрабуем прааналізаваць хоць бы гэты дакумент.

За што выступае Сацыялістычная Партыя?

"БСП выступает за построение сильного государства и общества социалистической ориентации. Убеждены, что это отвечает убеждениям и желаниям абсолютного большинства белорусского народа. До сих пор же ни одна созданная и зарегистрированная политическая партия не определила для себя основной целью построение социалистического общества".

Мяне, сацыял-дэмакрата, анітрохі не палохае намер Сацпартыі будаваць сацыялістычнае грамадства. Бо далей В.Кузняцоў кажа: "БСП — за равное и цивилизованное соперничество многообразных форм собственности: государственной, частной, муниципальной, кооперативной, акционерной".

Іншымі словамі, лідэр Сацпартыі выказваецца за тое, што запісана ў Праграме БСДГ, — за шматукладную эканоміку.

У сацыяльнай сферы мэты сацпартыі ідэнтычныя мэтам Грамады: "...партия ставит своей целью создание условий для формирования массового "среднего класса" людей труда..." І далей: "Нас привлекает идея сильного социального государства". Рыхтык як у Праграме БСДГ! У ёй ёсць спецыяльны раздзел "Сацыяльная дзяржава".

Далей гаворка ідзе пра палітыку сацыяльнай салідарнасці, якая забяспечвае сацыяльны мір. І гэта таксама супадае з пастулатамі сацыял-дэмакратыі. Сацыял-дэмакратычны прынцып салідарнасці з'яўляецца стрыжнем Праграмы нашай партыі. Мы запісалі ў Праграму палажэнне пра салідарнае грамадства. Мы гаворым таксама пра салідарнасць культур, пра салідарныя высілкі грамадства ў справе выжывання і захавання здароўя нацыі і г.д.

Тут трэба патлумачыць. Афіцыйнай канцэпцыяй Сацыялістычнага Інтэрнацыянала, як яна распрацавана ў Стакгольмскай Дэкларацыі прынцыпаў 1989 г., з'яўляецца канцэпцыя ДЭМАКРАТЫЧНАГА САЦЫЯЛІЗМУ, пачатак якой пакладзены ў 1888 г. і якую распрацоўвалі Эдуард Бэрнштайн, Ота Баўэр, Карл Каўцкі ды іншыя выдатныя тэарэтыкі. Ідэя дэмакратычнага сацыялізму з'яўляецца асновай Праграмы Сацыял-Дэмакратычнай Рабочай Партыі Швецыі (1990), іншых партый. Нашы шведскія сябры, якія не толькі ў тэорыі, але і на практыцы выпрацавалі мадэль спалучэння дэмакратыі і сацыяльнай справядлівасці ("шведскі сацыялізм"), не вагаліся, карыстацца ім тэрмінам "дэмакратычны сацыялізм" ці не. Інакш справы складваюцца ў цэнтры і на ўсходзе Еўропы. Тут паняцце "сацыялізм", як і паняцце "таварыш", было спаганенае камуністамі. У час "перабудовы" М.Гарбачоў і яго паплечнікі дыскрэдытавалі і паняцце "дэмакратычны сацыялізм". У Нямеччыне дысідэнты з былой САПГ стварылі Партыю Дэмакратычнага Сацыялізму. Таму нямецкія сацыял-дэмакраты ў сваёй Берлінскай праграме (1990) запісалі палажэнне аб САЛІДАРНЫМ ГРАМАДСТВЕ. Гэткім жа шляхам пазней пайшла і наша партыя. Тэарэтычна і практычна тэрмін "салідарнае грамадства" ёсць сінонім тэрміна "дэмакратычны сацыялізм".

У праграме Сацпартыі, як вынікае з інтэрв'ю В.Кузняцова, гаворка ідзе не пра дэмакратычны сацыялізм, а проста пра сацыялізм. Праўда, лідэр новай партыі катэгарычна выказаўся супраць дзяржаўна-адміністрацыйнага сацыялізму і заявіў, што грамадству "нужен новый, подлинно демократический, основанный на социальной справедливости и приоритете свободы личности, человека труда социально-политический строй".

Як бачым, гаворкі пра дэмакратычны сацыялізм няма, хоць каштоўнасці дэмакратычнага сацыялізму (свабода, салідарнасць, сацыяльная справядлівасць, дэмакратыя) у інтэрв'ю названыя. Выпадкова гэта ці не?

7 лістапада ў "Советской Белоруссии" змешчана яшчэ адно інтэрв'ю В.Кузняцова. Нічога новага пра змест праграмы Сацпартыі ў ім няма. У сувязі з чарговай гадавінай кастрычніцкага перавароту В.Кузняцоў заклікае "различать в нашем прошлом то, что является порождением тоталитаризма, следствием вероломного попрания социалистических принципов, правового беззакония, и то, что завоевано нашим народом в послеоктябрьский период". Лідэр Сацпартыі не паказвае, што было прычынаю таталітарызму ў СССР. Ці не ў ленінскім вучэнні пра партыю новага тыпу і пра дыктатуру пралетарыяту як дэмакратыю для большасці і дыктатуру для меншасці корань зла? Нагадаем, што ў той час сацыял-дэмакратыя ў Еўропе ўжо цвёрда стала на рэфармісцкі шлях, вызнавала прынцыпы прававай дзяржавы. У вачах бальшавікоў гэта выглядала здрадаю марксізму.

Падобна на тое, што сярод былых партапаратчыкаў пачынаецца набліжэнне да сацыял-дэмакратычных прынцыпаў. Ім спатрэбілася на гэта аж тры гады. Нагадаю, што М.Гарбачоў нават пасля жнівеньскага путчу, гаворачы пра "сацыялістычныя каштоўнасці" не даўмеўся ў лёсавызначальны час заклікаць сваіх прыхільнікаў перайсці на пазіцыі сацыял-дэмакратыі. Аляксандр Якаўлеў, які парваў з КПСС да путчу, толькі сёлета, калі верыць расійскім газетам, пачаў рабіць рэальныя крокі ў гэтым напрамку. Беларускія кампартапаратчыкі ўжо засвоілі сацыял-дэмакратычны лексікон, але камуністычныя прымхі не выпускаюць іх з палону. Вонкава яны нібыта паружавелі, але ўнутры застаюцца чырвоныя.

Такім чынам, калі лічыць Беларускую Партыю Працы лідэра прафсаюза работнікаў аўтамабільнага і сельскагаспадарчага машынабудавання А.Бухвостава, Партыю Працы і Справядлівасці дэпутата Вярхоўнага Савета Нятылькіна, яшчэ адна групоўка хоча стаць у левай і левацэнтрысцкай, як гэта кажуць, нішах.

Што ж адрозніваe іх ад Сацыял-Дэмакратычнай Грамады?

Усе гэтыя партыі — "без роду-племени". Ніводная з іх не называе сваіх папярэднікаў. БСДГ ясна заявіла, што, падзяляючы каштоўнасці сучаснай сацыял-дэмакратыі, яна з'яўляецца прадаўжальніцай традыцый Беларускай Сацыялістычнай Грамады і Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Партыі. Ні партыя Бухвостава, ні партыя Нятылькіна, ні партыя Кузняцова пра сваіх ідэйных папярэднікаў не згадваюць. Нібыта яны першаадкрывальнікі, пачынальнікі сацыялістычнай плыні ў гісторыі беларускай палітычнай думкі.

Чаму ж яны не звязваюць сябе з традыцыямі айчыннага сацыялістычнага руху? Адказ знойдзем у брашуры "Белорусская Партия Труда (вопросы и ответы)", выдадзенай сёлета. Там напісана: "Вряд ли можно отнести полностью к левым партиям Белорусскую социал-демократическую Грамаду, основанную представителями БНФ и тяготеющую к этому националистическому течению на практике, хотя программа ее деятельности основывается на социал-демократических принципах..." (с.2).

Па-першае, БСДГ стварылася не толькі сябрамі БНФ. Па-другое, у чым нацыяналізм Грамады і БНФ, не тлумачыцца. Дзеячы БПП нібыта не ведаюць, што ў многім дзякуючы менавіта беларускім дэмакратам пачалося нацыянальна-культурнае адраджэнне нацыянальных меншасцяў у Беларусі: польскай, татарскай, яўрэйскай ды інш.

Партыя сп.Бухвостава турбуецца пра стан толькі аднае мовы. Пра інтэрнацыяналізм БПП можна прачытаць на с.7 брашуры: "Стоим на позиции признания русского языка языком межнационального общения..." Хто ж супраць гэтай канстытуцыйнай нормы? Але самае цікавае — у другой палавіне сказа: Партыя Працы, чытаем мы, выступае за выкарыстанне рускай мовы "В КАЧЕСТВЕ ВТОРОГО ГОСУДАРСТВЕННОГО ЯЗЫКА В ПЕРИОД К ПОЛНОМУ ПЕРЕХОДУ НА ЕДИНЫЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ЯЗЫК — БЕЛОРУССКИЙ" (падкрэслена мною. — **А.С.**).

Ці ўсведамляе сацыял-дэмакрат Бухвостаў, што пры такой практыцы беларуская мова ніколі не стане "единым государственным языком"?

Пра пазіцыю Партыі Працы і Справядлівасці добра сведчыць выступленне яе лідэра — дэпутата Нятылькіна — у дзень інаугурацыі прэзідэнта А.Лукашэнкі.

В.Кузняцоў пра мову ў сваім інтэрв'ю "Народнай газеце" не сказаў нічога. Затое ён паведаміў, як ягоная партыя бачыць будучыню Рэспублікі Беларусь: "...осуществить переход от Содружества независимых государств к Союзу независимых государств. Союзу не только экономическому, но и политическому. В первую очередь дальнейшее сближение — экономическое, культурное, политическое — должно начаться между тремя братскими славянскими государствами: Россией, Беларусью, Украиной. Не должно быть между нашими странами рубежей, таможенных постов, финансовых барьеров".

У гэтым выказванні я асабіста расшыфроўваю "культурнае збліжэнне" як пераход да "общедоступного и общепонятного", бо мова — аснова культуры, яе субстрат. Што ж датычыць ліквідацыі мытных пастоў і фінансавых бар'ераў, дык тут патыхае даўно вядомаю "зонаю", за якую нястомна змагаўся цёзка спадара Кузняцова — Вячаслаў Францавіч.

Як бачым, пазіцыі Партыі Працы, Партыі Працы і Справядлівасці, а таксама Сацыялістычнай Партыі ў нацыянальна-культурным і нацыянальна-дзяржаўным пытанні практычна не адрозніваюцца ад пазіцый камуністаў, СС "Славянскі сабор" і Саюза афіцэраў. Гэта НЕ БЕЛАРУСКІЯ сацыялістычныя партыі. Беларускія сацыялісты яшчэ ў 1884 г. ясна выказаліся за самавызначэнне нашага народа ў сваім часопісе "Гомон", выдадзеным, дарэчы, па-руску. Сярод выдаўцоў гэтага часопіса былі не толькі беларусы паводле паходжання. Хаіму Ратнеру ягоная сацыялістычная свядомасць не замінала быць ПАТРЫ�ЁТАМ БЕЛАРУСІ і выступаць за эмансіпацыю беларускага народа.

Фрыдрых Энгельс у свой час пісаў, што рабочы рух найлепш развіваецца ў нацыянальных формах. Сацыялістычны Інтэрнацыянал, мяняючы гэтае выказванне, сцвярджае, што сацыялістычны рух найлепш развіваецца ў нацыянальных формах. Калі партыі спсп. Бухвостава, Нятылькіна і Кузняцова сацыялістычныя, дык цікава было б даведацца ў якой канкрэтнай нацыянальнай форме яны мяркуюць развівацца. Пытанне не тэарэтычнае, а вельмі практычнае.

БСДГ ад сваіх папярэднікаў засвоіла, што змаганне за сацыяльную справядлівасць і дэмакратыю цесна звязана з барацьбою за нацыянальнае вызваленне. Партыі спсп. Бухвостава, Нятылькіна і Кузняцова хочуць дамагчыся сацыяльнай дзяржавы і дэмакратыі ў Беларусі без культурнага, палітычнага і эканамічнага самавызначэння беларускага народа. Вось у чым корань супярэчнасцяў паміж прадаўжальніцай традыцый беларускага сацыялістычнага руху БСДГ і тымі партыямі, якія прэтэндуюць быць носьбітамі ідэй сацыяльнай дэмакратыі ў Беларусі.

Пра палітычнае аблічча БПП і Партыі Працы і Справядлівасці красамоўна гаворыць пазіцыя, занятая імі ў час прэзідэнцкай выбарчай кампаніі. Абедзве яны "леглі на дно". Як растлумачыць сп. Бухвостаў пазіцыю сваёй партыі? Ці не быў для яго і ягоных аднадумцаў сацыял-лібералы кандыдат С.Шушкевіч занадта нацыяналістам? У тым, што перамог А.Лукашэнка, — немалая віна "афіцыйных" прафсаюзаў (не забывайма, што БПП — гэта партыя прафсаюзных актывістаў). Што ж датычыць Партыі Працы і Справядлівасці, дык вельмі паказальны той факт, што менавіта да яе і да Саюза афіцэраў звярнуліся нядаўна камуністы з прапановаю стварыць адзіны блок. Пра гэта можна прачытаць у "Звяздзе" за 11 лістапада.

11 лістапада цікавае паведамленне з'явілася і ў "Советской Белоруссии": "По словам руководства Социалистической партии Беларуси, в декабре левые силы проведут объединительный конгресс". З кім будзе яднацца Сацпартыя? Адказ на гэтае пытанне атрымаем хутка.

Анатоль СІДАРЭВІЧ,
сябар Выканкама
Цэнтральнай Рады БСДГ

парушэнні і прапаноўвае ў адлаведны тэрмін (згодна закону) прывесці ўсё ў адлаведнасць. Калі ж орган мясцовага самакіравання не выканае ў прызначаны тэрмін папярэджанне прадстаўніка прэзідэнцкай вертыкалі, ён звяртаецца ў Адміністрацыйны суд, якому належыць права прыняць канчатковае рашэнне.

На маю думку, такая схема гарантуе ўраўнаважанне ўлад і іх незалежнасць, а прамыя выбары мясцовай адміністрацыі гарантуюць выбаршчыку выкарыстаць неаспрэчнае права выбіраць і быць абраным.

Пры ўвядзенні сістэмы прызначэнняў кіраўнікоў выканаўчай улады, у якой будуць усе грашовыя сродкі, выбары дэпутатаў і старшынь Саветаў (раённых і абласных) — гэта нікому, акрамя прэзідэнта, непатрэбная гульня. Бо ўздзейнічаць на выканаўчую ўладу такія Саветы ніяк не змогуць — выканаўчая ўлада ім не падсправаздачна.

Спадзяюся, што "ЛіМ" чытае сёйтой і з чыноўнікаў, прыбліжаных да асобы прэзідэнта, таму, пацвярджаючы сваю законапаслухмянасць, лічу неабходным звярнуцца да прэзідэнта.

Паважаны спадар Прэзідэнт! Ні на хвіліну не забывайцеся, што існуюць незалежныя ад любых высокіх указаў Законы яе вялікасці эканомікі, якія нават усенародна абранаму Прэзідэнту нельга гвалтаваць, бо яны, гэтыя законы, не даруюць гвалтавання над сабой, і тады нацыянальная катастрофа непазбежная.

Калі вы, паважаны спадар Прэзідэнт, будзеце памятаць аб гэтым у сваёй практычнай дзейнасці, тады на наступных выбарах за вас прагаласуюць усе 99,98 працэнта выбаршчыкаў.

Ф. ШКІРМАНКОЎ,
старшыня Слаўгарадскага гарадскога Савета народных дэпутатаў

ПАНЧАНКУ — ДЫПЛОМ ГАНАРОВАГА АКАДЭМІКА

Як мы паведамлялі раней, Акадэмія навук Беларусі абрала сваім ганаровым членам народнага паэта Беларусі Пімена Панчанку, што стала яшчэ адным прызнаннем значнасці зробленага ім на паэтычнай ніве, яго вялікага ўкладу ў духоўную скарбонку беларускага народа.

Днямі мы атрымалі яшчэ адно паведамленне. З гэтай нагоды народнага паэта Беларусі наведалі віцэ-прэзідэнт акадэміі Радзім Гарэцкі і вучоны сакратар Аддзялення гуманітарных навук Васіль Банько. Па даручэнні Прэзідыума АН Беларусі яны ўручылі Пімену Емяльянавічу дыплом ганаровага акадэміка, перадалі яму ад усяго акадэмічнага калектыву сардэчныя віншаванні і пажаданні здароўя, плёну ў працы, новых творчых здабыткаў.

Падчас сустрэчы адбылася зацікаўленая, шчырая размова аб тых складаных працэсах, якія адбываюцца сёння ў нашай краіне, яе духоўным жыцці, у беларускай навуцы і культуры.

МОСТ НА БЕЛАРУСКІ БЕРАГ

"...Трыццаць гадоў мы чакалі прыдатных умоў для аб'яднання маладых талентаў у Эдынбурзе. Разам яны ўвасабляюць сабою новую Еўропу. З майго досведу работы ў якасці прафесара культуралогіі Кінгстанскага універсітэта ведаю, што наспеў момант навядзення мастоў між мастацтвам і адукацыяй, між Усходняй і Заходняй Еўропай", — дакляраваў сп. Рычард Дэмарка, руплівец і кіраўнік аднаго з буйнейшых фестываляў Еўропы — Эдынбургскага. Улетку сёлетнега года фестываль адбываўся менавіта пад такім дэвізам: "Навядзенне мастоў". Газета "Financial times" пісала пра фестываль як пра вялікі мост, перакінуты між светам мастацтваў і рэальным светам, тым больш, што некаторыя краіны-ўдзельніцы прадстаўлялі "сэрца Еўропы, якое крывавіць".

Сп. Дэмарка, прафесар культуралогіі Еўропы Кінгстанскага універсітэта і дырэктар Еўрапейскага фонду мастацтваў, усклаў на сябе адметную працу: увасобіць, ажыццявіць, спраўдзіць найшырэйшую праграму (праграмы) фестываляў. За апошнія трыццаць гадоў Еўропа не ведала ніводнага падобнага праекта. Сутнасць праграмы Дэмарка — у злучэнні выяўленчага і тэатральнага мастацтва, у гарманічным аб'яднанні сучаснага мастацтва Еўропы з моцнымі еўрапейскімі ж традыцыямі...

Сп. Дэмарка, бадай, упершыню пазнаёміўся з беларускім тэатральным мастацтвам сёлета на польскім фестывалі "Кантакт" у непараўнальнай Торуні — намаганнямі сп. Крысціны Майснер, якая штогод руплівца запрашаць да сябе прадстаўнікоў Беларусі. Праўда, знаёмства гэтае няможна назваць вельмі ўдалым ды плённым: Мазырскі эксперыментальны тэатр "Верасень" прадставіў не самы ўдалы спектакль свайго рэпертуару. Між тым, людзі, што перажылі чарнобыльскую навалу і не страцілі ахвярнай мастакоўскай рупнасці, адказнасці, жадання займацца і самавыяўляцца праз тэатр, відавочна ўразілі шатландскага культуролага. Верагодна, што яны паўплывалі і на рашэнне прафесара наведаць Беларусь асабіста. Ягоны візіт распачаўся 16 лістапада і працягнецца да 20 лістапада. У планах прафесара — сустрэчы з маладымі мастакамі і фотамастакамі, з Дзяржаўным лялечным, Альтэрнатыўным і Нацыянальным акадэмічным тэатрамі імя Янкі Купалы.

Чарговы мост прафесара Дэмарка, а яго дапамагаў наводзіць доктар Алан Флаўэрс, калега па Кінгстанскім універсітэце, дацягнуўся да Беларусі. Ажыўлены рух па гэтым мосце будзе залежаць ад спраўнага паразумення абодвух берагоў...

Жана ЛАШКЕВІЧ

На здымку: прафесар Дэмарка са студэнтамі.

Фота Алана ФЛАЎЭРСА

Адгалоскі

ХТО Ж НАМ ДАПАМОЖА?

Сярод публікацый кастрычніка маю ўвагу звярнуў на сябе матэрыял Ігара Асінскага ў газеце "Советская Белоруссия" "Хождение Александра Лукашенко за три горя, или Небесспорные, но откровенные мысли о первых ста днях Президента Беларуси". Водгукаў на гэты міні-юбілей кіраўніка дзяржавы было шмат, але згаданы ўсё ж выдзяляецца.

Па-першае, кідкім і метафарычна разгорнутым загалоўкам. Па-другое, адметнаю формай выкладання матэрыялу. І па-трэцяе, зразумела, тым, што слова з гэтай нагоды ўзяў сам кіраўнік творчага калектыву. Такое ўсё ж сустрэнеш не часта.

Трэба аддаць належнае І. Асінскаму. Ён дастаткова смела і абгрунтавана ацэньвае факт узыходжання А. Лукашэнкі на прэзідэнцкі Алімп і першыя яго крокі ў ажыццяўленні перадвыбарнай праграмы.

Узяўшы для параўнання вобраз купца-мараплаўцы А. Нікіціна, які некалі здзейсніў незвычайнае падарожжа за тры моры, галоўны рэдактар "СБ" заўважае: "Подобно ему Александр Лукашенко отправился за три горя, не ведая туда ни пути-дороги, ни того, как победить страшное горе-злосчастье народное...".

Першае і найбольш небяспечнае сярод іх — гэта карупцыя. Першым кінуўшы ёй пальчатку, А. Лукашэнка стаў потым кіраўніком дзяржавы. Час ідзе, але сур'ёзнага бою яна так і не атрымала. У гэтай сувязі журналіст робіць выснову: "Нетрудно предположить, что крупных процессов, в которых, как в зеркале, отразилась бы все (мабыць, вся. — А. Л.) неприглядная картина процветающего в верхах взяточничества, в ближайшее время не ожидается. Для этого есть как объективные, так и субъективные причины".

Спынім увагу на дзвюх з іх. 1. "Как ни прискорбно, но в ближайшем окружении Александра Лукашенко находятся люди, склонные сами пополнить ряды коррупционеров". 2. "Нельзя исключить и того, что мафия напомнила уже президенту о том, что плохой мир лучше хорошей ссоры, обозначив Рубикон, который преступать ему возбраняется".

Скажыце, навошта тады прэзідэнту прасіць яшчэ раз падтрымкі ў насельніцтва? Ён жа даўно яе мае. Ці гэта ўжо закіды на другі тэрмін? Не заклік жа гэта, хочацца думаць, падтрымаць канкрэтнымі справамі бездапаможныя перад наступам карупцыі органы ўлады...

Не менш дакучае беларусам сёння і другое гора — безуладдзе на месцах. І. Асінскі зусім не без падстаў канстатуе, што "... сегодня власти на Беларуси нет". Сваю думку пацвярджае наступнымі разважаннямі: "Даже сравнительно небольшое правительство Александр Лукашенко создает уже в течение трех месяцев. Не имея (а скорее просто не зная) достойных претендентов, вынужден все чаще использовать старые кадры, которые совсем недавно заносил в "черные списки".

Ды найболей жыхары суверэннай рэспублікі пакутуюць зараз ад трэцяга гора — невыноснай галечы. Галоўны рэдактар "СБ" сціпла зазначыў на гэты конт: "Нищета становится одной из характерных черт нашей постсоветской жизни".

Красамоўней з гэтага выпадку выказалася ў той жа дзень "Народная газета". У прыватнасці, падкрэсліла, што ў перыяд з 29 ліпеня па 21 кастрычніка г.г. мінімальная зарплата зменшылася з 3,63 да 1,63 даляра, яе пакупная здольнасць — у 2,3 раза.

Сумны факт. Забег на першую "стометроўку" кіраўніку дзяржавы яўна не ўдаўся. Зрэшты, іншага чакаць і не выпадала.

І. Асінскі правільна зазначае: "...мог бы не обещать того, чего выполнить нельзя.

Не стоило разжигать ностальгию по СССР, предполагая, что воссоединение с Россией в ближайшее время невозможно.

Можно было воздержаться от резкой критики Запада, не исключая, что придется пойти на поклон к нему, приняв кабальные условия Международного валютного фонда.

Нельзя было тиражировать иллюзорные надежды на немедленное улучшение жизни".

Здарылася заканамернае і непазбежнае. Папулярнасць А. Лукашэнкі папаўзла ўніз. Гэта бачна з табліцы рэйтынгу, змешчанай на першай старонцы таго ж нумара "СБ". У тое, што ён здольны вывесці краіну з крызісу, сёння верыць толькі кожны пяты рэспандэнт. Не ва ўсім або цалкам не давяраюць яму звыш 40 працэнтаў апытаных, што больш, чым схільных да супрацьлеглай думкі.

А вось далей аўтар робіць яўна нечаканы прагноз ці варыянт развіцця сітуацыі ў будучым: "Если первый президент будет вынужден оставить свой пост досрочно, не успев осуществить решающий перелом, к власти непременно придут националисты. По всему видно, они извлекли из поражения должные уроки, представляют собой сегодня наиболее организованную и весьма трезво мыслящую политическую силу.

Вполне допускаю и то, что у них дела в экономике пойдут успешнее, чем у нынешнего правительства. Заинтересованный в том, чтобы СССР не возродился во веки веков, Запад позаботится об этом".

Такая квінтэсенцыя наколькі парадавала, настолькі і засмуціла. Бо, прабачце, тут пайшлі больш "небесспорные", чым "откровенные мысли".

Парадавала тым, што ёсць, аказваецца, у нашай рэспубліцы "трезвомыслящие" людзі, якія могуць паправіць становішча спраў у заняпалай даўно эканоміцы.

Засмуціла ж таму, што І. Асінскі бачыць у іх зусім не патрыётаў Бацькаўшчыны, не сапраўдных прыхільнікаў нацыянальнага адраджэння Беларусі.

Так атрымалася, што старымі ідэалагічнымі канонамі ў слове "нацыяналіст" першапачатковы пазітыўны сэнс быў падменены негатыўным. Так яго значэнне падаецца ўсімі тлумачальнымі слоўнікамі. Так — у новай градацыі — яго ўспрымае большасць насельніцтва. На жаль, ёсць падставы лічыць, што да такога меркавання схільны і вопытны журналіст-міжнароднік.

Літаральна абзацам ніжэй ён цалкам ставіць пад сумненне "трезвомыслие" самім жа аб'яўленай і пахваленай "организованной... политической силы". Не кажучы ўжо пра яе патрыятызм ды самаахвярнасць у служэнні народу. Таму і дапускае варыянт магчымага самапродажу "нацыяналістаў", іх згоды на пазбаўленне беларусаў "права быть хозяевами собственной экономики". Не будзем спыняцца на метамарфозе падобнага хрыстапрадаўства з добрым дамешкам вар'яцтва.

Зазначым толькі, што падстаў для падобных прагнозаў наогул няма. Таму што магчымы 100-мільённадоларавы крэдыт ЗША ніяк не пагражае суверэнітэту Беларусі. Хоць бы з тае прычыны, што яна ўжо павінна больш як паўмільярда тых жа долараў за энерганосьбіты вялікаму суседу. Як ні сябруюць Б. Клінтан і Б. Ельцын, але наблізіць амерыканскія межы да ўласных Расія ўсё ж ніколі не згодзіцца. Як і падараваць новым гаспадарам нашы даўгі.

Легкаважным і беспадстаўным падаецца і разважанне аўтара на той конт, што магнаты з-за акіяна і Захаду могуць скінуцца і "купить нас со всеми потрохами". Гэта ўжо нешта з прароцтваў аб магчымым новым перадзеле свету.

Так, І. Асінскі мае рацыю. Ёсць у палітыкаў інтарэс да Беларусі. Інтарэс сабе наўме. У той жа Расіі. Згадайма прыхільнасць яе ўрада да В. Кебіча і абурэнне на гэты конт нашага прэзідэнта. Ды перадусім нельга скідаць з рахунку ўласныя інтарэсы саміх беларусаў. Усё ж у масе народ быў і застаецца патрыётам сваёй Бацькаўшчыны. І калі нават і знойдуцца сярод "нацыяналістаў" здрайцы і кар'ерысты, то ён сваё слова ўсё ж скажа. Важка і пэўна. Таму прыкладам ёсць прэзідэнцкія выбары.

Уважліва прачытаўшы артыкул галоўнага рэдактара "СБ", міжволі падумаеш: "Язык мой — враг мой". Бо ў ім нібы між іншым згадваецца, як хваравіта адрэагаваў прэзідэнт і яго каманда на публікацыю ў газеце лістоў чытачоў з крытычнымі закідамі на іх адрас. У гэтай сувязі няцяжка сабе ўявіць, якой можа быць рэакцыя новых лідэраў дзяржавы на высновы самога І. Асінскага аб наяўнасці "организованной и весьма трезво мыслящей политической партии" як магчымай іх пераемніцы. Прычым здольнай хутка і на самай справе нешта паправіць да лепшага і ў эканоміцы рэспублікі, і ў дабрабыце народа.

Зрэшты, магчыма, гэта маё суб'ектыўнае і зусім беспадстаўнае ўражанне...

Урэшце мусім канстатаваць апошняе. Заключная калонка артыкула І. Асінскага нашмат прайграе ў аналітычнасці ўсім папярэднім. Міжволі не пагаджаешся і з такою высновай-сентэнцыяй: "Скоро ли наступит рассвет? Не знаю...".

Незразумела, чаму аўтар пажадаў узняць вочы ад грэшнай роднай зямлі туды, у нябёсы. Ці не таму, што не захацеў даць або сапраўды не ведае адказу на пастаўленае пытанне, хто ж нам і калі дапаможа выйсці з "дрэйфу" паміж ільдоў "трох гораў"?

Хоць у дадзеным выпадку лепш за ўсё, відаць, пакарыстацца добра вядомым суветным вопытам. А менавіта аб'явіць найважнейшым прыярытэтам ва ўсім знешне- і ўнутрыпалітычным жыцці рэспублікі ідэю нацыянальнага прымірэння і згуртавання, усім разам па-народнаму — талакой — узяцца за ажыццяўленне рынкавых рэформ (альтэрнатывы ім няма і не будзе), а таксама за адраджэнне і развіццё роднай культуры і мовы. Самагоднасць народа — гэта адна з найважнейшых каштоўнасцей не толькі ў яго жыцці, але і ў вялікай палітыцы.

Алесь ЛІСІЦКІ

г. Жыткавічы

ПОСТКАЛАНІЯЛЬНАЯ КАША...

У сваім лісце Аляксандру Фядуту пісьменнік Генрых Далідовіч выказаў занепакоенасць намерамі ўрада пазбавіць друк дзяржаўнай падтрымкі. Дзяржава хоча апраўдацца тым, што крызіс цяжкі і не хапае сродкаў. Сродкаў не хапае заўсёды, але ці ўратуе бюджэт ліквідацыя дзяржаўных асігнаванняў на друк? Хутчэй за ўсё — не. Між тым, гэта не той выпадак, калі можна папоўніць рэдакцыйныя фінансы за кошт, скажам, рэкламы. Не настолькі наш лад рынкавы, каб усе навыперадкі шукалі рэкламныя плошчы.

Заканамерна, і, на жаль, прыкра, што культура заўжды першай робіцца ахвярай бюджэтнага вэрхалу, зрэшты, як і палітычнага.

Але людзі даўно зразумелі асобае становішча культуры ў грамадстве, тое, "што культура ўяўляе сабою сацыяльнае багацце, стратэгічны рэзерв краіны. Не падлягае сумненню яе моцны эканамічны ўплыў". Але што стане з культураю без друкаванага слова, якога ва ўмовах Беларусі без дзяржаўнай падтрымкі не будзе?

Дзе ўзяць грошы?

У нас шмат лішніх генералаў, у нас дарагое непрафесійнае і неэфектыўнае войска, па нашай зямлі за наш кошт едуць легіёны машын, цягнікоў, цячэ рака нафты. На нашай зямлі бясплатна — за наш кошт — стаіць замежнае войска, стаяць розныя станцыі і базы.

Няўжо мы такія багатыя, што коштам нашай культуры, адукацыі, нашых бедных бальніц і няшчасных хворых пыхліва трымаем чужынцаў на сваім карку? Ці такія баязлівыя, што баімся зачапіць чужую свяшчэнную карову? Ці не занадта дорага абыходзіцца нам усходняя мяжа наросхрыст? Ці не задоўга мы дазваляем сабе жыць па паперках замест паўнавартасных грошай? Не друк вінаваты ў дысбалансе бюджэту, а тая посткаланіяльная каша, што моцна сядзіць у кіроўных галовах.

А тым часам велізарныя сродкі проста раскрадаюцца, скажам, у калгасах. І гэтае ласкавае цялятка добра смокча казну!

Словам, справа не ў сродках і іх апраўданні, а ў антыдзяржаўных ідэалагічных устаноўках, якія акрэсліліся ў цяперашніх насельнікаў Дома ўрада.

Варта зірнуць на паліцы таго, што раней называлася кнігарня, каб пераканацца, да якога прымітыўнага ўзроўню скоціцца пісьменства. Гэтае паганства расце само, без дзяржаўных датацый, бо жывёльнае ў чалавеку — ад прыроды, цывілізацыя ж і культура патрабуюць высілкаў.

Таму і дзяржава абавязана падтрымліваць цывілізацыю і культуру. І друк — як адзін з іхніх транслятараў.

І ў першую чаргу мусіць быць падтрыманы беларускамоўны друк — ад каго ж яшчэ яму чакаць падтрымкі?! — як канструктыўны, дзяржаўны, патрыятычны.

Мікола БУСЕЛ

в. Дуброва, Светлагорскі раён

Думка чытача

Нашы чытачы, пэўна, памятаюць ліст Р. Лявонцьева з Чэлябінска пад назваю "Хто хоча звацца беларусам" ("ЛіМ" за 23 верасня г.г.). Змяшчаючы той ліст, мы агаворваліся, што Рыгор Сцяпанавіч прыслаў нам і свае нататкі "Баліць маё сэрца за Беларусь", і абяцалі з цягам часу надрукаваць іх. Што сёння і робім.

БАЛІЦЬ МАЁ СЭРЦА ЗА БЕЛАРУСЬ...

У жніўні, калі я вярнуўся на Урал пасля адведак маёй роднай старонкі і сваякоў у Мінску і на Клічаўшчыне, дома мяне чакала бяда. Увесь ліпень лілі дажджы, без папярэджання адкрылі шлюзы плаціны, і ўвесь мой гарод апынуўся пад вадой. Вада не спадала дзён дзесяць, і ў выніку бульбачка ператварылася ў кашу, капуста, морква, агуркі, базілік, пятрушка — усё згніло. Страты мае ад паводкі склалі больш чым два мільёны расійскіх рублёў.

Ды шчыра скажу, што знішчэнне паводкай маіх земляробчых высілкаў засмуціла мяне менш, чым тое, што я пабачыў у Беларусі. Мне і раней, калі яшчэ была ўлада камуністычнага ЦК, здавалася, што мая родная Беларусь — гэта краіна дурняў. Памятаю, быў у Мінску ў дні Белавежскага пагаднення. Тады мне ў гастраноме не прадалі нават хлеба — я не меў картачкі пакупніка. Але з братавай карткай купляў усё, што хацеў. І, вяртаючыся дадому цягнікам Мінск—Масква, не здзіўляўся, што ў вагонах усе купэ былі літаральна забіты сумкамі і вандзэлкамі, што раніцай радасныя масквічы сустракалі цягнік цэлымі натоўпамі і скуплялі ў дурняў-беларусаў амаль на дармаўшчыну мяса, сыр, кілбасы, масла.

І ў часе сёлетняй паездкі на Бацькаўшчыну давялося пабачыць такое, што розуму не дабяру. Ніводная, нават самая багатая, краіна ў свеце не дазваляе сабе таго, што робіцца ў Беларусі. Вось прыклады. Чыгуначны білет ад Чэлябінска да Мінска каштуе 64,5 тысячы расійскіх рублёў (тут і далей лік будзе ў гэтай валюце), а з Мінска да Чэлябінска ў тым жа вагоне ехаў за 25155 рублёў. Праезд па Мінску абыходзіўся мне ў 6—7 разоў танней у параўнанні з чэлябінскім транспартам. А бензін у Мінску прадаецца даражэй, чым на Урале. З Клічава ў вёску да брата ездзіў за 71 рубель, а на такую ж адлегласць ад Чэлябінска да свайго горада плачу 1500 рублёў. Мая сястра там жа, на Клімаўшчыне, здае літр малака па цане, роўнай кошту адной цыгарэты сярэдняга гатунку. Бохан хлеба мне прадавалі ў Мінску ўсяго за 25 рублёў, а на Урале за такі ж бохан мне даводзіцца выкладваць 460 рублёў. А вазьміце бясплатныя гарадскія тэлефоны-аўтаматы. Каб пазваніць па такім тэлефоне ў Чэлябінску, трэба купіць жэтон за 100 рублёў. Таму і зарплата ў работнікаў сувязі вельмі высокая. А ў Мінску на Галоўпаштамце адна ягоная работніца назвала мне такую суму сваёй зарплаты, што на яе ў нас можна купіць усяго дзве мужчынскія сарочкі.

Мне здавалася, што я трапіў у тэатр парадоксаў. Чытаю ў "ЛіМе", што "за прысутнасць расійскіх войск на нашай зямлі Масква не плаціць нам ні капейкі"; з газеты "Свабода" даведваюся, што "ўтрыманне расійскіх войск абыходзіцца Беларусі ў 1,9 мільярда долараў" за год. Ці ўзяць "лясныя дарункі" — грыбы і ягады. Скупляюцца за бясцэнак і тонамі вывозяцца за мяжу. З часопіса "Новый фермер" даведваюся, што за кіло садовай маліны амерыканскаму фермеру плацяць 10 долараў. А жыхару беларускай вёскі за кіло чарніц шустрыя перакупшчыкі-драпежнікі даюць усяго толькі 40 цэнтаў.

Як усё гэта называць? Не інакш, як масавым рабаваннем нацыянальнага багацця Беларусі. Прытым гэтае рабаванне арганізавана самім урадам, кіраўніцтва якога пры кожным зручным выпадку заяўляе, што ўсё робіцца ў імя дабрабыту народа. Можна сказаць, ідзе псіхалагічная і эканамічная вайна, якая пасеяла сярод простага люду безабароннасць, асуджанасць і, што самае страшнае, паўнейшую абыякавасць да сваёй нацыянальнай прыналежнасці. Наш "народ не мае ніякай мэты, не збіраецца нічога будаваць, ніякую незалежную дзяржаву", — з горыччу піша на старонках "Свабоды" С. Астраўцоў. Што рабіць?

Я жыву за тры тысячы кіламетраў ад Бацькаўшчыны, але, можа, я больш беларус, чым паасобныя жыхары Беларусі, але ні я, ні яны не ведаюць, што чакае Беларусь у будучым. Мне лягчэй расказаць, на якіх прынцыпах дамагліся нацыянальнай незалежнасці такія дзяржавы, як Фінляндыя, Ізраіль, суседняя Польшча, чым пра сваю родную Беларусь.

Калі я чытаю, што ў Ізраілі 70 аўтамабіляў на кожны кіламетр дарог — самая высокая ў свеце шчыльнасць транспартнай плыні, што там вырошчваецца самая танная ў свеце абсалютна экалагічна чыстая сельскагаспадарчая прадукцыя, што там дзейнічаюць у прамысловасці самыя перадавыя ў свеце тэхналогіі, дык у мяне не ўзнікае думка, што ўсё гэта пазычана ў суседзяў. Наадварот! Ізраіль сваю нацыянальную незалежнасць пабудаваў у акружэнні варожага яму свету, які ў 50 разоў большы па тэрыторыі і ў 20 разоў большы па насельніцтве. Жыхароў у Беларусі ў 2 разы больш, чым у Ізраілі, па тэрыторыі Беларусь большая за яго ў 15 разоў, Ізраіль не мае сваёй ні руды, ні нафты, ні газу, але ягоны народ і ў такіх умовах жыве заможна і шчасліва. Чаму ж нам самым уважлівым чынам не вывучыць вопыт будаўніцтва дзяржавы Ізраіль?

Як пастаянны падпісчык расійска-амерыканскага часопіса "Новый фермер", вельмі ўважліва вывучаю метады і вынікі працоўнай дзейнасці тых, хто корміць Амерыку. І не перастаю здзіўляцца: адзін амерыканец вырабляе столькі сельгаспрадукцыі, колькі ў нас цэлая калгасная брыгада ці саўгас. І не трэба апраўдваць нашу нізкую прадукцыйнасць працы адсутнасцю тэхнікі. Мне здаецца, прычына ў нечым іншым. Дзеля гэтага варта прыгадаць традыцыйныя каштоўнасці амерыканцаў. Галоўны іх элемент — вера ў індывідуалізм. Індывідуум пастаўлены на п'едэстал, і задача грамадства — зрабіць людзей шчаслівымі. Перавага аддаецца інтарэсам асобы ў процівагу інтарэсам грамадства. Асабістая свабода спрыяе асабістым дасягненням. Адсюль: людзей варта ацэньваць па выніках іх працоўнай дзейнасці, а не па іх сацыяльным паходжанні, класавай прыналежнасці, нацыянальнай адзнацы. Працуй, атрымлівай адпаведны працы заробак і набывай маёмасць. Цяга да ўласнасці — не проста цяга да багацця. Уласнасць уяўляе сабой важнейшы спосаб вызначэння асобы, з'яўляецца яе абаронай і прытулкам. Уласнасць, як гаворыць прафесар Нью-Йоркскага універсітэта Э. Хакер, з'яўляецца пэўнай сферай — вялікай ці малой, у залежнасці ад памеру ўласнасці, — у межах якой яе ўласнік можа дзейнічаць так, як яму хочацца. Карацей кажучы, традыцыйныя каштоўнасці ў Амерыцы: індывідуалізм, асабістыя дасягненні, роўнасць магчымасцей, права на ўласнасць — у сукупнасці з'яўляюцца стымулам руху да прагрэсу. Задача ўрада: спрыяць прагрэсу індывідуума.

Камуністычны рэжым культываваў адваротнае: рабскае прыніжэнне ўласных патрэб перад дзяржаўнымі, што легла ў аснову ідэалогіі, маралі і эканомікі. Рэжым зрабіў самаадмаўленне і беднасць грунтам грамадскага прагрэсу. Людзі сталі ганарыцца ўласнай незаможнасцю. У выніку камуністычны (таталітарны) рэжым звёў асабісты лёс кожнага грамадзяніна да прымітыўнай палітычнай функцыі. І трагедыя ў тым, што недарэчнае палітызаванае жыццё стала для большасці людзей асабістай біяграфіяй, святым асабістым здабыткам, часта адзіным у старасці багаццем успамінаў і гонару. Страціць усё гэта — значыць, страціць сябе.

І людзі пры ўладзе зацікаўлены ў захаванні грамадства, якое складаецца не з асоб, а з мутантаў, у якіх ідэалогія дамінуе над чалавекам. Бедныя людзі — беднае грамадства. Такім грамадствам і кіраваць лёгка.

Пасля гэтага зірнём на дэкларацыю аб сваіх даходах, прадстаўленую прэзідэнтам А. Лукашэнкам. Нашы мясцовыя газеты апублікавалі яе на відным месцы, як сенсацыю: "Прэзідэнт — люмпен!..". Прэзідэнт Беларусі аб'явіў на ўвесь свет, што не мае ўласнасці ў выглядзе прадпрыемстваў, жылых будынкаў і іншай нерухомай маёмасці, зямельных участкаў. З якою мэтаю зроблена такая аб'ява? Як яе разумець?

Калі, запаўняючы дэкларацыю, прэзідэнт бачыў перад сабою твары гаротных бабуль, што адзінока гаруюць у сваіх прыгорбленых хацінах, альбо забраных дзецьмі ў горад, заўсёдніц пад'ездных лавак; калі ён знайшоў час паслухаць іх аповяды і ўспаміны, у якіх наша жывая гісторыя; калі ён сумеў зазірнуць у выцвілыя ад гора і слёз святыя вочы бабуль, — значыць, ён зразумеў, чыім лёсам аплачана наша "магутная хада да сацыялізму". Толькі на пасадзе прэзідэнта ён зразумеў, што ні ў адной краіне свету не было такіх быдляцкіх адносін да сялянства, як у былым СССР; што калгасная эканоміка пабудавана на падмурку з касцей мільёнаў ахвяр; што пасля калектывізацыі жыццё сельскага чалавека ад дзяцінства да смерці зведзена да прымітыўнай сацыяльнай функцыі савецкага прыгоннага — выканання дзяржаўных планаў; што калгаснікі і рабочыя саўгасаў — дзяржаўныя парабкі. І ён, абраны народам прэзідэнт, калі быў кіраўніком калектыву такіх парабкаў, не краў, нічога не прысвойваў, не валачыў у свой казённы дом з карыснай плошчай 55 квадратных метраў, задавольваўся толькі зарплатай, аніякага багацця не займеў і па сваім маёмасным становішчы з'яўляецца гэтакім жа люмпенам, як і ўсе яго былыя падначаленыя ў саўгасе.

Але ж дзяржава не можа стаць незалежнай, калі яе народ будзе заставацца бедным. І сваёй дэкларацыяй прэзідэнт дае зразумець, што і ў яго самога і ў тых, хто за яго галасаваў, стартавае матэрыяльнае становішча аднолькавае. Дык давайце разам працаваць, нажываць багацце, і калі дзяржава стане заможнай, дык будзе і незалежнасць.

Калі прэзідэнт абнародаваў дэкларацыю аб сваіх даходах у адпаведнасці з такімі маімі разважаннямі, тады яму можна папляскаць у ладкі. Тады слова "незалежнасць" на ягоным перадвыбарчым плакаце стане канкрэтнай рэальнасцю.

Але ж прэзідэнцкую дэкларацыю можна прачытаць і па-іншаму. Калі пачытаць ягоныя прамовы, дык ствараецца ўражанне, што ў яго ёсць намер пабудаваць грамадства сацыялістычнай справядлівасці ў асобна ўзятай краіне. Усе мы памятаем з "Узнятай цаліны" М. Шолахава не толькі люмпена-балаку дзеда Шчукара, але і камуніста-ардэнаносца з гарачым сэрцам Макара Нагульнава, таксама люмпена і палымянага барацьбіта за сусветную рэвалюцыю. У прамовах прэзідэнта аб сусветнай рэвалюцыі не гаворыцца, але шкадаванне з выпадку распаду СССР выказвалася неаднойчы і дакументальна зафіксавана пры галасаванні ў парламенце. І калі школьнікі будуць пісаць сачыненне пра ідэйных нашчадкаў Нагульнава, дык могуць назваць і імя Аляксандра Рыгоравіча. Памылкі, бадай, не будзе.



Малюнак А. ГУРСКАГА

Асабіста я шчаслівы, што з'яўляюся сведкам і ўдзельнікам падзей распаду камуністычнай імперыі па імені СССР. І ўсё, што ў маіх сілах і магчымасцях, зраблю дзеля таго, каб мая родная Беларусь стала багатай, вольнай і незалежнай.

Ёсць усе прыродныя і геаграфічныя перадумовы для таго, каб праз 2—3 гады Беларусь стала багацець, а праз пяць гадоў яе назвалі багатай. Толькі трэба адкрыць прастору народнаму працалюбству. Гэта зрабіць нялёгка. Рэцыдывы маральнай разбэшчанасці грамадства камуністычным рэжымам сустракаюцца на кожным кроку. Калі я хадзіў па вуліцах Мінска, дык не толькі вачамі, але і скурай адчуваў прысутнасць камуністычных зданяў усюды і ўва ўсім. У савецка-партыйнай наменклатуры вельмі вялікі вопыт ідэалагічнай апрацоўкі насельніцтва. Яна працягваецца і сёння.

Большасць мінчан, як я заўважыў, чытаюць газеты на рускай мове. І вельмі мала такіх, хто купляе ў кіёсках газеты на беларускай мове. Мае родныя браты (абодва з вышэйшай адукацыяй) увогуле не прымаюць беларускай мовы. Калі б у газеце была аб'ява аб тым, што ім трэба зайсці ў пэўную кантору і атрымаць там па мільёну рублёў, і калі б гэтая аб'ява была надрукавана па-беларуску, яны на яе нават не зірнулі б, бо лічаць беларускую мову мовай "нацыянал-фашыстаў". Затое мае браты ад радка да радка чытаюць газеты на рускай мове і мяркуюць аб жыцці ў рэспубліцы па старонках газет "Мы и время", "Советская Белоруссия" і на іх падобных.

І тут не магу не закрануць такі аспект.

З усіх акаляючых Беларусь дзяржаў Расія можа быць самым карысным суседам. Пры ўмове, калі будзе створана адзіная эканамічная прастора. Але толькі — не адзіная рублёвая зона. Дарэчы, не чуў ад рускіх людзей ніводнага слова ўхвалы адзінай рублёвай зоны. І не таму, што трэба будзе расійскаму бюджэту "пахудзець" на 10 працэнтаў. Вельмі мала ў Расіі тых, хто шкадуе аб распадзе СССР. Большасць даўно зразумела, што гэта было гістарычна асуджанае штучнае ўтварэнне. І таму намер эканамічна зноў "прывязаць" Беларусь да Расіі выклікае пачуццё трывогі: а далей што?

Іншая справа — раўнапраўнае эканамічнае супрацоўніцтва. Каб было выгодна і аднаму боку, і другому. Аб гэтым трэба найперш усім нам думаць. І рашаць, як падняць эканоміку краіны. Трэба дакладна арыентавацца ў эканамічнай прасторы вакол Беларусі, хутка аналізаваць і думаць, дзе і на чым можна атрымаць карысць для свайго народа.

А што ў жыцці? Чытаю ў адным з нумароў "ЛіМа": "Сёння Беларусь на 100-м месцы па бяспецы інвестыцый, сюды могуць укладваць грошы толькі вар'яты і тыя, у каго няма іншай магчымасці". А расійскія прадпрымальнікі не ведаюць, куды ўкласці свае грошы. Калі накіраваць іх на вытворчасць тавараў, дык падатак трэба плаціць у памеры 97 працэнтаў. У Расіі зараз генералаў і чыноўнікаў больш, чым іх было ўва ўсім СССР, іх трэба неяк кармініць-апранаць. І расійскі ўрад душыць падаткамі тых, хто хоча працаваць, а не гандляваць. Вось бы і прыняць беларускаму парламенту закон аб ільготных падатках для тых інвестараў, хто жадае ўкладваць грошы, скажам, у будаўніцтва магутнасцей па перапрацоўцы сельгаспрадукцыі, без чаго словы аб незалежнасці не што іншае, як меладычныя гукі.

У заходніх краінах ужо не блукае здань камунізму, у Расіі яшчэ сям-там ён хаваецца па кватэрах тых, хто калісьці кляўся ў Белым доме абараняць савецкую ўладу да апошняга патрона. А Беларусь усё яшчэ застаецца савецкай, і дзеля захавання чырвонага сцяга, набраклага ад крыві і слёз народных, захоўваецца такая палітыка цэн, што праз год-другі дзяржава будзе галоднай, разутай і распранутай да апошняй ніткі.

І апошняе. У Евангеллі Мацвея ёсць словы аб тым, што калі мы хочам, каб людзі рабілі нам дабро, мы самі павінны рабіць для іх дабро. Перш за ўсё трэба гаварыць людзям праўду, нават калі яна часам і не надта прыемная. А. Салжаніцын вярнуўся ў Расію з вымушанай эміграцыі, каб быць разам з народам у гэты цяжкі час. Ён пісаў: "Мы разумеем патрыятызм як цэльнае і настойлівае пачуццё любві да сваёй нацыі з паслугаваннем ёй не ўгодлівым, не падтрымкаю несправядлівых яе пасягненняў, а шчырым у ацэнцы парокаў, грахоў і ў раскаянні за іх. Засвоіць бы нам, што не бывае народаў, вялікіх вечна ці высакародных вечна: гэтае званне цяжка заслугоўваецца, а пакідае лёгка... Што сапраўдная веліч народа — у вышыні ўнутранага развіцця". 50 гадоў назад другі рускі дзеяч публіцыст і філосаф І. Ільін маляваў такую карціну першых посткамуністычных гадоў: "Рускі народ выйдзе з рэвалюцыі **жабрачым**... Жабрачае сялянства, пралетазаванае вакол "аграфабрык" і "аграгарадкоў"; жабрачы рабочы ў прамысловасці; жабрачы рамеснік, жабрачы гараджанін... Вядома, вынырне перафарбаваны камуніст, што нарабаваў і прыхаваў... усе будуць **бедныя**, змучаныя і злыя..."

Што рускі народ, што беларускі — абодва яны прылады і ахвяры таталітарнай камуністычнай (савецкай) улады. І не трэба дзяліць беларусаў на ўсходніх і заходніх, не трэба, каб Беларусь была падобная на Польшчу ці на Расію. Беларусь павінна быць толькі Беларус-

(Працяг на стар. 12)

ЗНОЎ НА СЦЭНЕ — МАКАЁНАК

Акадэмічны тэатр імя Якуба Коласа паказаў прэм'еру спектакля па п'есе А. Макаёнка "Святая прастата". Пастаноўку ажыццявіў рэжысёр Аляксандр Смелякоў, сцэнаграфія і касцюмы заслужанага дзеяча культуры Беларусі Аляксандра Салаўёва, музыку напісаў Барыс Насоўскі.

На здымку: Таццяна Анікіна (Нэла), Міхаіл Краснабаеў (Жан).

Фота Аляксандра ХІТРОВА, БЕЛІНФАРМ

ГВАЛТ НАД ПОМНІКАМ

Напярэдадні Дзядоў з помніка ахвярам сталінскіх рэпрэсій пад Оршай знікла бронзавая шыльда. Помнік быў адкрыты год таму ў лесе на Кабыляцкай гары, дзе ў 30—40-я гады расстрэльваліся органамі НКУС мірныя жыхары. Каму і навошта трэба было зняць шыльду з досыць нейтральнымі радкамі Ахматавай, дасюль невядома.

Ю. КОПЦІК
Орша

І Ў ПАДАРУНАК — КНІГІ

Серыя дакументальна-мастацкіх аповесцяў (выйшла шэсць) Валерыя Сарокі "Віцебская справа" знаходзіць свайго чытача. Пра гэта сведчыла і чытацкая канферэнцыя, што прайшла ў актавай зале Мінскага педагагічнага універсітэта. Пра вартасць гэтага серыялу гаварылі галоўны рэдактар часопіса "Нёман" А. Кудравец, дэкан філалагічнага факультэта універсітэта С. Карпушын, рэдактар кніг С. Аладзьеў, студэнтка Н. Казачэнка і іншыя.

Аўтар расказаў аб працы над творамі, адказаў на шматлікія пытанні прысутных, падарыў свае кнігі бібліятэцы універсітэта.

Г. ПЯТРОЎСКІ

«ТЭВЭЭЛАЎЦЫ» ПА-ЎКРАІНСКУ

Таварыства Вольных Літаратараў працягвае актыўна наладжваць сувязі з літаратурна-мастацкімі суполкамі і выданнямі суседніх краін. Часопіс украінскай нацыянальнай інтэлігенцыі "Український засів", які выдаецца ў Харкаве, у сваім 4-м нумары шырока прадставіў творы сяброў ТВЛ. У "тэвээлаўскую" нізку былі ўключаны вершы Лёры Сом, Юрыя Гуменюка, Славаміра Адамовіча, Лявона Вольскага, п'еса Алеся Аркуша "Арабскае пытанне". Пераклаў творы сяброў ТВЛ для "Українського засіву" харкаўскі паэт Васіль Баравы.

ВЫПУСК ЛІТАРАТУРНЫХ УКЛАДАК...

практыкуе газета "Рагнеда", што выходзіць у Салігорску. Гэта невялікія зборнічкі, якімі зручна карыстацца. Нядаўна выпушчана паэма Лявона Шпакоўскага-Случаніна "Рагнеда", напісаная яшчэ ў снежні 1943 года. Выданне прымеркавана да 80-годдзя аўтара. Упершыню асобнай кніжкай паэма была выдадзена ў 1944 годзе ў Вільні. Ілюстраваў твор мастак У. Дрэма. У другі раз "Рагнеда" пабачыла свет у 1956 годзе ў Аўстраліі. А ў 1991-ым была надрукавана ў шматтыражцы "Калійшчык Салігорска" і ў часопісе "Спадчына".

Крытыка

З КРЫНІЦ РОДНАЙ ГАВОРКІ

Сістэматычны збор дыялектнай лексікі ў Беларусі пачаўся ў 20-х гадах нашага стагоддзя, калі шырока разгарнулася збіральніцкая праца. Выйшлі слоўнікі М. Каспяровіча і М. Шатэрніка. Тады ж быў падрыхтаваны слоўнік І. Бялькевіча, выдадзены толькі ў 1970 годзе. Была складзена багатая картатэка, якая, на жаль, у час нямецка-фашысцкай акупацыі загінула. Пасля вайны зборам і вывучэннем дыялектнай лексікі актыўна займаецца акадэмічны Інстытут мовазнаўства, а таксама мовазнаўцы з іншых устаноў. Вялікую ўвагу фіксацыі народнай лексікі, слоўнікавага багацця роднай гаворкі ўдзяляе пісьменнік-парадыст і дыялектолаг, аўтар шматлікіх слоўнікаў Г. Юрчанка.

Пачаткам працы ў галіне дыялекталогіі Г. Юрчанка лічыць 1950 год, калі пад кіраўніцтвам вопытных выкладчыкаў Магілёўскага педінстытута П. Юргелевіча і А. Юрэвіча пачаў збіраць лексіку народных гаворак у дыялекталагічных экспедыцыях. І вось мінула больш як чатыры дзесяцігоддзі. Яго інтарэс да народнага слова не аслабеў, а ператварыўся, можна сказаць, у мэту жыцця. За яго плячамі важкі набытак у выглядзе дзевяці кніг народнай лексікі і фразеалогіі, шэраг публікацый у лексікаграфічных зборніках і перыядычных выданнях. Але крыніца роднай гаворкі не мялее. У гэтым пераконваешся, знаёмячыся з новым яго зборам. Слоўнік налічвае 2765 артыкулаў, у якія ўнесены і ў якіх раскрываюцца значэнні 5382 дыялектных слоў мясцовага ўжытку.

Аўтар як даследчык распрацаваў уласную сістэму падачы дыялектнай лексікі і паслядоўна прытрымліваецца яе. Гэта — так званы алфавітна-гнездавы камбінаваны спосаб. Сутнасць яго ў тым, што першыя рэестравыя словы падаюцца строга па алфавіце, але ў адным артыкуле нярэдка змяшчаецца па некалькі слоў, у які ўваходзяць аднакарэнныя словатворы.

Пра тое, што народная мова знаходзіцца ў няспынным руху, пастаянна развіваецца, папаўняецца новымі лексічнымі адзінкамі, сведчыць значная колькасць трапных, дакладных слоў, наватвораў, многія з якіх могуць папоўніць слоўнікавы запас літаратурнай мовы: **абдзёўбыш** — абдзяўбаны сноп, **абраголь** — ашуканец, **адчубасіць** — паўшчуваць, **выдрыпка** — злая жанчына, **галамза** — неакуратная асоба, **кардымяка** — суцаватая калода, **кухва** — распаўнелая жанчына, **натап** — месіва, дрыгва. Дарэчы заўважыць, што народ, называючы тое ці іншае паняцце, у той жа час дае яму пэўную ацэнку. Таму многія словы ў гаворцы нясуць ярка выражаную стылістычную афарбоўку. У слоўніку багатая сістэма дакладных стылістычных памет: гумарыстычнае — **выкаціць, гандлячыць, кеўканнік**; жартоўнае — **абшчапенівацъ, загробак, касіла**; узнёслае — **зямелюшка**; неадабральнае — **абшлындаць, барахлець, каньканнік**; іранічнае — **дзіміструля, залеж, заскробак**; асуджальнае — **бушавацель, вісельнік, каравашнік**; грубае — **далыбіцца, лопанне**; абразлівае — **выпса, крывамоpды.**

У свой час Г. Юрчанка выдаў збор дыялектнай лексікі ў трох кнігах "Народнае вытворнае слова". Але, як бачым, далёка не ўсё тады ўдалося сабраць. У гэтым выданні асноўнае месца таксама займае вытворная лексіка, якая дагэтуль не была яшчэ зафіксавана збіральнікамі. Гэта словы накшталт **абпясчаніць** — нанесці пяску, **абшмуляць** — зацерці, **безуважыцельнасць** — непавага, **вертануць** — крутнуць, **даразбандурываць** — даразбураць, **канаводнік** — злодзей, які крадзе коней, **любапытнік** — цікаўны чалавек. У гаворцы багатая і гнуткая сістэма форма- і словаўтварэння. Вось толькі асобныя ўзоры формаўтварэння ад назоўнікаў: памяншальная — **варок, вымца, гаварунчык, евенка, зелліка, мятка**; памяншальна-ласкальная — **канёчак**; памяншальна-зніжальныя — **дактарышка, кабылёначка**; узмацняльныя — **брысюга, езуіціна**; павелічальныя — **вадзішча, дзетварышча, дзевішча, мужчынішча.** Сюды ж адносіцца шэраг прыметнікаў з адценнем узмацняльнасці — жаўценны, кісленны, красівенны, круценны. Сустракаюцца арыгінальныя ўтварэнні назоўнікаў са значэннем зборнасці: **бамбіззе, барбасня, дзевяр'ё, каленне.**

Гэтае выданне мае і пэўныя адрозненні ад папярэдніх кніг Г. Юрчанкі. Сам укладальнік зазначае, што "тут часцей раскрываецца метафарычны бок мясцовай лексікі, пераносныя значэнні слоў. Гэта выкарыстанне слоў не па прамому іх прызначэнню, а зыходзячы з пэўнай аналогіі, падабенства таго, што слова абазначае звычайна, з тым, да чаго яно дастасоўваецца". Сапраўды, у слоўніку досыць часта сустракаем словы з паметай пераноснасці або метафарычнасці: **абстругаць** — паўшчуваць, **баўтацца** — заставацца непрыбраным (пра пасевы, луг), **вылініць** — схуднець, змарнець, **дамяць** — даесці, **жарнуцца** — ударыцца, **залятаць** — абараняць, **істрыцца** — намерваццa, **нагало** — цалкам, поўнасцю, **назвяздзіць** — пабіць без жалю. Асобныя прадметы, з'явы, паняцці маюць па некалькі найменняў, нярэдка таксама пераносных.

Укладальнік лексікаграфічнай працы дасканала валодае матэрыялам, глыбока ведае гаворку свайго раёна. Словы суправаджаюцца яркімі прыкладамі, у якіх раскрываецца іх сэнс і значэнне. У іх адлюстраваны жыццё і побыт народа, звычаі, нормы паводзін асобы, народная педагогіка. Народ умее ўсё заўважыць, прыкмеціць і трапна, вобразна даць ацэнку падзеям і з'явам. Вось паасобныя з прыведзеных ілюстрацый: **Адна глухавата і другая недачуе, сойдуцца дзве муздычанніцы, адна пра сваё, другая пра сваё, слухаць іх — жывая указэя; Маткіна дачушка, ні на шаг ад хваста не астаецца; Хлапецкім бытам галава дужа ні пра што не баліць.** А колькі з'едлівай іроніі ў адносінах да безгаспадарлівасці, абыякавасці, гультайства, асуджальных паводзін! **Тама дваронак такі: у хаце дзверы не прычыняюцца, а ў пуні вароты на адной завесе баўтаюцца; Ці не з'еў бы ты начыннічка? — можа, табе і на печ падаць; Велічалі, велічалі сваю Манічку, пакуля прынясла матцы ляльку ў пастанніку.** Некаторыя прыклады па форме і выразнасці набліжаюцца да прыказак, прымавак: **Зямля вырабатанне любіць; Малады кажны прыгожы, а старыя нікудышныя, Іх ні ў біла ні ў мяла.** Нярэдка прыклады перасыпаюцца ўстойлівымі спалучэннямі тыпу фразеалагізмаў і розных выслоўяў: **Во нецяцюйка, гавары ёй стрыжана, а ў яе ўсё голена; Што ж будзе з гэтых варвасюг, як у пер е ўбяруцца, ужо сячас па галавах ходзяць.**

І цяпер, калі ідзе адраджэнне мовы, культуры, усіх сфер грамадскага жыцця, зварот да народнай мовы, яе скарбаў актуальна як ніколі. З яе бяруць пачатак вытокі мовы літаратурнай. Нельга пераацаніць яе трапнасць, дакладнасць, уменне народа літаральна адным словам даць характарыстыку асобы, з'явы, падзеі. У ёй безліч акрэсленых азначэнняў, яркіх узораў сціслацці і выразнасці. Варта яшчэ не забываць, што ў наш час рэзка скарачаецца колькасць вясковага насельніцтва, асноўных носьбітаў народнай мовы. Таму з фіксацыяй дыялектнай лексікі трэба спяшацца, каб не было сорамна перад нашчадкамі, якім мы абавязаны перадаваць духоўныя скарбы, назапашаныя за стагоддзі нашымі дзядамі-прадзедамі. А што такіх моўных скарбаў шмат яшчэ не сабрана, сведчыць і гэты збор дыялектнай лексікі аднаго толькі кутка Беларусі.

Аркадзь НАРКЕВІЧ,
доктар філалагічных навук, прафесар

Г. Ф. Юрчанка. Сучасная народная лексіка. З гаворкі Мсціслаўшчыны. А — Н. Мн., "Навука і тэхніка", 1993.

Пошта

Лявон СЛУЧАНІН

Паважаная рэдакцыя "ЛіМа", шчыра дзякую за віншаванне з маім 80-годдзем! Маім ідэалам заўсёды была і застаецца незалежная, самастойная, заможная, адукаваная, культурная, чыстасардэчная, добрасумленная Беларусь! Гэтым пачуццём быў народжаны і верш, напісаны ў горкі для мяне час.

Аўтар

ЗЯМЛІ БЕЛАРУСКАЙ

Шмат прыгожых мясцін
на зямлі беларускай,
Яны сэрца маё пакарылі навек...
Жыў пад Гомелем я,
у Дуброўне, у Глуску,
А душа мая ў Слуцку заўсёды жыве.
Я хадзіў берагамі і Случы, і Шчары,
Я купаўся у Сожы, ныраў у Дняпры,
Я аблазіў Арэсы і Пцічы гушчары,
Любаваўся на Нёман з зары да зары.
Мяне шчыра ласкалі і сонца, і зоры
І прасілі да іх маю песню узняць.
Мяне духам паданняў натхнялі азёры:
І Дрысвяты, і Нарач, і возера Князь.
Я пад Гродна хадзіў любавацца барамі,
І здавалася мне,
што ты ў казцы жывеш.
Я знаёмы з табой і з тваімі зубрамі,
Дарагая мая Белавеж!
Дзе я толькі не быў,
што я толькі не бачыў,
Галаву ад павагі схіляючы ніц.
Дзе я толькі не піў
летнім поўднем гарачым
Берасцяным карцом
з беларускіх крыніц!
Ты заўсёды мяне сустракала, як маці:
Ці вяртаўся з вяселля,
ці з горкай бяды...
Я з касою хадзіў па тваёй сенажаці,
Харчаваўся супамі з твае лебяды.
Ты гадуеш людзей працавітых
і шчырых,
Простых з мовы, зычлівых з душы.
На прасторах тваіх
люд нязможаны вырас
На суглінках з пяском
і ў балотнай глушы.
У народзе тваім сілы — край непачаты:
У старанных мужчын,
у прыгожых жанок.
А якія цябе аздабляюць дзяўчаты!
Варта глянуць на іх —
дух займае ажно!
А люблю твае мірныя далі-палеткі,
На світанні над лесам лагоду-смугу,
Задуменнае неба, ласкавыя кветкі.
Я люблю цябе так, што забыць не магу.
Не магу без цябе на чужыне далёкай
Ні пазбыцца нуды, ні пазбыцца тугі.
Мяне цягне дадому
буслоў тваіх клёкат,
Што вясною і летам вартуюць лугі.
Мяне цягне прыветная песня жаўронка,
Што струменіцца з неба на нівы, лясы.
Мяне Случчына цягне —
юнацтва старонка,
Ненаглядны прасцяг сарамяжай красы.
Мяне цягнуць машын
працавітых маторы
І заводаў тваіх маладыя гудкі.
Мяне цягнуць дадому
лясныя прасторы,
Непачатых паэм залатыя радкі.
Мяне цягнуць прыгожыя гмахі сталіцы,
На якіх залаціцца Ярылы прыход.
Мяне цягне ўсё тое, чаму пакланіцца
Я не змог на працягу 15 год.
Мяне цягне тваё залатое світанне,
Што разгоніць дакучлівы, вязкі туман,
Што абноўленым днём
над Радзімаю ўстане,
Чалавечным і шчырым,
як радасць сама.
Мяне цягне дадому вялікая сіла,
Ад якое эпохі пачатак бяруць.
Мяне цягне жыццё, мяне цягне магіла,
Мяне цягне дадому мая БЕЛАРУСЬ!

1958 г. Варкута

КРЫНІЦА ПАМЯЦІ

ЛІТАРАТУРНАМУ МУЗЕЮ ЯКУБА КОЛАСА — 35 ГАДОЎ

Пад юбілей звычайна кажуць добрыя словы, падводзяць вынікі, падсумоўваюць зробленае. Але так ужо сталася, што дыялог з дырэктарам Літаратурнага музея Якуба Коласа З. Камароўскай у пярэддзень 35-годдзя ўстановы — захавальніцы памяці пра славутага песняра — атрымаўся хутчэй дзелавы, чым святочны.

— Зінаіда Мікалаеўна, першае, пра што хацелася б папытацца: ці большае, ці шырыцца прасцяг клопатаў па ўшанаванні памяці пра Якуба Коласа?

— Ведаеце, як ва ўсялякай справе, у нас і на працягу года ёсць свае ўзлёты і падзенні, своеасаблівыя ўздымы, усплёскі і — пэўнае зацішша. Пачынаецца каляндарны год — мы рыхтуемся да шырокіх сустрэч з аўдыторыяй, апрацоўваем фонды. У красавіку-маі праводзім мноства мерапрыемстваў. Пасля — нібыта некаторае зацішша, хоць і нядоўгае. Бо неўзабаве да дня смерці Коласа — 13 жніўня — зноў рупімся пра запамінальныя мерапрыемствы. А там у хуткім часе — Дзень ведаў, літаральна ўсе супрацоўнікі ідуць да дзятвы. Праводзім Коласаўскае свята "Песняй вітаю я вас...". І ўжо сапраўдны ўзлёт — Каласавіны. Іх прымяркоўваем на лісталад. Гэта ўсё — у межах аднаго года. А што тычыцца агульнай гісторыі музея, то і тут ёсць розныя перыяды, больш і менш турботныя, клапатлівыя. І ўсё ж такі музейнай цішыні ў нашых клопатах, у нашых думках і сэрцах, бадай, не чутно. Паўсядзённа ідзе шматгранная напружаная праца.

— Музей, гэта, канешне ж, не толькі экспазіцыя сама па сабе. Музей — гэта, відаць, і цэнтр даследчыцкай дзейнасці. Ці часта прыходзяць да вас літаратуразнаўцы, гісторыкі літаратуры? Ці, можа, ужо ўсё пра жыццё і творчасць Коласа, вядома, даследавана?

— Дзверы музея Якуба Коласа адчынены для ўсіх. Мы рады і студэнтам філфака Белдзяржуніверсітэта, педагагічнага універсітэта, калі бачым, з якой пытлівасцю ў вачах будучыя пісьменнікі, настаўнікі, навукоўцы цікавяцца той ці іншай коласаўскай тэмай. Пазнаёміцца з аўтографамі паэта прыходзяць да нас і сталыя, добра вядомыя даследчыкі. Тым больш, што фонды музея працягваюць папаўняцца унікальнымі матэрыяламі і зараз. Прыкладам — зусім нядаўна перададзены ў музей невядомы дагэтуль аўтограф паэмы Коласа "Суд у лесе". А захоўваўся ён дагэтуль у Эдзі Агняцвет.

— Зінаіда Мікалаеўна, у нас апошнім часам створаны першыя персанальныя літаратурныя энцыклапедыі — Скарынава, Купалава... Ці не марыце вы пра персанальную энцыклапедыю "Якуб Колас"?

— Вы закранулі, прызнацца, і балючую, і важную ў адначассе праблему. Даўно пра гэта вядуцца размовы. Але ж ёсць два, так бы мовіць, тормазы. Навукоўцы, мне здаецца, баяцца брацца за вырашэнне коласаўскай тэмы на такім узроўні. З купалаўскай энцыклапедыяй было прасцей. Прайшло больш часу з дня яго смерці, радні менш засталося, усе матэрыялы як быццам больш выкрышталізаваліся ў часе. Другі тормаз — велізарнейшы агульны аб'ём мяркуемых артыкулаў. Адзін толькі музей гэтага, канешне ж, не адолее. Маральна мы да працы над энцыклапедыяй гатовы. Нават некаторыя навуковыя распрацоўкі, даследаванні вядуцца менавіта з разлікам на перспектыву стварэння персанальнай энцыклапедыі, прысвечанай Якубу Коласу. Але ж патрэбны ўсеагульныя намаганні, і ў першую чаргу, канешне ж, — музея, Інстытута літаратуры, выдавецтва "Беларуская энцыклапедыя". Важна яшчэ і стварыць адлаведную грамадскую думку.

— Нялёгкі воз клопатаў пра коласаўскую памяць цягнуць разам з вамі і музеі-філіялы, што размешчаны на Стаўбцоўшчыне і ўваходзяць у Коласаўскі заказнік. Але ж нельга абмінуць увагай і іншыя мясціны, якія прыносілі Коласу натхнённе, сілкавалі яго талент. Прыкладам — Пухаўшчына, дзе Канстанцін Міхайлавіч праводзіў летнія месяцы адпачынку на працягу многіх гадоў.

— Справа тут вось у чым. Па зразумелых прычынах у справе мемарыяльнага ўшанавання памяці пра Коласа ў першую чаргу ўсе сілы, усе клопаты былі скіраваны на Стаўбцоўшчыну. Пухаўшчына ж — другая, скажам так, чарга. Сёння ўжо настае час, калі абмінаць пухавіцкую коласаўскую гісторыю было б проста неабачлівым крокам.

Сёлета ў экспедыцыях на пухавіцкай зямлі, ва ўсіх асноўных (а іх — шэсць) мясцінах пабывалі супрацоўнікі музея. Сустракаліся з людзьмі, якія памятаюць паэта, якія ведалі тыя сядзібы, дзе летаваў Колас. Запісалі многія ўспаміны, мясцовыя паданні, звязаныя з Канстанцінам Міхайлавічам.

Думаем устанавіць шэраг памятных знакаў на Пухаўшчыне. Але ж без сур'ёзнай падтрымкі мясцовых улад нам не абысціся. Дарэчы, і на Стаўбцоўшчыне шмат што ўдаецца якраз дзякуючы дапамозе на месцы. Энергічны руплівы там загадчык аддзела культуры райвыканкама спадар Грэкаў. Ён — паўнамоцны наш прадстаўнік у справе прапаганды творчасці і жыццядзейнасці паэта. Вось бы і на Пухаўшчыне так.

— Літаратурны музей Якуба Коласа — музей мемарыяльны. Тут жыў паэт. Але ж гэта накладвае пэўныя цяжкасці і на стварэнне музейнай экспазіцыі. Вы, відаць, увесь час перад выбарам — хочаце як мага шырэй расказаць пра Коласа і пры гэтым рупіцеся, каб не парушыць мемарыяльны характар, першаснасць вобліку коласаўскага дома?

— У ідэале, канешне ж, трэба асобнае памяшканне для экспазіцыйных залаў. А дом добра было б пакінуць такім, якім яго бачыў Колас, каб наведвальнікі максімальна адчулі атмасферу, сугучную жыццю паэта.

Да таго ж хачу заўважыць што сённяшняя экспазіцыя патрабуе сур'ёзнага эстэтычнага перагляду. Над гэтым зараз і думаем, ствараем новую канцэпцыю. Па-новаму стараемся перачытаць добра знаёмыя коласаўскія творы. Патрэбна і новае музейнае абсталяванне... Сённяшняя экспазіцыя ўрэшце састарэла, а наведнік і ў другі, трэці раз павінен спадзявацца на адкрыццё нечага новага. А новае ёсць... Ці правільней — не заўважанае раней старое. Пра Коласа шмат усялякіх легендаў абывацельскага характару. І часам як быццам па-за імі знаходзяцца паэтава шчодрасць, яго дабрыня. Вось усё гэта і плануем адкрыць, прадставіць у новай экспазіцыі. Спадзяёмся, што будзем яе мець дзесьці гады праз два.

Многа пытанняў узнікае зараз з заказнікам. Цудоўная наднёманская прырода, існуючыя ўжо філіялы ў Акінчыцах, Альбуці і Смольні, унікальны "Шлях Коласа", які складаецца з драўляных фігур персанажаў па матывах паэзіі Коласа, — усё гэта робіць стаўбцоўскія мясціны надзвычай дарагім для кожнага беларуса краем. У 1990 г. адкрылі экспазіцыю, прысвечаную паэме "Новая зямля". Дзякаваць Богу, у Ластку захавалася хата, якая помніць паэта яшчэ немаўляткам. Думаем аднавіць карчму ў тых мясцінах. Захаваўся стары склеп. Усё гэта трэба прыводзіць да ладу. А таксама — пашырыць абсягі турыстычна-экскурсійнай працы ў коласаўскіх мясцінах.

— А гэта ўжо, як кажуць, грамадска-арганізацыйная праца музея?..

— Калі па вялікаму рахунку, то для нас гэта ўжо не столькі праца, колькі стыль жыцця. Асаблівая напружанасць выпадае на лісталад. "Каласавіны", якія сёлета йшлі ўжо дзесяты год запар, з'яўляюцца свайго роду і падвядзеннем вынікаў даследчыцкай, пошукавай працы за ўвесь год. Апошнім часам вялікую ўвагу звяртаем на працу са школьнікамі і нават з дзецьмі ў дзіцячых садках. Праводзім фестываль " Сымон-музыка". З абласнога ён вырас да ўзроўню міжнароднага. Дарэчы, цікавы такі факт. Тройчы лаўрэатам яго была юная скрыпачка з Барысава Люда Бацэка. Фестываль "Сымон-музыка" праклаў ёй шлях да міжнароднага конкурсу Эрдэнка ў Бялградзе. Там у 1992 годзе яна стала лаўрэатам сярод выканаўцаў па класе скрыпкі.

Ва ўсіх клопатах кіруемся імкненнем прадставіць коласаўскую спадчыну, расказаць пра песняра ў судакрананні з самымі рознымі сферамі мастацтва і ўвогуле жыццядзейнасці.

Гутарыў
Алесь КАРЛЮКЕВІЧ

А "ДЗІЦЯТКА" ПАДРАСЛО...

Гісторыка-літаратурны зборнік "Шляхам гадоў", выданне якога ажыццяўляе "Мастацкая літаратура", адразу ж, пасля першага выпуску (а з'явіўся ён, як вядома, у 1990 годзе) знайшоў чытача. Найперш сярод тых, хто неабыякавы да нацыянальнай літаратуры, хоча лепей ведаць яе гісторыю, стасункі з іншымі літаратурамі. Зборнік ставіць сваёй мэтай знаёміць чытача з матэрыяламі, што ў асноўным уводзяцца ў шырокі ўжытак упершыню. Гэта, як правіла, архіўныя знаходкі апошняга часу, расказ пра творцаў, чые імёны, на жаль, пакуль мала што гавораць нашаму сучасніку.

І вось — чарговы, чацвёрты выпуск (укладальнік Я. Янушкевіч). Тэматыкай і праблематыкай ён у многім падобны на папярэднія, але разам з тым і адрозніваецца ад іх, паколькі цалкам "прысвечаны памяці старэйшага беларускага літаратуразнаўцы-медыявіста, тэкстолага і публікатара старажытных літаратурных помнікаў Аляксандра Фаміча Коршунава. Аднаго з тых, хто ў паваеннай Беларусі — разбомбленай, разрабаванай і выпаленай — падхапіў даўні запавет Власта".

Маецца пры гэтым на ўвазе выслоўе "Жатва много, но деятелей мало", узятае В. Ластоўскім з вуснаў евангеліста Мацвея для прадмовы да першай у свеце "Кароткай гісторыі Беларусі". А. Коршунаў заўчасна пайшоў з жыцця 12 ліпеня 1991 года. А якім ён быў — вучоным, літаратарам, чалавекам — можна даведацца з артыкула У. Кароткага "З зычливости ку моеи отчизне...": "...ён ніколі не змагаўся за больш цёплае месца пад сонцам, не быў змагаром-аратарам на трыбунах і ў шырокай прэсе. Пра яго, за яго гаварылі шматлікія кнігі, публікацыі — сапраўдныя першынцы на ніве нацыянальнай культуры". Гэта дзякуючы А. Коршунаву яшчэ ў 1959 годзе з'явілася фундаментальная "Хрэстаматыя па старажытнай беларускай літаратуры", гэта ён рыхтаваў "Прадмовы і пасляслоўі" Францішка Скарыны, выдаў "Помнікі мемуарнай літаратуры Беларусі XVII ст."...

Пачынаецца ж зборнік раздзелам "Эпісталярная спадчына". "Лісты самотнага чалавека" — такую назву даў А. Сідарэвіч артыкулу, у якім разважае аб перапісцы У. Жылкі з А. Луцкевічам. Тут жа змешчаны самі лісты, а таксама развітальнае слова А. Луцкевіча ў сувязі са смерцю У. Жылкі. Прапануецца і пераліска вядомага нямецкага славіста Рудольфа Абіхта і таго ж А. Луцкевіча. Пра жыццё і дзейнасць Р. Абіхта расказвае У. Сакалоўскі — "Забытыя старонкі гісторыі". Р. Абіхт на 66 годзе жыцця, у 1916 годзе, авалодаўшы беларускай мовай, стаў першым замежным вучоным, які пачаў чытаць яе курс. Адбывалася гэта ў Брэслаўскім універсітэце. Дарэчы, наколькі Р. Абіхт валодаў самім прадметам, яскрава бачна хоць бы па тым, што ў 1917—1918 гадах ён з лекцыямі выступаў перад беларускімі настаўнікамі ў Свіслацкай семінарыі.

У чарговым раздзеле ("Мемуары. Пісьменнікі пра сябе") — матэрыялы, што дазваляюць як бы прайсціся "шляхам гадоў", запыняючыся на пэўным перыядзе. У прыватнасці, В. Таранеўскі запрашае ў невялічкае падарожжа "Па старонках "Мемуараў" Яна Хрызастома Паска". Гэты аўтар у Польшчы даўно лічыцца найслыннейшым мемуарыстам, яго запіскі неаднаразова перавыдаваліся. А ў нас з імі знаёмы хіба спецыялісты-даследчыкі. І гэта ў той час, што "амаль тры гады жыцця і вайсковай службы Я.-Х. Паска былі звязаны з землямі Беларусі". Зразумела, гэтыя моманты ён не мог абысці ва ўспамінах.

Больш пашанцавала Францішку Савічу, пра яго нават ёсць кніга, напісаная А. Смірновым. Але дзякуючы Г. Тычцы (пераклад з польскай мовы) можна цалкам пазнаёміцца з мемуарамі Ф. Савіча і з адзіным вядомым вершам "Там блізко Пінська на шыроком полю" і са "Споведзю пакутніка". А папярэднічае гэтым публікацыям артыкул Г. Тычкі "Шлях змагара і пакутніка".

Нядоўгім было жыццё і Міхаіла Мялешкі — гісторыка, этнографа, публіцыста. Праўда, ён наш сучаснік, стаў ахвярай сталінізму. Вызвалены быў у 1940 годзе, а пра далейшы яго лёс нічога невядома. На шчасце, захаваліся некаторыя матэрыялы ў архівах, у тым ліку і дзённік, які і прапануе са сваёй прадмовай "Вяртанне" В. Бабкова. Нядаўна пайшоў з жыцця старэйшы паэт і перакладчык, чалавек няпростага лёсу П. Бітэль. Яго ўспаміны "Праз церні і завалы..." таксама ўвайшлі ў гэты раздзел зборніка.

Увогуле, што ні публікацыя, дык не пройдзеш міма. Вось раздзел "Пошукі і знаходкі. Публікацыі". М. Мельнікаў ("З творчай спадчыны Кірылы Златавуста") прапануе тры словы-павучанні Кірылы Тураўскага, узятыя з рукапіснага Саборніка XIII стагоддзя Расійскай Нацыянальнай Бібліятэкі ў Санкт-Пецярбурзе, і Пакаяльны канон, што прыводзіцца па тэксце рукапісу XVII стагоддзя Бібліятэкі Расійскай Акадэміі навук, таксама з Санкт-Пецярбурга. Г. Кісялёў ("Рэдкі дакумент") знаёміць з матэрыяламі пра тое, як рэагавалі тагачасныя ўлады на смерць У. Сыракомлі. У. Казбярук ("Забыты беларускі твор") прапанаваў да публікацыі паэму "Сцяпан і Тащцяна", змешчаную ў свой час у газеце "Минский листок" і падпісаную псеўданімам А. Шункевіч.

Ёсць новыя матэрыялы пра А. Гаруна — "Жыцця недапісаны ліст..." Ю. Гарбінскага і В. Скалабана, творы для дзяцей М. Гарэцкага, узятыя Т. Голуб з чытанкі Л. Чарняўскай "Родны край". Дзякуючы М. Дзелянкоўскаму ("З грудзей ірваўся крык пратэсту...") пабачылі невядомыя дагэтуль творы заходнебеларускага паэта П. Сёўрука, дзякуючы А. Бяляцкаму ("У мольнасці прыгаства") — творы Я. Юхнаўца.

Насычаныя і раздзелы "Іншамоўнае сваё" (М. Хаўстовіч пераклаў "Лісты пра Беларусь" Р. Падбярэскага, сказаўшы пра яго слова; У. Мархель прапануе ў перакладзе П. Бітэля паэму Т. Лады-Заблоцкага "Ваколіцы Віцебска"), "Штрыхі да жыццяпісаў" (Я. Янушкевіч знаёміць з адным дакументам, што тычыцца сям'і Луцкевічаў), "Клопаты тэкстолагаў" (Л. Мазанік разважае пра падрыхтоўку Збору твораў М. Багдановіча ў трох тамах), "Вывучаючы спадчыну" (Ю. Гарбінскі адкрывае малавядомую старонку ўкраінска-беларускіх навуковых і культурных сувязей, прадстаўляючы прафесара Інстытута Усходняй Еўропы ў Рыме У. Шчэбедзева, тут жа яго артыкул "Беларуская літаратура", перакладзены з украінскай мовы В. Домнічам; І. Саверчанка рэцэнзуе выданне "Статута Вялікага княства Літоўскага 1588 года).

Як бачым, выданне патрэбнае і, як кажуць, са сваім тварам. Добра, што прадоўжана завядзёнка, пачатая ў першым выпуску, а пасля чамусьці забытая — колькі слоў гаворыцца пра аўтараў артыкулаў. З'явіўся (упершыню) і паказальнік імёнаў, што робіць зборнік зручным для карыстання.

Але ж "дзіцятка" падрасло ўжо, таму не лішне і паўшчуваць яго. Высока ацэньваючы творы Я. Юхнаўца, застаючыся ўдзячным А. Бяляцкаму за падрыхтоўку іх да друку, усё ж лічу з'яўленне іх у "Шляху гадоў" выпадковым. Яны не ўпісваюцца ў структуру зборніка. Калі ісці гэтым шляхам, можна друкаваць і Н. Арсенневу, і М. Сяднёва, і У. Сядуру, і Я. Золака — усіх, хто сёння жыве ў замежжы. Прыкра, што артыкул да твораў М. Гарэцкага называецца "З чытанкі "Родный край" М. Гарэцкага". Прабачце, але ж чытанку складала яго жонка Л. Гарэцкая, (Л. Чарняўская). А ці патрэбны ў зборніку рэцэнзіі? Гэта ўсё ж жанр аператыўны. А то што атрымалася: статут ВКЛ 1588 года быў перавыдадзены "Беларускай энцыклапедыяй" яшчэ ў 1989 годзе, вось-вось з'явіцца яшчэ адно яго перавыданне, "Шляхам гадоў" толькі рэцэнзуе помнік. Хоць меркаванні І. Саверчанкі самі па сабе слушныя і заслугоўваюць увагі.

Алесь МАРЦІНОВІЧ

АНАТОЛЮ ІВАНОВУ — 80

Анатоль Іваноў па прафесіі — ваенны ўрач. Нарадзіўся ў сяле Зямлянск цяперашняга Сямілукскага раёна Варонежскай вобласці (Расія). Пасля заканчэння ў 1937 годзе Варонежскага медыцынскага інстытута звязаў свой лёс з арміяй. Служыў на Далёкім Усходзе. У 1938 годзе прыняў удзел у баях ля возера Хасан, а ў 1945-ым — у разгроме японскай Квантунскай арміі. З 1946 года служыў у Беларускай ваеннай акрузе. У 1963-ым звольніўся, жыве ў Бабруйску.

Як і многія, пачынаў з вершаў, якія яшчэ ў 1933 годзе апублікаваў ва універсітэцкай шматтыражцы. Піша па-руску. Шырокую вядомасць А. Іванову прынёс раман "На Дальнем Востоке". Першае выданне выйшла ў 1954 годзе, апошняе — у 1986-ым. Аўтар таксама аповесці "Под нами цель" (1976).

Віншуем Анатоля Васільевіча з днём нараджэння! Жадаем здароўя і яшчэ раз здароўя!

ЯЗЭПУ ЛЁСІКУ ПРЫСВЯЧАЛАСЯ

Споўнілася 110 гадоў з дня нараджэння аднаго з самых выдатных беларускіх адраджэнцаў, мовазнаўцы, пісьменніка, грамадскага дзеяча Я. Лёсіка. Язэп Юр'евіч належаў да людзей, якія, жывучы сумленна і годна, працуючы апантана і самаддана, рупіліся пра будучыню Бацькаўшчыны, рабілі ўсё, каб Беларусь стала суверэннай. Ды, на жаль, Язэп Юр'евіч стаў адной з мільённых ахвяр таталітарызму, яму была "наклеена" бірка "ворага народа", "знятая" толькі некалькі гадоў назад.

Жыццёвы, творчы, грамадскі шлях выдатнага адраджэнца паўстаў ярка і шматгранна на навуковай канферэнцыі, прысвечанай 110-годдзю з дня нараджэння гэтага пакутніка за беларускасць, што прайшла ў Акадэміі навук Беларусі. Пра слаўнага сына Бацькаўшчыны гаварылі акадэмікі А. Падлужны, В. Каваленка, кандыдаты гістарычных навук А. Мяснікоў, С. Якушэвіч і іншыя.

Н. К.

ПРОСТА... КАЦЯРЫНА

Шчыра кажучы, з інфармацыі, дасланай з Магілёва, зразумелым было толькі тое, што ў абласным драматычным тэатры 19 кастрычніка адбылася прэм'ера спектакля "Кацярыніны жарсці" паводле п'есы А. Грэмінай "За люстрам", што галоўную дзеючай асобаю там з'яўляецца расійская імператрыца Кацярына II, і што яна была... проста жанчынаю. Але, напэўна, рэжысёр спектакля Віктар Куржалаў і актрыса Святлана Кліменка (менавіта яна выконвае цэнтральную ролю) зрабілі на сцэне нешта да вялікай ступені вабнае: прэм'ерныя спектаклі суправаджаюць аншлагі. Аншлагі, такія неабходныя любому тэатру, такія жаданыя і такія рэдкія цяпер! Радуюцца маладыя акцёры Галіна Лабанок і Уладзімір Саўчыкаў, занятыя ў спектаклі (апошні, сёлетні выпускнік культасветвучэльні, сыграў сваю першую буйную ролю). Падазраю, што па-свойму вельмі задаволены і мастак спектакля Марк Волахаў, — яго ўжо аншлагі суправаджаюць ці не ўсё жыццё, але ён шчыра рупіцца, каб і маладыя калегі часцей зазнавалі смак поспеху. Ну а што там адбываецца на сцэне з проста жанчынаю, проста Кацярынаю-імператрыцаю? Даведаюся — паінфармую.

Ж. Л.

На здымку: Святлана Кліменка (Кацярына II) і Галіна Лабанок (графіня Брус).

Фота Вадзіма КУСТОВА

Сяргей ГРАХОЎСКІ

І БЕЛАРУСЬ-ПАКУТНІЦА ЎЗЫХОДЗІЦЬ...

САЛОДКАЕ ВІНО

Давай з табой на развітанне
Дап'ём салодкае віно,
Прыпомнім першае каханне
І ўсё, што канула даўно,

Як разам салаўінай ноччу
Прымялі буйную расу,
І я шаптаў, што не сурочу
Тваю дзівосную красу.

Ты ўпершыню назвала "любы",
Як толькі месяц узышоў.
Твае асмужаныя губы
Я, не шукаючы, знайшоў.

Так праляцела паўстагоддзя,
Нібыта у нямым кіно...
Давай нарэшце ў поўнай згодзе
Дап'ем салодкае віно.

26/VII—94.
Іслач

НЕПАЗБЕЖНАСЦЬ

Куды вы знікаеце, сілы?
Што траціў і трачу дарма?
І сцежку да ўласнай магілы
Нарэшце завее зіма.

Увесну асунецца гліна,
Дажджы прыпляскаюць пясок,
З разбітай маланкай галіны,
Як слёзы, закапае сок,

А болей ніхто не заплача,
Не ўспомняць сябры і сусед,
Таму, што нічога не значыў
Мой доўгі заблытаны след.

Нягоды мае і пакуты,
Абразы, паклёпы і здзек
Закрэсліць каварны і люты
Крывава-бязлітасны век.

Я ў шэрагу тых міліёнаў,
Што хутка растануць, як тло,
Без слёз, без пахвал і праклёнаў,
Нібыта зусім не было.

І ўсё-такі я не шкадую,
Што сілу пакуты звялі,
Бо зведаў красу маладую
І радасць, і боль на зямлі.
Штодзённа паволі знікаю,
А ўсё ж суцяшэння шукаю.

22—27/VII—94
Іслач

АПОШНЯЕ СВЯТА

Адкрый мне тое патаемнае,
Пра што ты марыш і маўчыш,
Прыемнае ці непрыемнае,
З чым засынаеш, з чым не спіш.

Магчыма, я і вінаваты,
Што не хапіла цеплыні,
Што самыя святыя святы
Былі, як катаржныя дні.

Часамі ты не разумела
Маю збалелую душу,
Пакутавала і нямела,
Што я спагады не прашу.

Мы ўсе закончылі разлікі
І вінаватых не знайшлі,
І неразлучна шлях вялікі,
Як два пакутнікі прайшлі

Праз нечаканасці і страты
Аж да апошняе мяжы.
Якога ты чакаеш свята,
Нарэшце шчыра раскажы.

28/VII—94.
Іслач.

ЭТАПЫ... ЭТАПЫ...

Ізноў адпраўляюць у ссылку.
На колькі, не кажа ніхто.
Не ўзялі ад жонкі пасылку —
Валёнкі, тытунь, паліто.

Глядзяць, як ваўкі, канваіры,
Мурашкі паўзуць па спіне.
Куды мы прыб'ёмся ў Сібіры,
І што там чакае мяне?

Даўно закацілася лета,
Як бабы, галосяць дажджы,
Размоклі старыя шціблеты,
Заклякла душа у плашчы.

Дрыжу, як лісток на асіне:
Паўзе на калёсах турма,
Малюся святой Ефрасінні,
Хоць слёз і надзеі няма.

На нарах — прафесар і дворнік,
Пісьменнік, святар і кінто,
І кожны — "паўторнік",
"паўторнік",
Завошта, не знае ніхто.

Этапы, этапы, этапы,
Пражаркі і "шмоны" штодня,
І лапаюць брудныя лапы,
Нібыта цыгане каня.

Цярплю, а дзяўчат нечапаных
Шчарбатая брытва шкрабе,
І хэўра наглядчыкаў п'яных
Ахвяр выбірае сабе.

Калі Ты ўсё ведаеш, Божа,
Як можаш глядзець і цярпець?
Няўжо нам ніхто не паможа
Астатнюю песню дапець?

Няхай бы Архангелаў трубы
На ўсе галасілі лады:
"Ратуйце сумленных ад згубы,
Пазбаўце жывых ад бяды".

І я забываўся маліцца,
Бо ірад спаганіў "Псалтыр".
Ляжала наўкол плашчаніцай
У срэбным тумане Сібір.

РАЗВЯДЗЁНКА

(З народнага)

Белы тонкі кужаль
На вячорках ткалі,
Колісь мела мужа...
Як жа яго звалі?

Я цвіла, як ружа,
Як рабіны гронка.
Не ўтрымала мужа, —
Стала развядзёнка.

Мужа я паклічу,
Бо даўно любіла,
Толькі вось абліччa
І імя забыла.

Мы хадзілі пешкі
У зялёным жыце.
Вы яго да сцежкі
Клікаць памажыце.

Тая сцежка стала
Бітаю дарогай.
Я гукаць прыстала,
Лепш знайду другога.

ГОНАР БЕЛАРУСІ

Зямля ад Буга, Нёмна і да Сожа,
Ты мне за ўсё на свеце даражэй.
Няхай цябе усемагутны Божа
І нас, і нашу долю беражэ.

Народ не будзе болей анямелым,
Ніколі больш не ашукае зброд.
Пад сцягам бел-чырвона-белым
Здабудзе шчасце наш народ.

Мы гаравалі з веку і да веку,
А мову і сумленне зберaглі,
Яго імя вярнулі чалавеку
Святое Беларускае зямлі,

Каб назаўсёды праўнукі і дзеці
У нашым светлым доме і ў гасцях
Пранеслі славу Беларусі ў свеце
І бел-чырвона-белы сцяг;

Каб узмужнела воля у народзе,
Каб разумеў яго сумленны лад...
І Беларусь-пакутніца ўзыходзіць
На вечны і пачэсны свой пасад.

1992.

ЭКСПРОМТЫ

У чарзе, на вуліцы, у трамваі, у метро часта чую трапныя і дасцінныя рэплікі і сказы затурканых, знясіленых і абрабаваных людзей. Каб не забыць самага цікавага, спяшаюся запісаць, а яно раптам возьме ды зарыфмуецца, прыкладна вось так:

Пакуль не зваліцца са сцэны
Чыноўнік, падымацьме цэны
На кілаграмы і на метры,
І на ваду, і на паветра,
На пляшку кіслага віна,
А падае — ЯГО цана.

•

У барыгавай паненкі
Ёсць мільёны і сукенкі.
Ёй надзейней і з рукі
Будаваць асабнякі.

•

Адымаюць мову, слых і зрок, —
Дабіваюць дзеткі мацярок,
Каб справіць пахавальную імшу,
Забыўшыся пра ўласную душу.
Напэўна, і для дзетак навіна,
Бо не прыпомняць: а ці ёсць яна.

•

Што радзіўся надта позна,
Трэба татку дакараць,
Бо ў краіне адыёзнай
Страшна жыць і паміраць.
Назапась "зайцоў" асьміну
На вянок і дамавіну.

•

Песняры партапарату
Пачалі другую рату.
І разлік у іх сучасны, —
Забяспечыцца вадой:
Брыты быў парторг калгасны,
Фермер ходзіць з барадой.
Перавыканаўшы план,
Ён памог зляпіць раман.

•

"Складаны" аўтар рады
З Сусвету галасам,
Складаючы шарады —
Пра што, не знае сам.

•

Верш і казку для дзяцей
Трэба скласці карацей,
Але часам сам грашу, —
Вершы доўгія пішу.

•

Едим прошеное, носим брошенное, живем краденым.

(В. Пікуль)

З працягнутай рукой адны
Стаяць, як правадыр пры ўладзе,
Другія латаюць штаны,
А нехта крадзе, крадзе, крадзе.

•

Не жанчына, проста — цуд:
Ношкі цягне, як вярблюд.
"Глядзі, каб не парваўся гуж!" —
Крычыць з кювета п'яны муж.

•

Маліліся нядаўна партбілету
Цяпер крыжу і Філарэту.

НАБАЛЕЛАЕ

Трагічны век чырвона-чорны
Ў нябыт сплывае спакваля.
Мільгнуў, як знічка, дзень твой зорны,
Крывёй набраклая Зямля,

Пякельнай тручаная парай,
Ты ўсё становішся пусцей,
Асуджаная боскай карай,
Ты — ўся з магіл, ты — ўся з касцей

Сыноў знявечаных, забітых,
І ледзьве ўспомненых пасля,
Зняважаных, ды не забытых,
Незразумелая Зямля.

Магчыма, ты адна ў Сусвеце
Блакітнай зоркаю гарыш,
Сябе ж твае калечаць дзеці
І на Галгофу цягнуць крыж.

Ліхім асуджаныя лёсам,
Свой век мы ўславіць не змаглі.
Каб дабрату даў Бог і розум,
І мы б па-людску зажылі.

Жнівень-верасень 94.

Проза

Іван ЧЫГРЫНАЎ

КАРОТКІЯ АПАВЯДАННІ

"ПУШКА ГАННА"

Такая ўжо наша праца, пісьменніцкая, што багата матэрыялу ідзе ў так званыя адыходы. Але кажуць, — з адыходаў увогуле цяпер шмат каштоўнага вырабляюць. Нават горы шлакаў неяк перапрацоўваюць. Прынамсі, сёння па тэлевізары нейкі чалавек даказваў, што з пакінутай, ужо нікому непатрэбнай сыравіны асабіста ён вылушчвае золата, якое ў далярах вяртае дзяржаве. Праўда, пры гэтым яму даводзілася ўвесь час апраўдвацца, бо ягоная "перапрацоўка" той сыравіны на самай справе звязана з нейкім шарлатанствам, па крайняй меры, калі не са звычайным крадзяжом. У нас, у пісьменнікаў, не так. Проста, багата здабытага матэрыялу, калі можна так гаварыць, сапраўды ідзе ў адыходы, паступова шмат якія падзеі, не кажучы ўжо пра дэталі, факты і гэтак далей, забываюцца, бо не кожнае лыка лёгка ўлазіць у радок. Гэта аднолькава датычыцца і прозы, і драматургіі, і паэзіі. Між тым, вельмі карысна бывае часам пакорпацца ў памяці сваёй, у запісных кніжках...

Некалі з'явілася ў мяне задума напісаць раман пра Вашчылу. Але часу не ставала. Тым разам надыходзіла трохсотгоддзе з дня нараджэння яго, а беларусы нічога не ведалі пра кіраўніка Крычаўскага паўстання. У памяці народнай мала засталося з тае пары, адно апісанне Андрэя Меера, якое пры савецкім часе, здаецца, нават не перавыдавалася, ды яшчэ дражнілка пра крычаўскіх дзявок, якая прыйшла з сярэдзіны васемнаццатага стагоддзя, маўляў, ваш-чыл-кі вы! Гэта, няйначай, магло сведчыць хутчэй за ўсё пра тое, што Вашчылавы паўстанцы не толькі паваявалі ў Крычаўскім старостве, але і да местачковых кабет праявілі вялікую цікавасць, дакладней, папоўзлівасць... Ну ды гэта ўсё здагадкі, меркаванні, хоць, вядома, даволі лагічныя. Пра самога ж Вашчылу, пра ягонае паўстанне, не з'явілася ў народзе ні песні, ні байкі, ні падання. Пра ўкраінскіх казакаў, якія прыходзілі на Беларусь з вайной, нават цяпер ледзь не ў кожным застоллі спяваюць, а пра свайго атамана хоць бы слова!.. Здавалася б, нацыянальная энцыклапедыя павінна была б аднавіць справядлівасць. Але дзе там! Толькі і хапіла месца на адну згадку, што быў, маўляў, такі бунтаўшчык, а вось калі нарадзіўся, дзе на свет паявіўся, калі і дзе свой канец знайшоў, — невядома. Тым часам у расійскіх архівах больш за два з паловай стагоддзі праляжала нікім незапатрабаваная следчая справа Вашчылы.

Раман я не стаў пісаць. А вось да трохсотгоддзя з дня нараджэння Васіля Мацеевіча драму паспеў стварыць. У Магілёўскім тэатры паставілі па ёй спектакль, але няўдалы. І я не люблю яго глядзець.

Між тым, у загалоўку гэтым сказана пра "пушку Ганну". Здаецца, на той час, як пачуў пра яе, у мяне ўжо хапала ўсяго. У кожным разе, я ведаў, дзе знаходзіцца замак Гераніма, адшукаў таксама Царковішча, вёску, у якой адбылася апошняя бітва паўстанцаў з конніцай слуцкага князя, уладальніка Крычаўскага староства. Праўда, на тое Царковішча ў Клімавіцкім раёне я натрапіў неспадзявана, бо далей па дарозе з Родні ў маё Забесяддзе было другое Царковішча, дарма што перайменаванае ў Пралетарскае. (У апошнюю вайну там амаль цалкам палёг рабочы полк з Ленінграда, таму і назвалі вёску ў яго памяць). Я нават ездзіў туды колькі разоў паглядзець на мясцовасць, помню, аднойчы прыехаў у тую самую раніцу на прадвесні, калі мае землякі ў 1744 годзе панеслі вялікія страты і назаўсёды разышліся, скончыўшы змаганне супраць Радзівілаў. Гэта было на золку, на рыхлым снезе, з колкім ветрам. Якраз тады і прыйшло мне ў галаву, што трэба шукаць іншае Царковішча. Недзе ж яно было, а можа, і ёсць? Справа ў тым, што да другога Царковішча, якое ляжыць ажно ці не за пяцьдзесят кіламетраў ад Крычава, не магла дабрацца па студзяністай, зусім не тупкай дарозе за адну няпоўную ноч конніца. І я пачаў шукаць другое Царковішча. Ужо ўлетку, прыгожым надвячоркам, ехалі мы з таварышам палявымі дарогамі з Лобжы, з радзімы Васіля Вашчылы, на Хоцімшчыну. Я ўжо казаў, што паселішча, дзе знаходзіўся замак Гераніма Радзівіла, я ведаў. Але ў Крычаўскім старостве, якое атрымалі Радзівілы ў спадчыну ад польскага караля і вялікага князя літоўскага, быў таксама замак і ў Ганны Радзівілішыхі, Геранімавай маці. Больш таго, было некалі цэлае мястэчка, што так і называлася — Ганна. Па маіх меркаваннях, яму належала знаходзіцца недзе паблізу Хоцімска, на беразе Бесядзі. Аднак ніводная карта цяпер не паказвала гэтага. І ўсё-ткі трэба было шукаць і другое Царковішча, і мястэчка з назваю "Ганна".

Дзень той у нашай паездцы выдаўся цудоўны; паветра стаяла чыстае, здаецца, нават без пахаў; гэтакае паветра я ўдыхаў толькі ў лазні, пасля таго, як цалкам выходзіў з яе "дух". Разы са два ў дзяцінстве даводзілася нават начаваць у лазні з такім паветрам з дзедам Ігнацькам. Ужо дарослым я мог параўнаць тое гаючае паветра з паветрам саляных капальняў. Дык у той дзень таксама штосьці падобнае адчувалася вакол. І мы ехалі сабе ды ехалі. Нарэшце ўбачылі ў маленькай вёсачцы, падзеленай на дзве вуліцы рачулкай, дзядзьку ў сярэдніх гадах, які тапіў лазню. То мы і напрасіліся папарыцца разам. Праўда, пара венікаў прайшла ўжо к таму часу, але гаспадар паспеў назапасіць, так што праблемы не было, чым парыцца. Зразумела, што мы таксама не захацелі, як кажуць, упасці тварам у лужыну, паказалі вясковаму чалавеку свае гарадскія "запасы". Словам, паразумеліся ды сышліся адзін з адным. І ўжо калі я нарэшце апынуўся на палку, а гаспадар пачаў патрэсваць над маёй голай постаццю распараным венікам, прыйшла думка спытаць яго:

— Як жа завецца ваша вёска? А то, можна лічыць, што...

— Царковішча, — сказаў ён, перапыніўшы мяне.

Я крактануў ад нечаканасці, а выйшла, як ад здаволенасці. Больш не стаў распытваць яго. Рашыў зверыць усё па карце. І вось пасля добрай апрацоўкі мяккім венікам выбягаю я ў сенцы, выліваю на сябе проста з вядра халодную, ажно колкую ваду, затым шыбую па карту, якая заўсёды была ў дарозе са мной. Так, ад Крычава да гэтага Царковішча кіламетраў дванаццаць. Значыць, апошняя бітва вашчылаўцаў тут адбылася?

Вярнуўшыся ў лазню, я спытаў гаспадара:

— Ці чулі вы што пра Вашчылу?

— Гэта пра якога Вашчылу? З Семяноўкі?

— Не, з Лобжы, — кажу я. — А яшчэ Вашчылы некалі жылі ў Мурыным Бары.

— Гэта недзе далёка. А Лобжа — тут. Рэчка такая ёсць, Лобжа, ну і... вёска каля яе, Лобжа. Дык Вашчылу я ведаў. Сам я цясляр. Скажу не хвалячыся, нядрэнны цясляр. А вось Вашчыла быў пячнік. Памёр, царства яму нябеснае. Але ж пахадзілі мы з ім па зямлі, каму толькі печкі ні рабілі. Іншы раз паглядзіш, як з комінаў дым ідзе, дык душа радуецца — мая ж справа, не чыя. Так што Вашчылу таго я ведаў.

— Ды не таго, — паправіў я і пачаў расказваць пра тамтэйшыя падзеі васемнаццатага стагоддзя.

— Не, — сказаў чалавек, — пра таго Вашчылу я не чуў. І ніхто ў нас пра яго не ведае. Інакш бы і я штоколечы чуў. Нас тут мала. Сам жа бачыў — адзін двор, два... ды на тым баку рачулкі столькі ж. І пра тое, што біліся тут мужыкі некалі з панамі, ніхто не расказваў. Можа, у кніжках ёсць, га?

— Ды не дужа і ў кніжках ёсць.

— Шкада, — уздыхнуў ён зусім пачціва, — што і ў кніжках пра такое не пішуць. Праўда, на могілках нашых засталіся нейкія металічныя агароджы. Ляжаць паваленыя. Даўно ўраслі ў зямлю. Можа, імі брацкія магілы некалі абнесены былі? Вы б схадзілі, паглядзелі. Гэта зусім недалёка адсюль.

Я і праўда схадзіў на вясковыя могілкі, балазе, побач. Часткі металічнай агароджы былі некалі выкаваны адмысловай рукой, але на чыёй яны магіле стаялі, ніхто ўжо не помніў...

Такім чынам, тое Царковішча, дзе адбылася апошняя бітва вашчылаўскіх паўстанцаў, было нарэшце знойдзена. Але яшчэ многа заставалася нявысветленым, дарма што на руках у мяне была ўжо і следчая справа Вашчылы, якая вялася ў Кіеве вясной і летам 1744 года. Узяць тое ж мястэчка Ганна... Дзе яно цяпер? Ці хоць бы даведацца, дзе яно стаяла некалі. Гэта толькі здаецца, што для пісьменніка канкрэтнасць справа адносная. Я, напрыклад, не магу рухацца далей у сваёй рабоце, калі нешта застаецца недаследаваным, быццам штосьці тады стрымлівае пяро. Іншая рэч, што ўсё роўна ўсё не змесціцца ў творы, аднак тым не менш адчуванне стрыножанасці моцна дае адчуваць сябе. Таму можна зразумець, што я каторы год настойліва імкнуўся знайсці тутэйшы замак Радзівілішыхі. І адшукаў, але не сам замак, Замчышча. Стаяў некалі замак сапраўды на правым беразе Бесядзі, насупраць цяперашняга Хоцімска. Там ёсць адна зарэчная вуліца, яна і ўяўляла сабой мястэчка Ганна.

Але перад тым, як ступіць на збуцвелае Замчышча, давялося нямала пахадзіць, паездзіць вакол Хоцімска, часта наведваючы Трасціно, дзе жыў дасведчаны ў мясцовых справах краязнаўца Лясоўскі. Ён працаваў там бібліятэкарам. Словам, быў карысным для мяне чалавекам. І ад яго шмат пра што даведаўся, асабліва што датычыць старасвеччыны. Паколькі прыехаў я той раз "рафам", то месца для пасажыраў хапала. Дні праз два ўжо "раф" быў паўнюткі — і ў раённай рэдакцыі хацелі дапамагчы, і ў аддзеле культуры, і ў раённай бібліятэцы. Але доўга мы не маглі ўчапіцца за штосьці вартае ўвагі, каб злучыць у адно ўсе здабытыя звесткі. Нарэшце сышліся на тым, што мястэчка Ганна знаходзілася недзе кіламетраў за дзесяць ад Хоцімска, там, дзе вытыркаліся з зямлі невядомыя мясцовым людзям цагляныя падмуркі. Прынамсі, гэта ўжо нешта каштавала. У кожным разе, паяўлялася магчымасць скласці пэўнае ўяўленне і пра мясцовасць, і, калі хочаце, пра людзей, ад якіх гісторыя ўсё роўна як свядома адварочвалася. Я ўжо казаў, што ездзіла нас шмат у "рафе", працавалі акурат талакой. Ну а паколькі ўжо здалося было, што мэта дасягнута, то гаспадару (а гаспадаром, вядома, з'яўляўся я) у падобных выпадках належала "прывячаць" талакоўцаў. Ад традыцыі нікуды не ўпячэш. Ды і навошта?

Спыніліся мы для пачосткі каля двара аднаго з настаўнікаў, які таксама прагойсаў з намі цэлы той дзень. На вясковых гародах к таму часу ўжо шмат чаго нарасло — гуркоў было на градах саліць не перасаліць, хапала памідораў, цыбулі, ну а хлеб з сырымі яйкамі таксама знайшліся. Уселіся мы вакол тоўстага пня, што застаўся ад старой, але моцнай ліпы. На ім яшчэ нават гадавыя кольцы выступалі з усёй выразнасцю.

Зразумела, што за "сталом" працягвалася ранейшая размова. Праўда, яна ўжо атрымлівалася не такая выразная, як у часе паездкі, але пастух, які непрыкметна спыніўся каля нас, прыслухаўшыся, усё-ткі зразумеў, што да чаго. Ніхто з нас на яго зусім не звярнуў увагі, а ён узяў ды азваўся:

— Вам нічога не гаворыць пушка Ганна?

— Што за пушка? — пытаюся.

— Ну, звычайная, на драўляных колах і сама з дрэва.

— Ціха, — сказаў я, зразумеўшы раптам, што нам гэтага чалавека ўвесь час не хапала.

— Ну-ну? — падахвоціў яго настаўнік — яны былі з аднае вёскі.

— У дзяцінстве мы каталіся на ёй, — сказаў пастух.

— Дзе?

— На Замчышчы.

— Дзе тое Замчышча?

— На беразе Бесядзі. Там цяпер хоцімская вуліца.

— А не ведаеш, дзе было мястэчка Ганна?

— Не чуў. Але пушку Ганну помню.

— Тады выпі з намі, — паднёс яму шклянку настаўнік.

Пастух выпіў, заеў хлебам з гурком, тады паклаў абедзве далоні на кій. Выгляд у яго быў усё адно як адчужаны, быццам паведаміў ён толькі што не штосьці важнае для мяне, а так, драбязу; ну ішоў міма, пачуў, сказаў. А я ўжо ведаў, што мы падступіліся вельмі блізка да разгадкі. Справа ў тым, што не толькі ў войску Вашчылы, але і ў мясцовых замках феадалаў на ўзбраенні тады былі часцей драўляныя гарматы. Для пораху мясцовыя людзі здабывалі сыравіну ў нетрах сваёй зямлі, ядры таксама адлівалі з балотнай руды, якой скрозь хапала, а вось металу, з якога можна было зрабіць гармату, тут не знаходзілі. Таму жэрлы рабілі з моцнага дрэва, беручы іх у дубовыя абручы. Значыць, і "пушка Ганна" была створана такім чынам.

— Сядай, — сказаў я, паказваючы на "раф".

Чалавек трохі памуляўся, быццам ад зніякавеласці пачаў раздумваць, як яму паступіць, але тут жа быў падахвочаны яшчэ адной чаркай, і мы ўсе, хто сядзеў вакол ліпавага пня, паехалі бліжэй да Хоцімска. Цяпер ужо і на Зарэчную вуліцу глядзелі інакш. Сапраўды, магла яна некалі быць цэнтрам мястэчка. Але галоўнае — Замчышча. Яно кідалася валам яшчэ ад вуліцы, знаходзілася на самым беразе Бесядзі, там, дзе да мінулай вайны вісеў над вадою драўляны мост, які спалілі ў сорак першым годзе партызаны з атрада Мядзведзева, калі штурмам бралі Хоцімск.

— Вось тут мы і каталіся на той пушцы, — паказаў на гарбатае Замчышча пастух.

— Дзе ж яна? — Зразумела, што гэтае запытанне павінна было прагучаць.

— Не ведаю, — адказаў пастух. — Але на драўлянай пушцы Ганне мы каталіся ў дзяцінстве. Некалі я тут, на гэтай вуліцы, жыў.

НАШЫХ ПАБІЛІ

І яшчэ адна згадка ў сувязі з пошукамі Вашчылы. Дакладней, вакол Вашчылы. Сапраўды, наш нацыянальны герой нават пасля смерці нёс на сабе нямала нялюдскасці. Чамусьці яго заўсёды вінавацілі ў забойстве крычаўскіх яўрэяў-арандатараў, братоў Іцкавічаў. І ўсё паўстанне пад кіраўніцтвам Вашчылы скіроўвалі ў рэчышча антысемітызму... Менавіта гэтым некаторыя тлумачылі мне і тую акалічнасць, што Васіль Мацеевіч не ўдастоіўся ні песні, ні легенды. Маўляў, гэта яўрэі яму помсцяць.

Можаце паверыць, што, збіраючы матэрыял пра Вашчылу ў архівах, я самым сур'ёзным чынам вывучаў і ягоны "антысемітызм". Дык вось, дарагія мае яўрэі і не яўрэі, у той час, г. зн. у 1744 годзе Іцкавічаў не было ў Крычаве. Парабаваўшы колькі гадоў мясцовых мужыкоў, яны выехалі адтуль, але ў Еўропу сапраўды не трапілі. Бясследна прапалі. Ну а паколькі ў часе вашчылаўскага паўстання іх не было ў старостве, і забітыя яны не маглі быць, тады лагічна, што шукаць сляды трэба

(Працяг на стар. 14)

ДЗВЕ "ПЯЦЁРКІ" ЛЬВА ЛЯХА

У адкрытай кнізе беларускага музычнага мастацтва ёсць сціпла вядомыя імёны, за якімі — вялікая плённая праца дзеля росквіту і прапаганды роднай культуры. Адно з такіх імёнаў — Леў Лях, музыкант адметны, дырыжор са сваім абліччам, які ўмее мэтанакіравана ўвасабляць свае выканаўчыя задумы, што варта не толькі павагі, але нярэдка і захаплення.

Вось ужо 20 гадоў Леў Палікарпавіч — за дырыжорскім пультам тэатра оперы і балета Беларусі. Імкнучыся парадаваць слухачоў мастацтвам вялікіх майстроў-кампазітараў мінулага і сучаснасці, ён не толькі сам пасапраўднаму захапляецца музыкай, якую выконвае, але і ўмее захапіць аркестр і артыстаў на сцэне. Поўнае падпарадкаванне задуме кампазітара, рыцарскае служэнне вялікаму мастацтву вымагае ад дырыжора стрыманасці і самаабмежавання. Памятаючы пра гэта, дырыжор Л. Лях падчас спектакля не дэманструе экстатычнай узбуджанасці, распаленай экспрэсіі, знешняй парывістасці, што гэтак падабаецца некаторым слухачам. Яму больш блізкія зусім пэўныя эмацыянальныя танальнасці, паглыбленасць думкі, духоўнасць, інтэлектуальная культура... Інакш кажучы, яму больш уласцівыя раўнавага і гармонія, сінтэз эмацыянальнага і рацыянальнага.

Прысутнічаючы на спектаклях Л. Ляха, міжволі паддаешся "абпраменьванню" яго энергіі, тэмпераменту — не яркага, але моцнага, уладарнага, але стрыманага, так бы мовіць, інтэлігентнага. Маэстра пастаянна выпраменьвае захапленне і асалоду ад прыгажосці музыкі, ад чарадзейства яе вялікіх стваральнікаў.

Дыяпазон стаўлення калег да гэтага дырыжора — ад шчырага сапраўднага захаплення (большасці) да тэндэнцыйнага непрыняцця (на шчасце, адзінак), з "прамежкавым звяном" дзелавых прафесійных адносін.

Леў Палікарпавіч, несумненна, прыроджаны псіхолаг, у стасунках з калегамі вельмі карэктны, добразычлівы, уважлівы і чулы. Але калі справа тычыцца прафесійных пытанняў, праблем высокага мастацтва, а дырыжору даводзіцца вырашаць менавіта такія задачы, — тут Леў Палікарпавіч заўсёды прынцыповы і патрабавальны. Больш за ўсё ён патрабавальны да сябе, а таму мае права патрабаваць і ад іншых. Высокія патрабаванні не ўсім даспадобы, бо не ўсе разумеюць, што дырыжор нясе вялікую адказнасць не толькі за сябе, а за ўсіх, за ўвесь складаны арганізм сінтэтычнага мастацтва, якім з'яўляецца оперны спектакль. Таму ўзнікаюць часам канфліктныя сітуацыі. Праўда, канфліктнасць у мастацтве — гэта абавязковая ўмова ўсялякай творчасці, яна забяспечвае несупынны рух наперад. Але ў тым толькі выпадку, калі не робіцца хранічнай і не стварае "перпетуум мобіле" экстрэмальных сітуацый.

Маэстра Лях пры інтэрпрэтацыі музыкі розных эпох, напрамкаў, стыляў кіруецца не спантаннымі меркаваннямі, а глыбока прадуманай, узважанай творчай стратэгіяй развіцця музычнай драматургіі, у гэтым вытокі яго ўпэўненасці і перакананасці. Гэта зусім не азначае, што ён не ведае сумненняў і незадаволенасці сваім мастацтвам. Хутчэй наадварот. Яны пастаянна яго атакуюць, але толькі ў працэсе працы над творам. Калі ж вердыкт вынесены, вызначаны, тады... "Самае вялікае шчасце адчуваеш, — прызнаецца Л. Лях, — калі ўдаецца значна наблізіцца і парадніцца з аўтарам твора. Невычэрпнай крыніцай выразнасці інтэрпрэтацыі з'яўляецца пастаянная змена жывых адчуванняў, якія інспіруюцца музычным або драматургічным развіццём, што нараджае адухоўленасць. Логіка гэтага развіцця, глыбокае пранікненне ў вобразна-эмацыянальны змест твора, спасціжэнне структуры ў цэлым і ў дэталях надаюць упэўненасці і перакананасці ў працэсе ўвасаблення сваіх мастацкіх уяўленняў і задум".

Дакладнасць у працы і высокі прафесіяналізм Л. Ляха адзначае выдатны беларускі кампазітар Яўген Глебаў: "З дырыжорам нашага опернага тэатра Львом Палікарпавічам Ляхам я пазнаёміўся блізка досыць нядаўна, у сувязі з пастаноўкай маёй оперы "Майстар і Маргарыта" паводле Булгакава. Прысутнічаючы на рэпетыцыі і на спектаклях, я пераканаўся, што гэта дырыжор — майстар сваёй справы. Ён зрабіў вельмі добрае ўражанне, асабліва ў працы з вакалам. У оперным мастацтве адчуваць музыку, разумець задуму кампазітара і ўнутраную сутнасць твора для яго глыбокага ўвасаблення яшчэ недастаткова, трэба валодаць майстэрствам перадаць сваё адчуванне і разуменне спевакам, аркестру, хору, а праз іх — слухачам".

Вядучы саліст ДАВТа, выдатны спявак Аркадзь Саўчанка дадае: "Глыбокае разуменне дырыжорам вакалу, уменне працаваць са спевакамі, эрудыцыя, інтэлект, педагагічныя здольнасці, высокая прынцыповасць і патрабавальнасць выклікаюць прафесійную павагу. Спевакі-акцёры заўсёды атрымліваюць творчае задавальненне ад стасункаў з дырыжорам Ляхам у спектаклях опернага рэпертуару тэатра, што ідуць пад яго кіраўніцтвам".

Выключная захопленасць сваёй прафесіяй, добра арганізаваная і натрэніраваная дырыжорская воля, адзінства пачуцця і думкі, і, нарэшце, самае галоўнае — **любоў** да музычнага мастацтва, да творчай дзейнасці, да людзей, да сваіх калег, пастаяннае духоўнае і прафесійнае ўдасканаленне, здольнасць зараджаць і напаўняць сваіх партнёраў энергіяй, — вось тыя вартасці, паводле якіх вызначаецца сапраўды творчая асоба.

Льву Палікарпавічу Ляху споўнілася пяцьдзесят пяць гадоў. Сам Час выставіў яму дзве пяцёркі за жыццё і творчасць...

Міхась СОЛАПАЎ,
прафесар Акадэміі музыкі, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі

НАСТАЎНІК І ВУЧНІ

Чалавек, які здольны ўспрымаць прыгожае, — ніколі не старэе. Гэтыя словы гучалі лейтматывам на вечары памяці дырыжора Іосіфа Абраміса. Вечар быў арганізаваны Дзяржаўным тэатрам музычнай камедыі. Ужо дзесяць гадоў, як І. Абраміса з намі няма, але памяць пра яго жыве ў сэрцах тых, хто працаваў разам з ім, хто вучыўся ў яго, хто памятае яго за дырыжорскім пультам. Ён амаль 30 гадоў быў дырыжорам у ДАВТе Беларусі, а апошнія тры гады свайго творчага жыцця (1979—82) узначальваў аркестр тэатра музычнай камедыі.

Цяпер справу вядомага музыканта працягваюць ягоныя вучні. За час педагагічнай дзейнасці ў Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі І. Абраміс падрыхтаваў 20 дырыжораў, якія працуюць сёння ў музычных калектывах рэспублікі і за яе межамі. У правядзенні вечара памяці прынялі ўдзел яго выпускнікі: Міхаіл Казінец — галоўны дырыжор аркестра імя І. Жыновіча; Уладзімір Рыжкоў — галоўны дырыжор Брэсцкага сімфанічнага гарадскога аркестра; Леанід Іваноў — галоўны дырыжор аркестра народных інструментаў Магілёўскага педагагічнага факультэта Беларускай акадэміі музыкі; Галіна і Віктар Малых — дырыжоры з Наваполацка, Віктар Валатковіч — дацэнт універсітэта культуры.

Асноўную частку праграмы падрыхтаваў галоўны дырыжор тэатра музычнай камедыі Аляксандр Сасноўскі — любімы вучань І. Абраміса. У канцэрце ўдзельнічаў нядаўні выпускнік Акадэміі музыкі Вячаслаў Чарнуха, які цяпер таксама працуе ў тэатры музычнай камедыі.

Як і звычайна ў вялікія святы, сімфанічны аркестр тэатра размясціўся на сцэне, потым яго змяніў аркестр народных інструментаў з Магілёва. Мяняліся за пультам дырыжоры, чаргаваліся разнастайныя нумары. Выконваліся творы Свірыдава, Хачатурана, Бабаджаняна, дуэты і арыі з аперэт Кальмана, Легара, Штрауса, гучала народная музыка. Цікавым было выступленне хору а капэла пад кіраўніцтвам Тамары Гулінай. Жвавай і вясёлай атрымалася сцэна з народнай камедыі Р. Суруса "Несцерка", дырыжорам-пастаноўшчыкам якой быў І. Абраміс. На гэты раз за пультам стаяў ягоны вучань — В. Валатковіч.

Аднак — дырыжоры-вучні І. Абраміса не толькі станавіліся за пульт, многія з іх цёпла расказвалі пра свайго настаўніка. Цікавым і хвалюючым было выступленне М. Казінца, а У. Рыжкоў нават прачытаў вершы, прысвечаныя І. Абрамісу. З успамінамі выступалі таксама іншыя вядомыя музыканты, са словамі ўдзячнасці да арганізатараў вечара звярнулася дачка І. Абраміса, таксама музыкант. Нават тыя, каму не давялося ведаць І. Абраміса, з цікавасцю слухалі ўспаміны пра яго. Бо гэта — жывая гісторыя беларускага музычнага мастацтва. Пасля заканчэння Мінскага музычнага тэхнікума ў 1933 г. І. Абраміс спачатку працаваў аркестрантам у вандроўнай трупе Уладзіміра Галубка, потым — у аркестры Першага БДТ. Пазней — гады вучобы ў кансерваторыі і насычанае падзеямі культурнае жыццё, паралельна з вучобай праца ў оперным тэатры... У цікавых дэталях аповядаў-успамінаў паўставала перадваеннае культурнае жыццё сталіцы.

Шчырая атмасфера вечара была пазначана высокай музычнай культурай. І ў гэтым вялікая заслуга вядучай — музыказнаўцы Іны Зубрыч. Дзякуючы яе адточанаму прафесіяналізму мерапрыемства набыло значэнне творчай акцыі, а не прайшло як звычайны юбілейны канцэрт. А ініцыятыва ў правядзенні вечарыны належыць дырэкцыі тэатра музычнай камедыі, дзе вельмі шануюць памяць І. Абраміса.

Зоя ЛЫСЕНКА

А КАРАБЕЛЬ ПЛЫВЕ...

Будынак былога мужчынскага духоўнага вучылішча, што на рагу вуліц Чэхава і Суворава ў Віцебску, на працягу амаль стогадовай гісторыі цесна звязаны з развіццём адукацыі і мастацтва на Беларусі. Пэўны час у ім месціліся навучальныя ўстановы, што ўнеслі важкі ўклад у развіццё Віцебскай мастацкай школы — мастацкае вучылішча і мастацка-графічны факультэт педінстытута. Вось ужо больш пяці год прасторныя памяшканні аддадзены пад вучэбныя аўдыторыі і мастацкія майстэрні факультэта пачатковых класаў музыкі і выяўленчага мастацтва. Новыя гаспадары пры ўсёй сціпласці і абмежаванасці сродкаў і ўласных магчымасцей упрыгожылі яго інтэр'еры вітражамі, расфарбоўкамі і дэкаратыўнымі пано.

Для факультэта стала добрай традыцыяй праводзіць выставы дыпломных і творчых работ студэнтаў. Сёння тут прадстаўлены творы выкладчыкаў педінстытута. Высокі мастацкі густ і прафесіяналізм вылучаюць акварэлі Анатоля Карпана. Алейныя творы Анатоля Чміля адметныя дакладнай распрацаванасцю кампазіцыі і колеру, шматпланавасцю і глыбінёй прасторы, асаблівай увагай да дэталей. Уражваюць пастэльныя пейзажы Вячаслава Шамшура, у якіх мігценне сакавітага колеру стварае адмысловыя ілюзорныя вобразы. А на чарзе — новая экспазіцыя, якая прадставіць гледачам творы студэнтаў Акадэміі мастацтваў Беларусі і вучняў мастацкай вучэльні г. Мінска.

Міхась ЦЫБУЛЬСКІ

А. Чміль. З трыпціха "Славуты старажытны горад Віцебск". Палатно, алей. 1990.

А. Карпан. Вэнджаная стаўрыда. Папера, акварэль. 1993.

В. Шамшур. У блакіце азёр. Лінарыт. 1990.

У АДЗІНСТВЕ З ПРЫРОДАЙ

можна пабыць сам-насам, наведаўшы... Нацыянальную бібліятэку Беларусі. Тут наладжана выстаўка твораў самадзейнай мастачкі Галіны Здановіч, што так і называецца — "У адзінстве з прыродай". Экспазіцыя арганізавана цэнтрам "На ростанях". Г. Здановіч жывапісам захапляецца ўжо больш чым дваццаць гадоў. І не без поспеху. Асобныя яе творы можна ўбачыць у прыватных калекцыях у розных краінах Амерыкі і Еўропы, не кажучы пра нацыянальных калекцыянераў.

Тэатр

ЗАГАДКА ВЯЛІКАГА МІСТЫФІКАТАРА, або ШТО НАМ ДАЛІ?

Напярэддадні спектакля "Ягоныя сны", якім адкрываў свой новы тэатральны сезон Маладзёжны тэатр Беларусі, на тэлебачанні ў рубрыцы "Хто ёсць хто. XX стагоддзе" быў паказаны невялічкі сюжэт пра Сальватора Далі. У традыцыі, блізкай да рэкламы, аўтары расказалі кранальную гісторыю кахання іспанскага мастака і былой жонкі Поля Элюара Галы (народжанай Дзяканавай). У прыватнасці, мы даведаліся, што іх каханне доўжылася паўстагоддзя, і пасля смерці жонкі Далі дзевяць год пражыў пустэльнікам у старажытным замку, дзе знайшоў апошні прытулак прах яго адзінай, непаўторнай Галы. Сюжэт быў паказаны 4 кастрычніка, а літаральна на наступны дзень газета "Известия" надрукавала паведамленне аб новай кнізе даследчыка іспанскай гісторыі Яна Гібсана, таксама прысвечанай Сальвадору Далі. Мяркуючы па прыведзеных звестках, кніга, нарэшце, пральле святло на не менш рамантычную гісторыю "духоўнай і фізічнай блізкасці" Гарсія Лоркі, Сальвадора Далі і Луіса Бунюэля, чый мастацкі трыумвірат з'яўляецца найвялікшым гонарам іспанскай культуры. Такім чынам, Далі і пасля сваёй смерці працягвае эпатаваць шаноўную публіку.

Творчая спадчына мастака-сюррэаліста доўгі час была закрыта для нас — як і ўсе формы "буржуазнага мадэрнізму" ў выяўленчым мастацтве, архітэктуры, тэатры і кінематографе. Тым не менш, рэдкія (і, часцей за ўсё, адмоўна-крытычныя) звесткі аб яго жыцці, альбомы з ілюстрацыямі заўсёды прыцягвалі ўвагу прыхільнікаў мастацтва. Відаць, таму, што, паглыбляючыся ў вар'яцкія і адначасова прарочыя сны Сальвадора Далі, мы "скрыўлялі" навязаны нам просталінейны погляд на чалавека і яго існаванне ў сусвеце. Апошнімі гадамі шмат што змянілася. Шырока выдаюцца яго альбомы, зняты таямнічы покрыў з біяграфіі і нават перакладзены на рускую мову асабістыя дзённікі. Але, дзіўная рэч, Сальвадор Далі па-ранейшаму застаецца адной з самых загадкавых і непрадказальных асоб XX стагоддзя.

Маладзёжны тэатр Беларусі прапануе свой погляд на жыццё і творчасць Далі. Пастаноўка і сцэнічная кампазіцыя спектакля "Ягоныя сны" зроблена рэжысёрам Віталем Катавіцкім паводле кнігі "Тайнае жыццё Сальвадора Далі, напісанае ім самім". Сыграны гэты монаспектакль акцёрам Сяргеем Жураўлём з дапамогай Алены Унукавай і Ігара Фільчанкова. Адчуць прыцягальную сілу карцін мастака немагчыма без разумення яго пакутлівых блуканняў у пошуках сваёй адметнасці, якая фарміравалася пад уздзеяннем Фрыдрыха Ніцшэ, Зігмунда Фрэйда, а таксама парыжскай групы сюррэалістаў на чале з Андрэ Брэтонам. Аўтары спектакля ўводзяць гледача ў незвычайны, шмат у чым дзіўны свет, каб найбольш поўна і аб'ёмна высветліць постаць Сальвадора Далі, выявіць карані і вытокі яго індывідуальнасці, давесці, што сюррэалізм быў для мастака толькі так званым творчым метадам. Ён, сюррэалізм, абумовіў спосаб яго мыслення і нават стыль жыцця. А гэта перадусім абумоўлівае афармленне спектакля і яго выяўленчую стылістыку.

Мастак Зіновій Марголін стварае сцэнаграфію, у аснове якой — прынцып сюррэалістычнага калажу. У глыбіні сцэнічнай прасторы стаіць натуральны чорны раяль, на ім — фотаздымак маленькага Далі. З правага ж боку, бліжэй да гледача, размясціўся бутафорскі, з вялізнай клавіятурай белы раяль, адмыслова выцягнуты да каласнікоў. Века раяля, складзенае з шырокіх зрэбных стужак, утварае своеасаблівы экран, на якім разыгрываецца відэашэраг монаспектакля. Наогул, гэты бутафорскі раяль "жыве" ў спектаклі сваім самастойным жыццём. Ён то сімвалізуе побытавыя адзнакі інтэр'еру (бібліятэку бацькі, агромністую печ, у паддувала якой ляцяць кнігі Ніцшэ, Вальтэра і абрыдлы арыстакратычны фрак), то ператвараецца ў тэатральную шырму з атрыбутамі лялечных дэкарацый — Эйфелевай вежай, Трыумфальнай аркай, парыжскім кафэшантанам, то нагадвае фрагменты карцін мастака з аголенымі торсамі, сюррэалістычна выцягнутымі рукамі і ўсялякім іншым містычным вар'яцтвам. Музычны інструмент (рэальны і бутафорскі) як галоўная выяўленчая дэталь сцэнаграфіі падаецца невыпадковай, і, відаць, падказана З. Марголіну карцінамі Далі, — "Дзённай ілюзіяй...", і, асабліва, "Атмасферным чэрапам з адзнакамі садаміі і шлейфам піяніна", дзе раяль уяўляе сабой эратычна-пачварную жывую істоту.

Рэчавы свет спектакля, вынаходліва ўжыты В. Катавіцкім, адкрыта запазычаны з палотнаў мастака і хавае ў сабе глыбінны сэнс. Так, чорная тэлефонная трубка, якая раптоўна ператвараецца ў чырвоную кляшню краба, адразу ж выклікае асацыяцыі з карцінамі "Пляж з тэлефонам", "Імператарскія фіялкі" або "Узвышаны момант". Тэлефонная трубка як сімвал кантакту і чалавечых зносін набывае ў Далі супрацьлеглы сэнс. Пакарабачаная, з адарваным провадам, яна пагрозліва, нібы драпежная птушка, павісае ў паветры, сімвалізуючы адасобленасць і адзіноту. Толькі ў адным эпізодзе спектакля Далі размаўляе з бацькам па такім бяспровадным тэлефоне. Але гэты эпізод шмат гаворыць пра канчатковы разрыў паміж блізкімі людзьмі, пра іх непераадольнае адчужэнне.

Уплыў эстэтыкі палотнаў Далі заўважаецца ў многіх эпізодах спектакля. Вось Гала іграе на раялі і па яе спіне як па маленькім экране плыве праекцыя рафаэлеўскай Мадонны з дзіцем. У памяці адразу ж узнікае мастакова "Лоўля тунца", дзе аголеныя мужчынскія і жаночыя постаці ўпрыгожаны шматкаляровай адмысловай татуіроўкай, або малады бычок, на чыёй скуры раптам заўважаецца фрагмент каталонскага краявіду.

З карцін Далі ўзяты шматлікія вялікія і маленькія мыліцы, якія вынаходліва абыгрываюцца ў спектаклі. Дастаткова прыгадаць "Адраджэнне плоці", "Прывід сексуальнага поклічу", "Мяккі аўтапартрэт са смажаным беконам" і асабліва "Сон", дзе мыліцы падтрымліваюць лоб, губы, нос, падбароддзе безжыццёва абвіслага гумавага тулава. Наогул, шэкспіраўскае "ўвесь свет — тэатр" надзіва стасуецца з творчасцю і з асобаю Далі, які не толькі бачыў тэатралізаваныя сны, але і пастаянна жыў у выдуманым свеце, дзе ён быў адзіным геніем і галоўным відачынцам. С. Журавель дакладна адчувае ўнутранае "акцёрства" свайго героя, яго сапраўдную і ўяўную выключнасць. Яго Далі з'яўляецца на сцэне ў доўгім чырвоным халаце накшталт царскай мантыі. На галаве — манаршая шапка, у руцэ — металічны контур скіпетра. Вопытны майстар імправізацыі, ён тупае нагой і адбываецца цуд — запальваюцца пражэктары, ільецца чароўная музыка, а на экране ажывае карціна "Далі! Далі!", дзе перад мастаком зіхацяць у нябеснай прасторы пярэстыя, рознакаляровыя сферы — малекулы атама.

Далі-Журавель з першай сцэны абрушвае на гледача правакацыйную неадпаведнасць высокіх праклёнаў і прычыны, што іх выклікала. Аказваецца, прычына ў... нязручных чаравіках, якія так ціснуць, што абуджаюць у Далі аратарскі талент накшталт салаўіных спеваў або неапалітанскага бельканта. У пацвярджэнне ён нават выводзіць некалькі музычных рулад, каб, рэзка абарваўшы арыю, "па-мазахісцку" расказаць праўду аб сваім жыцці. Неадпаведнасць падзей і эмацыйнай рэакцыі на іх, рэзкая змена ўнутранага рытму, моўныя перапады ад звычайнай будзённай танальнасці да ўзвышанай патэтыкі вызначаюць спосаб акцёрскага існавання, які сам па сабе палемізуе з прынцыпам псіхалагічнага ўваходжання ў сцэнічны вобраз.

С. Жураўлю даводзіцца быць і самім героем, і каментатарам падзей і выступаць у абліччы іншых персанажаў, і, нарэшце, наогул абстрагавацца ад сцэнічных асоб, каб ад уласнага імя імправізацыйна перамовіцца з гледачом. Трэба адзначыць, што ўсе гэтыя змены ўнутранага стану акцёр перадае дыхтоўна, вытанчана і паступова ўцягвае ў гэту гульню гледачоў, робячы іх сваімі зацікаўленымі саўдзельнікамі.

Далі запрашае зазірнуць у сваё дзяцінства. Пад меладычныя гукі званочка і тужлівай народнай песні з'яўляецца лялька хлопчыка, які ў сямейнай бібліятэцы сярод маленькіх кніжачак упершыню сутыкаецца з супярэчнасцю свету ад "Бога — няма" Вальтэра да "Бог памёр" Ніцшэ. Гэта — бязглуздзіца? Як можа памерці той, каго няма?! Падлетак заходзіцца немым роспачным крыкам, аж пакуль не зваліцца без прытомнасці на падлогу. Так пачнецца для мастака пакутлівы шлях спасціжэння ісціны, доўгі шлях самапазнання.

Калажны прынцып суіснавання жывога акцёра і лялькі, другога "Я" героя, узяты таксама з палотнаў мастака, неаднаразова выкарыстоўваецца ў спектаклі. Вось з'яўляецца лялька ў чорным фраку. Спраўджваецца даўняя мара Далі: апынуцца ў заманлівым, закрытым для багемных сяброў свеце вышэйшай арыстакратыі. Паміж мастаком і яго другім "Я" ідзе рэзкая спрэчка: раз'юшаная лялька плюе ў твар свайму чалавечаму ўвасабленню! Далі — Журавель спрабуе давесці, што ён імкнецца быць і мастаком і арыстакратам. Але гучыць вырак-запавет Галы: "Не шкадавання трэба вымагаць, неабходна кідаць у сорам". І Далі надзявае абаронную маску самаіроніі, якая назаўжды зрасцецца з тварам і абумовіць скандальную эпатажнасць яго паводзін.

Па асабістым прызнанні мастака, "вельмі карысна яшчэ ў раннім юнацтве даць грамадству, да якога вы ставіцеся з глыбокай пашанай, моцнага выспятку...". Увасобіць гэты тэзіс у жыццё яму дапамагаюць настаўнікі — Ніцшэ і Фрэйд. Імправізаваны экран высвятляе партрэт Фрыдрыха Ніцшэ, чые пастулаты "ірацыянальнага" і "звышчалавека" матэрыялізаваліся ў творчасці Далі і ягонай адкрыта дакляраванай "маніі вялікасці". Другі "духоўны" бацька, Фрэйд, не набывае ў спектаклі візуальнага аблічча, але пастаянна праяўляецца — у падрабязнасцях, з якімі Далі-Журавель распавядае аб фізіялагічных функцыях свайго арганізма, у двухсэнсоўнай трансфармацыі гутаперчавага чалавека-бервяна ў вялікі фалас, у блюзнерскай заяве "Да д'ябла бацьку!", "Я плюю на сваю маці!", дзе мастак прысягае на вернасць Фрэйду, адпаведна якому "герой той, хто паўстае супраць бацькоўскай улады і выходзіць пераможцам".

Разам з тым Далі знаходзіцца ў стане пастаяннай унутранай палемікі з прызнанымі аўтарытэтамі. Аднак палеміка гэтая вядзецца не ў плане філасофскай спрэчкі, а набывае ў спектаклі прыкметы тэатральнага фарсу. У пантамімічнай сцэне мастак выцягвае ўгору свае знакамітыя вусы, каб яны былі падобны да вусаў Веласкеса і ні ў якім разе не нагадвалі абвіслыя вусы Ніцшэ. Твар Фрэйда адзін раз мільгане выявай на пальчатцы, якой Далі быццам кувалдай выпроставае гутаперчавае бервяно-чалавека. Іншая справа — Пікаса. Тут ужо не да філасофскіх абстракцый! Спрэчка ідзе пра творчасць! Паміж тарэадорам Далі і вядомым пікасаўскім быком адбываецца пантаміма-бойка, танец-супрацьстаянне. Карыда завяршаецца перамогай быка і сімвалізуе творчы пералом у мастацтве Далі пад уздзеяннем ідэй Пікаса.

Вынаходца "параноідна-крытычнага метаду", Далі свядома парушаў мяжу паміж жыццём і творчасцю, рэальным існаваннем і вымыслам. У сваім дзённіку мастак са шчырай непасрэднасцю прызнаецца: "Цяжка ўтрымліваць на сабе пільную ўвагу свету больш, чым паўгадзіны. Мне ж удавалася рабіць гэта цэлых дваццаць год, і прытым штодзённа". Біяграфія Далі — гэта бесперапынны ланцуг маскарадных скандальных шоу, розыгрышаў, містыфікацый, накшталт тайнага літургічнага шлюбу з Галой. Відаць, для тэатра вельмі заманліва было б стварыць адпаведнае эпатажнае відовішча, прасякнутае "даліянскай містыкай". Аднак аўтары спектакля "Ягоныя сны" выбіраюць іншы шлях. Яны не давяраюць словам Далі, да якіх нават біёграфы ставіліся не вельмі сур'ёзна, а, хутчэй, зыходзяць з творчасці мастака, з асацыятыўнай сімволікі яго карцін.

Шматпланава, сцэнічна-вобразна вырашаецца эпізод, дзе Далі-Журавель малюе на дошцы вока труса, якое па прыхамаці творцы ператвараецца ў вока папугая, а потым і рыбы. І вось ужо сам мастак пластычна пераўвасабляецца ў рыбу, якая выгінаецца, трапеча, задыхаецца на беразе, пакуль не кідаецца ў хвалі акіяна. Сцэна набывае сімвалічны сэнс. Як ні імкнуўся Далі вырвацца з сістэмы забаронаў (і сюррэалістаў, і арыстакратыі), гэта было немагчыма. Ісцінную свабоду дараваў яму толькі працэс творчасці, працэс самапазнання з пакутлівым і адвечным для мастака пытаннем: "Ці спасціг (улавіў) я сутнасць?" Здаецца, Далі-Журавель сапраўды дакранаецца да сутнасці творчасці. "Трэба працаваць па натхненні. Толькі інстынкт, прыродны парыў, асалода. Хай руку вядзе пачуццё". І Далі стварае ў карцінах адбітак свайго пачуццёвага свету, дзе на фоне сюррэалістычнага краявіду і нацюрморта, у атмасферы містыкі і эратызму пануе адзіны рэалістычны вобраз — вобраз па-каралеўску велічнай, прыгожай Галы.

Дзённікі Далі літаральна прасякнуты гучнымі прызнаннямі кахання да жонкі, аднак аўтары спектакля не вельмі даюць ім веры. Таму замест рэальнай Галы на сцэне з'яўляецца падкрэслена ўмоўны вобраз жанчыны (А. Унукава) у празрыста-белым трыко... без твару. Яе галава з усіх бакоў пакрыта пенай шлюбнага вэлюму. Такое вырашэнне ізноў жа падказана карцінамі Далі, дзе жаночую постаць часам вянчае галава, упрыгожаная ружамі або галінкамі дрэў. Дык, можа, і Гала — гэта толькі міф, трызненне, галюцынацыя? У фінале, калі Далі сцягвае з яе галавы вэлюм, мы бачым замест твару нерухома застылую маску. Жанчына спружыніста абапіраецца на мыліцу — нібы гумавая лялька, пазбаўленая паветра.

С. Журавель тонка, ненавязліва, з нейкай шчымлівай ноткай спачування і адчаю раскрывае таямніцу Далі, які дасягнуў сусветнай славы і вялікага багацця: таямніцу мастака і чалавека, які за міфатворчасцю і вонкавым эпатажам заўсёды хаваў пачуццё непераадольнай, глыбокай адзіноты. Відаць, менавіта гэты стан душы і сублімаваў дзіўную мару Далі стварыць фільм аб жанчыне, што пакутуе на параною: яна закахалася ў тачку, і тачка паступова набывала рысы некалі блізкага чалавека, чый труп везлі на ёй. Далі-Журавель увасабляецца ў вобраз жанчыны і падрабязна разыгрывае эпізод. Жаночая постаць у нязручнай зрэбнай сукенцы з белай маскай замест твару набывае адзнакі замкнёнасці і адасобленасці ад навакольнага свету, адзнакі трагічнага неразумення, непаразумення і адзіноты самога Далі.

Магчыма, прапанаванае тэатрам — гэта некалькі славянскі погляд на экзатычную асобу мастака-сюррэаліста. Аднак ён пераконвае. Таму што вынікае не з абстрактна-індывідуалістычнага падыходу да творчасці Далі, а з падсвядома шматмернага канглямерату ўздыбленасці і несуадноснасці раз'яднаных часцінак сусвету на яго палотнах. І як пацвярджэнне гэтага, гучыць апошні акорд спектакля. У поўнай цішыні на экране ўзнікаюць слайды сусветна вядомых карцін Далі — "Прадчуванне грамадзянскай вайны", "Спакушэнне св. Антонія", "Галарына", "Атамная Леда", "Хрыстос Хуана дэ ла Крус", "Атамны крыж", "Гіперкубічны корпус" і іншыя. Напэўна, можна было б папікнуць аўтараў спектакля за тое, што яны пераважна засяродзіліся на мастакоўскіх прыхільнасцях Далі і свядома адмежаваліся ад яго грамадскіх і палітычных поглядаў. Мастак часта падкрэсліваў сваю апалітычнасць, тым не менш ён заўсёды цікавіўся Гітлерам і Франка, лідэрамі Савецкай дзяржавы і класікамі марксізму-ленінізму, аб чым сведчаць яго карціны "Загадка Гітлера", "Частковая галюцынацыя: шэсць прывідаў Леніна на раялі" і інш. Тут, відаць, сказалася наша агульная алергія на палітыку.

Дык хто ж такі Далі — геній або вар'ят? І наогул — што нам Далі? Спектакль Маладзёжнага тэатра не дае просталінейнага адказу на гэтыя пытанні. Пасля яго прагляду кожны застаецца пры сваёй думцы. Аднак само далучэнне да жыцця і творчасці Сальвадора Далі дапамагае не толькі зразумець адметнасць нязвыклага для нас мастакоўскага мыслення, але і ўражвае прарочым прадбачаннем катаклізмаў сучаснай эпохі, і, урэшце, спрыяе спасціжэнню саміх сябе.

Тамара ГАРОБЧАНКА

АДЗІН З САРАКА ТЫСЯЧ

У Брэсцкай абласной бібліятэцы імя Горкага адбылася сустрэча з пісьменнікам з Харкава Раманам Левіным. Калі грымнула Вялікая Айчынная вайна, яму было нейкіх дзесяць год. Жыў у Брэсце, дзе бацька служыў афіцэрам. За пяць дзён да пачатку вайны сюды прыехалі яго бабуля і дзед. У першы дзень вайны проста на вуліцы немцы застрэлілі дзеда, а сям'я трапіла ў гета. Пазней яўрэйскае гета было знішчана фашыстамі, сярод сарака тысяч загінуўшых былі родныя Р. Левіна. З дапамогай добрых людзей хлопчыку ўдалося ўратавацца. Пра цяжкі лёс Р. Левіна ёсць нарыс "Хлопчык з Брэста" ў знакамітай кнізе С. Смірнова "Брэсцкая крэпасць".

Пасля перамогі Раман Аляксандравіч застаўся жыць у Харкаве, дзе нарадзіўся. Працаваў, пісаў вершы, закончыў Літаратурны інстытут, быў прыняты ў Саюз пісьменнікаў, стаў вядомым рускамоўным паэтам, празаікам, драматургам. Амаль штогод ён прыязджае ў Брэст наведаць магілы родных, а цяпер завітаў з нагоды здымак дакументальнага фільма, прысвечанага 50-годдзю Перамогі.

У. СУХАПАР

У ПАМЯЦЬ АБ КАСЦЮШКАЎЦАХ

У памяшканні Слонімскага беларускага драматычнага тэатра адбылася гісторыка-літаратурная вечарына, прысвечаная 200-годдзю паўстання пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі, якую арганізавала мясцовая суполка БНФ.

Адкрыў і вёў вечарыну кіраўнік суполкі М. Ракевіч. На вечарыне выступілі гісторыкі П. Лойка і У. Емяльянчык, паэт і краязнаўца В. Супрун, празаік і драматург А. Якімовіч.

Хораша і весела спяваў беларускія песні і прыпеўкі слонімскі ансамбль "Грымата", якім кіруе М. Адамчык.

На вечарыне быў прыняты зварот да мясцовых улад аб наданні вуліцам Слоніма імён Т. Касцюшкі і К. Серакоўскага, а на будынку касцёла Святога Андрэя адкрыць мемарыяльную дошку, прысвечаную памяці ўдзельнікаў паўстання.

Сяргей ЧЫГРЫН

КАСТРЫЧНІЦКІ НУМАР "БД"

Пісьменнік і час — гэтая праблема асабліва надзённа гучыць сёння, калі ад актыўнасці жыццёвай і грамадзянскай пазіцыі літаратара залежыць вельмі шмат. А што канкрэтна? — на гэтае пытанне і спрабавалі даць адказ удзельнікі "круглага стала", праведзенага рэдакцыяй часопіса "Беларуская думка". Справаздача з яго змешчана ў дзесятым нумары "БД". Сваімі меркаваннямі дзеляцца В. Казько, Г. Марчук, В. Акудовіч і іншыя. Сярод іншых матэрыялаў — споведзь М. Яроменкі "Кругі пекла" (запіс Л. Екеля), роздум Р. Тарашкевіча і М. Панасюка "Ці заспявае ўнучка бабуліны песні?", фрагменты дыялога В. Лягасава і Ю. Шчарбака "Мы ні з чым не саўладаем, калі не адновім маральныя крытэрыі ў дачыненні да работы, якую выконваем", інтэрв'ю першага намесніка старшыні Вярхоўнага суда Рэспублікі Беларусь В. Кандрацьева "У суда няма сакрэтаў"...

АДУКАЦЫЯ. КУЛЬТУРА. АДРАДЖЭННЕ

Падборка матэрыялаў пад такой назвай прапануецца ў дзесятым нумары часопіса "Адукацыя і выхаванне". З артыкулам "Нацыянальная культура і выхаванне асобы" выступае дырэктар Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы Акадэміі навук Беларусі М. Піліпенка. Згаданай праблеме прысвечаны і іншыя матэрыялы. У прыватнасці, І. Граковіч гутарыць з начальнікам упраўлення мастацтваў Міністэрства культуры і друку Рэспублікі Беларусь А. Кірыенка ("Нацыянальна-культурнае адраджэнне — галоўны змест нашай работы"). Тэма выступлення А. Фядосіка "Фальклор у фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці беларусаў". "Творчая інтэлігенцыя і этнаэтыка" — разваагі С. Лапцёнка. Н. Катовіч прапанавала артыкул "Асноўныя напрамкі выхаваўчай работы ва ўмовах адраджэння". Рубрыка "Повязь часоў" прадстаўлена артыкулам У. Конана "Беларуская культура: гістарычны нарыс (X ст. — 1917 г.)".

На атрыманне Дзяржаўнай прэміі Беларусі

СЦІСЛА І ВЫРАЗНА

У Доме літаратара адбылася прэзентацыя мультыплікацыйных стужак вядомага кінарэжысёра Ігара Волчака, створаных у 1985—90 гадах і вылучаных на атрыманне Дзяржаўнай прэміі РБ-94.

Дасціпны, выключна дынамічны, бліскуча выкананы фільм "У двары на досвітку", агучаны лепшымі акцёрамі на чале з А. Джыгарханянам, выклікае захапленне як у дарослых, так і ў дзяцей. Стваральнікам стужкі ўдалося паказаць і мудрасць народа на прыкладзе змены пакаленняў, і жартаўлівасць бытавых момантаў.

Другі фільм — "Капрычыо" — раскрывае багаты ўнутраны свет чалавека, ён надзвычай лірычны, насычаны музыкай (што адлюстравалася і ў назве), незвычайны па задуме. Гэта мастацка-філасофскае асэнсаванне пражытага ва ўсёй складанасці і разнастайнасці. Фільм зроблены з вялікім майстэрствам і выклікае моцнае эмацыянальнае ўражанне. Невыпадкова ён увенчаны ўзнагародамі дзевяці прэстыжных міжнародных кінафестываляў, уключаны ў дзесятку лепшых фільмаў былога Саюза, дэманструецца ў музеі сучаснага мастацтва ў Нью-Йорку ў рэтраспектыве.

Фільм "Праз шэры камень" увогуле дзівосны. У ім няма ні дыктарскага тэксту, ні дыялогаў — толькі малюнкі і музыка. Не гаворыцца, пра каго ён, але глядач адразу ўгадвае, што перад ім разгортваюцца апошнія дні з жыцця рэвалюцыянера, геніяльнага вынаходніка рэактыўнага лятальнага апарата М. Кібальчыча. Аднак сэнс падзей значна глыбей: бессмяротнасць філасофіі пазнання, свабоды творцы, што вышэй за жыццёвыя акалічнасці. І гэта ўсё ўвасоблена ў нямых сцэнах, сцісла па часе, вельмі выразна.

Фільм "Канчэрта гроса", пастаўлены па навеле "Бомба" Д. Буцаці, узнімае выключнай важнасці сацыяльныя і маральныя праблемы сучаснасці: праблему кіравання грамадствам, праблему суіснавання "вярхоў" і "нізоў", што знаходзяцца на палярных узроўнях адукацыі, развіцця, жыццядзейнасці. Фільм алегарычны, насычаны знакавасцю, вобразнасцю. І калі дзеянне адбываецца на лесвіцы вышыннага дома, то гэта яшчэ і сацыяльная лесвіца, дзе ўнізе знаходзяцца "бічы", угары — правіцелі, адарваныя ад жыцця свайго народа. У экстрэмальных умовах агаляецца да канца псіхалогія людзей, адкрываюцца матывы іх паводзінаў. Фільм здабыў прызы на міжнародных кінафестывалях у Гамбургу, Берліне, Кіеве, Мінску.

Фільм аб лісе і ваўку пастаўлены па матывах беларускай народнай казкі ў сучаснай інтэрпрэтацыі: тут прысутнічае танк, паветраны шар, двор вельмі гаспадарлівага мужыка ў выглядзе вайсковай часці і г. д. І аўтару зноў трэба аддаць належнае за мастацкі паказ народнага быту і яскравае ўвасабленне характараў.

Заключны фільм "Муха" — гэта, на маю думку, мініяцюрны шэдэўр, змест яго пераказаць немагчыма, але ўсмешка будзе ўзнікаць міжволі пры кожным аб ім успаміне. Фільм па праву атрымаў "Гран-пры" на Міжнародным кінафестывалі аднамінутных фільмаў у Польшчы.

Рэтраспектыўны паказ фільмаў І. Волчака цікавы не толькі сам па сабе, але і тым, што дэманструе творчы рост мастака, адкрывае поліфанічнасць мыслення, вялізныя патэнцыяльныя магчымасці творцы. Звяртае на сябе ўвагу яшчэ адна асаблівасць таленту І. Волчака — музычнасць, што аказвае і непасрэдны, і ўскосны ўплыў на змест: у фільмах "Капрычыо", "Як ліса воўка судзіла" і шэрагу іншых аўтар выступае і як кампазітар. Гэта тлумачыцца тым, што рэжысёр у свой час скончыў кансерваторыю, ім напісана музыка амаль да 40 дакументальных, анімацыйных і мастацкіх стужак.

Не выклікае сумнення, што вылучаныя на конкурс фільмы здзейснены на самым высокім узроўні, маюць арыгінальны почырк і заслугоўваюць прысуджэння Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь.

Генадзь РЫМСКІ,
прафесар

Госці

ЦЫМБАЛЫ — НА СУСВЕТНЫМ ЎЗРОЎНІ

З трохгадовага ўзросту Вікторыя Херэнчар пачала займацца на цымбалах. Гэты інструмент зрабіўся часткай ейнага жыцця, і невыпадкова менавіта сп. Херэнчар стала прэзідэнтам Сусветнай цымбальнай асацыяцыі (CWA). Выдатная музыкантка й педагог, яна прапагандуе цымбалы як прафесійны інструмент, роўны сярод іншых. На жаль, і ў яе роднай Венгрыі, як і ў нас на Беларусі, цымбалы залічваюць у асаблівую катэгорыю "народных інструментаў", прычым характарыстыка "народны" набывае часам нейкае зніжанае адценне. Вікторыя Херэнчар імкнецца даказаць (і даказвае!), што цымбалы — такі самы паўнавартасны інструмент, як і скрыпка, як і фартэпіяна, што на ім цудоўна гучыць не толькі "этнаграфічная" музыка, але і сучасныя творы, і ўзоры сусветнай класікі. Яны ў прынцыпе не згодная з азначэннем цымбалаў як чыста "народнага інструмента", і сцвярджае, што кожны народ, які мае ў сваёй культуры цымбалы, лічыць іх сваім і толькі сваім нацыянальным музычным сімвалам, бо ведае, што амаль тое ж ёсць і ў яго суседзяў. У сусветным сямействе цымбалаў ёсць прадстаўнікі Англіі ды Славакіі, Францыі ды Кітая, Германіі ды Японіі, Венгрыі ды Беларусі і г. д. Цымбалісты ўсіх краін пачалі яднацца, абменьвацца нотамі, прафесійнымі сакрэтамі, на ўвесь свет сцвярджаць годнасць свайго інструмента... Зрэшты, кожны інструмент быў некалі "народным". Па прыклады далёка хадзіць не трэба: згадайма хоць бы скрыпку!

Невыпадкова сп.Херэнчар наведалася на Беларусь — у краіну, дзе цымбалы лічацца адным з музычных сімвалаў. Да таго ж наш артыст-віртуоз і педагог, прафесар Яўген Гладкоў з нядаўняга часу ўвайшоў у CWA, меў прэстыжныя выступленні падчас кангрэсаў у Еўропе, і пра Беларусь там загаварылі як пра маленькую краіну з вялікімі традыцыямі і моцнай школай у цымбальным выканальніцтве. На так даўно асабіста да прафесара Гладкова прыязджала на стажыроўку цымбалістка з Англіі.

Вікторыю Херэнчар прымаў Саюз музычных дзеячаў Беларусі, але істотную падтрымку

ў арганізацыі гэтага візіту аказалі Міністэрства культуры, Беларуская акадэмія музыкі, Беларускі інстытут праблем культуры, рэктар якога У. Скараходаў зацікавіўся ідэяй правядзення майстар-класаў з удзелам В. Херэнчар. Адбыліся сустрэчы з цымбалістамі сталіцы ды Магілёва, абмеркаванне супольных праектаў, зарыентаваных на сусветны ўзровень. Не маглі не зацікавіць лекцыі сп.Херэнчар — сапраўднае казанне творчага, неардынарнага чалавека, апантанага мастацтвам. А яшчэ дэманстрацыя відэаматэрыялаў (чаго варта было пабачыць-пачуць ансамблевае гранне розных цымбалаў — еўрапейскіх, азіяцкіх!), аповяд пра асаблівасці венгерскіх цымбалаў — інструмента вагою 80 кг, падобнага да мініяцюрнага раяля "без даху" і такога багатага па гучанні!

Унікальнай магчымасцю пачуць венгерскія цымбалы стаўся канцэрт Вікторыі Херэнчар у Вялікай зале філармоніі. Гучала музыка Баха, Тэлемана, Паганіні... Гучалі творы венгерскіх аўтараў, у тым ліку Канцэрт для цымбалаў з электроннай музыкай. А пасля каларытнага "Чардаша" зайграў дуэт: да сп. Вікторыі далучыўся беларускі маэстра Я. Гладкоў!

У голасе венгерскіх цымбалаў чуецца і рамантычны гітарны шолах, і магутнасць раяльных струнаў, і вытанчанасць клавесіннага гучання, і... А мы тым наша госця, уражаная маштабам і якасцю беларускай цымбальнай школы, выказала ўпэўненасць, што беларускія цымбалы маюць нявыкарыстаныя магчымасці, якія дазваляюць ім развівацца не толькі ў рэчышчы народнаінструментальнай музыкі, а і ў самым розным рэпертуары, у тым ліку і ў класічным. Дык ці трэба здзіўляцца, што візіт венгерскай музыканткі завяршыўся амаль што масавым уступленнем нашых педагогаў ды нават навучэнцаў у Сусветную цымбальную асацыяцыю?

С. Б.

Фота У. ВІТЧАНКІ

БАЛІЦЬ МАЁ СЭРЦА ЗА БЕЛАРУСЬ...

(Пачатак на стар. 5)

сю. Але пакуль што ёй да раўнапраўнага суседства з заходнімі суседзямі гэтак жа далёка, як ад Мінска да Пекіна, калі ісці пешкі. Перш, чым стаць раўнапраўным суседам, беларусу трэба вучыцца жыць і працаваць ва ўмовах свабоды. Пакуль жа свабоды няма. Для гэтага трэба прыняць законы; якія б гарантавалі права кожнага чалавека быць багатым. Значыць, так: Закон — Свабода — Багацце. Чым больш будзе багатых людзей у краіне, тым багацейшай будзе сама краіна.

Багацце Беларусі, паўтару яшчэ раз, — у працавітасці яе людзей на зямлі. Трэба, каб ніводны шматок чыстай ад Чарнобыля зямлі — ворыва, лесу, балота — не ляжаў без аддачы. Для гэтага трэба як мага хутчэй рэканструяваць сістэму прымусова-калектыўнай працы на вёсцы ў калектыўна-добраахвотную. А пасля паглыбляць яе, дэталізаваць заахвочваннем індывідуальных здольнасцей.

Жыццё Беларусі — яе эканоміка, палітыка, нацыянальная свабода — усё яшчэ ў абручах таталітарнага камуністычнага рэжыму. Само геаграфічнае становішча Беларусі як калідора з Еўропы ў Расію падказвае магчымасць (неабходнасць) стварэння музея камунізму — як памяці аб жахлівым рэвалюцыйным эксперыменце, што доўжыўся 70 гадоў. Злачынствы камуністычнага рэжыму, заснаваныя на дактрыне аб класавай барацьбе, варты шырокага паказу ў такім музеі.

І калі помнік У. Леніну, што стаіць ля Дома урада, будзе выстаўлены ў тым музеі (іншага месца яму і быць не можа), толькі тады мая родная, змардаваная, прынижаная і зняважаная таталітарным нашэсцем з Усходу і Захаду Беларусь стане суверэннай, незалежнай, вольнай і заможнай. Толькі тады Беларусь будзе дзяржавай звацца!

Рыгор ЛЯВОНЦЬЕЎ,
фермер, былы член Саюза журналістаў СССР
г. Чэлябінск, Расія

Прэм'ера

ДА ПРАСВЯТЛЕННЯ...

На пачатку філарманічнага сезона, як ужо ведаюць нашы чытачы, адбылася прэм'ера новай, Дзевятай сімфоніі Дзмітрыя Смольскага. Пра гэты твор, які стаўся ў сённяшнім музычным жыцці Беларусі сапраўднай падзеяй, абменьваюцца ўражаннямі на старонках "ЛіМа" музыказнаўца Надзея БУНЦЭВІЧ ды кампазітар Аляксандр ЛІТВІНОЎСКІ.

А. ЛІТВІНОЎСКІ. 9-я сімфонія Дзмітрыя Смольскага — яшчэ адна значная падзея ў галіне беларускай музыкі. Мне здаецца, твор надзвычай новы. Бо калі папярэднія сімфоніі гэтага кампазітара былі напісаны для аркестра, а некаторыя з іх — для саліруючага інструмента з аркестрам (у 3-яй саліруе фартэпіяна, у 4-ай — скрыпка), то 9-я — для электрагітары сола з аркестрам. Калі папярэднія сімфоніі былі цалкам натуральна акустычныя, дык тут мы мелі магчымасць слухаць музыку, дзе спалучаецца электроннае гучанне з акустычным. Мне здаецца, для беларускай музыкі гэта ў навіну. Тым больш, што электрагітара — такі інструмент, за якім цягнецца зусім пэўны "шлейф" асацыяцый з маладзёжнай рок-культурай, што мае ўласцівыя толькі ёй мову, вобразную сістэму, комплекс інтанацый ды іншыя спецыфічныя сродкі выразнасці.

Н. БУНЦЭВІЧ. Так. Я б яшчэ дадала, што ў гэтай сімфоніі Дзмітрый Смольскі працягвае нейкую пэўную лінію сваёй творчасці, бо ўспомні: рок-кампазіцыі ён ужо калісьці пісаў. Яны нават выконваліся на Х з'ездзе кампазітараў. Сімфаніст жа прызнаны, і мне здаецца, што ў новым творы ён вырашыў неяк спалучыць і тое, і другое.

— Але ж сімфоній у яго больш, чым рок-кампазіцый...

— Зразумела! Не ведаю, як лічыць сам кампазітар, але, на маю думку, ідэя 9-й сімфоніі была менавіта ў спалучэнні дзвюх культур, якія ў нашым асэнсаванні раней не звязваліся. Нездарма ж такі падзел існуе: музыка сур'ёзная ды музыка нейкая "лёгкая". І вось такое нечаканае спалучэнне выклікала цікавасць да прэм'еры як у прадстаўнікоў "сур'ёзнай" музыкі, музыказнаўцаў, так і ў прыхільнікаў, ну, скажам, так, поп-культуры.

— Так. Я бачыў, што публіка ў зале была досыць стракатая. Вялікая колькасць рокераў, напрыклад, якіх цікавіла выкананне рок-гітарыста Віктара Смольскага, сына кампазітара. А між тым на Захадзе, наогул, у сусветнай культуры ўжо існуюць стандарты такіх стылёва-жанравых спалучэнняў. Напрыклад, амерыканская мюзіклавая культура базуецца акурат на вось такіх спалучэннях "лёгкага" і "сур'ёзнага", акустычнага і электроннага. Дарэчы, другая частка сімфоніі Смольскага мне нагадвала асобныя моманты з партытур Леанарда Бернстайна.

— Ну, калі працягваць гістарычныя паралелі, дык можна згадаць так званы трэці напрамак у мастацтве, які займаецца менавіта гэтым. Але вось такое спалучэнне, якім уразіла прэм'ера, ды яшчэ ў беларускай музыцы, зразумела, упершыню.

— Мо пагаворым пра твор больш канкрэтна? Згадзіся, што сімфонія — гэта, безумоўна, канцэпцыя. А ў Дзмітрыя Смольскага — гэта заўсёды канцэпцыя трагедыйнага плана, дзе сутыкаюцца чалавек і навакольнае асяроддзе, суб'ектыўнае і аб'ектыўнае. Гэта заўсёды барацьба. Барацьба напружанага, драматычнага напалу, у выніку якой адбываецца катарсіс, нейкае ачышчэнне.

— Згодная. Але ж у сімфоніях Смольскага гэта канцэпцыя заўсёды дасканала ўвасоблена музычна. У 9-й сімфоніі — гэта монатэматызм, адна тэма, якая праходзіць скрозь усе часткі. А ў электрагітары, у 2-й і 3-й частках менавіта гэтая тэма атрымлівае новае развіццё ў новым стылёвым кантэксце. Вось такая ідэя была пакладзена, мне здаецца, у аснову чатырохчасткавай сімфоніі.

— Безумоўна... 1-я частка — павольная музыка, пабудаваная толькі на адной тэме. Яна нараджаецца з самых аркестравых глыбінь і паступова ўзыходзіць да сваёй кульмінацыі. Гэта тэма паглыбленага, сканцэнтраванага роздуму. Калі яна дасягае вяршынь свайго развіцця, з ёй адбываецца якасная змена. Дынамічная хваля медных ды ўдарных інструментаў быццам звяргае яе ў бездань. Адразу пасля такога вялікага "ўступу" пачынаецца другая частка, якая асабліва мне спадабалася: гэткае злавеснае скерца з рэзка акцэнтнай рытмікай у хуткім руху. На аркестравую авансцэну выходзіць электрагітара — новы персанаж у гэтай драматычнай дзеі.

— А трэба дадаць, што электрагітара гучыць толькі ў 2-ой і 3-яй частках...

— Мне здаецца, што яна ўвасабляе нейкае інфернальнае зло. Яе іншая гукавая прырода кантрастуе з дастаткова "цёплым" аркестравым тэмбрам.

— Я неяк інакш успрыняла гэтую частку. Тут мне вельмі спадабалася стылёвая ігра. Ігра гукаў, тэмбраў. На мой погляд, гэта было менавіта так вырашана.

— Гэтая ігра — элемент музычнай драматургіі сімфоніі. Трэба сказаць, выдатна зроблена... А вось 3-я частка — зноў кантраст. Тут медытатыўны склад апавядання і мастакоўскае даследаванне толькі аднаго тэмбра. Таксама ігра, але ігра фарбаў толькі аднаго інструмента — электрагітары. Гэта сольная частка, у якой кампазітар дэманструе магчымасці інструмента. Выдатна выканаў сольную партыю Віктар Смольскі.

— Мною 3-я частка ўспрымалася як кадэнцыя саліста. 2-я і 3-я аб'ядноўваюцца тэмбрам электрагітары і ўжо нагадваюць цыкл у цыкле. Калі 1-я і 4-я — абрамляючыя, то 2-я і 3-я — быццам канцэрт для электрагітары з аркестрам. І з гэткага пункту гледжання 4-я частка мне падаецца, можа быць, самай спрэчнай.

— Гэта — вынік, плён развіцця. Зноў канфлікт, але на іншыя ўзроўні. 4-я частка перагукаецца з 1-й. І там узнікае, як рэфлексія, — не ілюзія, а нават цытата з "Патэтычнай санаты" Бетховена! Я ведаю, што Смольскі доўга шукаў гэтую цытату і потым сам для сябе адзначыў, што яна і толькі яна мусіць быць уключана ў фінал, бо інтанацыйна адлавядае асноўнаму тэматызму сімфоніі. Тэма з "Патэтычнай санаты" гучыць і як сімвал... Сімвал чысціні, непасрэднасці. Мабыць, сімвал юнацтва, калі кожны музыкант упершыню сутыкаецца з гэтай узнёслай бетховенскай музыкай.

— Для мяне гэтая цытата гучала як настальгія. Высокая лірычная настальгія. Бо, заўваж, фартэпіяна там грае не так, як мы прызвычаіліся яго чуць непасрэдна ў арыгінале. Бетховена. Няма ніякай патэтыкі ў выкананні. І я ведаю, што Смольскі вельмі доўга шукаў менавіта гэты тэмбр. Ён хацеў нават паставіць раяль за кулісы, каб гук быў "фартэпіянна-сурдынны".

— І вось праз барацьбу, тэмбравыя і дынамічныя кантрасты ў канцы сімфоніі настае прасвятленне.

— Так. Заканчваецца яна акордам вельмі светлым, ці не самай светлай у музычнай літаратуры танальнасцю — мі-мажорам. Пачыналася яна таксама з ноты "мі". З адной нотачкі вырастала і да яе ж вяртаецца. Мне здаецца, што фінал, такое прасвятленне ўсіх павінна ўражваць...

— І, мабыць, не толькі ўражваць, а штосьці й мяняць ва ўнутраным стане. Проста кажучы — прасвятляць душу.

ЯШЧЭ АДЗІН СПЕКТАКЛЬ...

ЗАПОЗНЕНЫЯ РАЗВАГІ АМАТАРА

Яшчэ адзін спектакль Мікалая Пінігіна. Яшчэ адна тэатральная падзея, пра якую гавораць, пішуць, на якую ідуць — паўнюткая зала таму сведчаннем. Зноў усё прыгожа, відовішчна, па-мастацку. Драматычныя акцёры ў "Ідыліі" заспявалі, танцавальныя нумары-ўстаўкі ідуць ледзьве не на "біс", сцэнаграфія, як заўжды ў купалаўцаў, прэтэндуе на абагульненне. Але з першай мізансцэны — тупаватых сялянскіх твараў, замоцных гуках бізуна, знарачытых "оперных" галасоў — узнікла тое самае, добра знаёмае па "Тутэйшых" адчуванне: няёмкасці, прыкрасці, унутранага непрыняцця.

Мімаволі задумаешся. З аднаго боку, ці такое ўжо вялікае значэнне маюць пачуцці нейкага аднаго, хай сабе і не раўнадушнага да тэатра гледача, калі тысячы вітаюць спектакль апладысментамі? З другога боку, мне важна разабрацца ў прычыне адштурхоўвання, дайсці да сутнасці, зразумець — чаму выклікае пачуццё, падобнае на асабістую абразу, цікавы і таленавіты спектакль маладога перспектыўнага рэжысёра?

З дзённіка. 16.10.1990 г. 11 гадзін вечара.

"Толькі што вярнулася з так званага грамадскага прагляду. Купалаўцы (малады рэжысёр М. Пінігін) паставілі "Тутэйшых". Я абражана і абурана — нават рукі калаціліся. Ніколі не думала, што з-за нейкага спектакля можна так выйсці з раўнавагі! Гэтаму Пінігіну беларускасць — пусты гук. Што з трагікамедыі зрабіў фарс — Бог з ім, можна было б мірыцца. Але ж такая вось выйшла няўдобіца: Янку Здольніка, якому Купала даверыў выказваць свае запаветныя погляды і думкі, нельга было сёння іграць літаральна, і рэжысёр выйшаў, што называецца, са становішча: ён акарыкатурыў яго! Зрабіў з яго бэнзэфайца, надаў рысы благога аратара і нават дэмагога. Чаго варты эпізод, калі ён гаворыць пра ідэалы, а сам распальваецца і гладзіць грудзі Аленкі. У другой дзеі, праўда, не было сцэн, дзе можна было б іх высмеяць, таму яны паводзяць сябе проста і размайляюць проста. А як Здольнік прымае падарункі, як кашулю вышываную ўзнімае замест сцяга! Акцэнты відавочна змясціліся: Мікіта Зносак (яго добра іграе В. Манаеў), патрапляючы ў нагу з "палітычнай сытуацыяй", куды менш варты злога смеху, чымся "рупар" купалаўскіх ідэй! Ён зусім не небяспечны, яго нават шкада — ат, нехлямяжы такі хлопец, які не ўмее пастаяць за сябе пры ўсіх сваіх здольнасцях да мімікрыі.

У фінале спектакль ратуе сцэнаграфія Герлавана: урачыста, да столі ўзнімаецца бел-чырвона-белы нацыянальны сцяг... /.../

"Тутэйшых" не згадаць было немагчыма: адзін "почырк", адной рукой створаныя спектаклі. Зробім папраўку на "жанр": гэта пісалася для сябе, па першым уражанні, без неабходных у выпадку апублікавання апрацоўкі і далікатнічання. Эмацыянальны напал запісу сведчыць пра тое, што ўзрушэнне было вялікім, а ўдар — адчувальным.

Удар па чым? — спытаеце вы. Па нацыянальнай годнасці, — адкажу я. Закранута маё нацыянальнае пачуццё — самае тонкае і датклівае з усіх чалавечых пачуццяў.

Тут мушу зрабіць яшчэ адно адступленне-агаворку: з цягам часу злой сатыры ў "Тутэйшых" паменела, найбольш рэзкія моманты былі затушаваны, і пазнейшыя па часе спектаклі ўспрымаліся па-іншаму. (Відаць, карэктывы ўнесла якраз глядацкая рэакцыя). Мо "Ідылія" не паспела скарэкціраваць саму сябе? Параўноўваю ўласны эмацыянальны водгук тады і цяпер, намагаючыся зразумець прыроду такога своеасаблівага ўздзеяння. Ці гэтага хацеў пастаноўшчык? Інакш кажучы, наколькі свядома ставіцца рэжысёр да ўласнага дзеішча; ці перад намі плод высілкаў мастака, падсвядомых творчых імпульсаў і комплексаў, ці абдуманы ўчынак чалавека іншага светаўспрымання?

Дапускаю, што многія сцэны і рэплікі якраз і разлічаны на тое, каб зачаліць. Без такога дапушчэння многіх рэчаў проста нельга зразумець. Ну, напрыклад, гэтага. "Няхай квітнее Бацькаўшчына!" — ускліквае Ян Дабровіч, раз'язджаючы па сцэне на старасвецкім смешным веласіпедзе. Наша бясхітрасная публіка імгненна хапае "жыўца" — рэагуе вясёлым смехам.

А вось як абыгрываецца наступная вершаваная страфа, напісаная пазней Янкам Купалам у дадатак да аўтарскага тэксту:

Што мне пекны Парыж,
Рым прыгожы і слынны,
Што швейцарскія горы, старыя Афіны.
Што мне Вена, Мадрыд,
што мне Лондан туманны,
Больш за ўсё я бацькоўскаму
краю адданы!

Верш, вынесены ў праграмку як эпіграф, чытаецца па чарзе ўсімі персанажамі, прычым назва кожнага горада суправаджаецца красамоўным пляўком цераз плячо.

Славутае "Над кем смеетесь?" тут магло б гучаць як "Чего плюетесь?.."

Узнёслы, досыць статычны фінал не вельмі стасуецца з папярэднімі сатырычна завостранымі штучкамі (у фантазіі акцёрам не адмовіш). Планета-глобус ператвараецца ў паветраны шар, які так нікуды і не паляцеў. Чатыры нерухомыя паніклыя постаці шкадавання чамусь не выклікаюць, а толькі палёгку, што гэтая перайначаная, перакручаная, зніштожаная смехам "опера" нарэшце адыграна, і можна пайсці дадому.

Тутэйшы "састаралы" патрыятызм, тым не менш, высмейваецца нават у фінале, дзе Манаеў з уласцівым яму гратэскам распавядае пра бацькоўскія магілы (!), а астатнія чытаюць "сур'ёзныя" вершы, прызваныя альбо ўзняць спектакль на належную ідэйна-мастацкую вышыню, альбо, хутчэй за ўсё, проста згладзіць уражанне ад папярэдняй бесперапыннай пародыі.

Так, перад намі звычайная пародыя на пастараль. З акцёраў у рамках жанравага вызначэння іграюць хіба В. Рэдзька, Г. Маляўскі ды А. Луцэвіч. Астатнія — хто што, як і ў "Тутэйшых". Звыкла пераігрывае, пераціскае Манаеў, празмерна акцэнтавана, як мне падалося, пражывае ролю З. Белахвосцік.

Цяжэй вызначыць, што ж тут на самай справе высмейваецца. Жанр? Дык ён не вінаваты, што выйшаў з моды мо дзвесце гадоў назад. Афіцыйнае "саўковае" разуменне народнасці і фальклору? Адраджэнства як штосьці аджыўшае і ў нечым штучнае, вымучанае? Як пісала калісьці ў "Звяздзе" Т. Падаляк, ці ж з усяго можна смяяцца?

Зрэшты, калі ўжо былі ў М. Пінігіна нейкія асаблівыя падставы для такой трактоўкі першай беларускай оперы, для такога разумення беларушчыны, то можна было б зрабіць тое самае без залішняга педаліравання. Спектаклю, як мне падалося, не хапае цеплыні, чалавечнасці, тут ёсць старонні, іранічны погляд збоку. **Погляд чалавека, якому не баліць.** Дуніна-Марцінкевіч да ўсяго, што дзеецца на купалаўскай сцэне, мае яшчэ меншыя адносіны, чымся Янка Купала — да інтэрпрэтацыі "Тутэйшых".

Тут мяне могуць палічыць за адваката класікі. Такім я сябе, на жаль, не адчуваю. Я ўсведамляю поўную немагчымасць ставіць творы Янкі Купалы і Дуніна-Марцінкевіча ў "факсімільным", нязменным выглядзе, прымаю эстэтыку спектакляў, высока цаню іх метафарычнасць. Але "асучасніць" — не значыць пераніцаваць, перастварыць з дакладнасцю да наадварот!

Сам па сабе талент парадыста адметны і досыць рэдкі. Было б на чым яму выявіцца! На класічнай літаратуры, на нацыянальным матэрыяле самасцвярджацца з такім своеасаблівым дарам — рызыкоўна. Ці ўсяму "віною" месца працы — акадэмічны тэатр з пэўнымі традыцыямі, пэўным іміджам, што вымагае браціца за крыніцы, на якія ў іншых абставінах і не зірнуў бы?..

У такім незайздросным становішчы, заўважым, не адзін Пінігін. Вось і думаю: навошта творчаму чалавеку гвалтаваць сваю прыроду і трывожыць прытым цені вялікіх? Канфлікт паміж схільнасцямі і часовым абавязкам вырашаецца звычайна на карысць схільнасцей...

Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ

КАРОТКІЯ АПАВЯДАННІ

(Пачатак на стар. 9)

недзе ў іншым месцы. Напрыклад, у лёхах Радзівіла ў Слуцку альбо нават у Белай пад лесам, дзе таксама знаходзіўся палац слуцкага князя. Мала верагодна, што знішчэннем сваіх арандатараў займалася Ганна Радзівіл, якая жыла тады ў Вільні...

Між тым, справа складвалася не дужа простая. Антысемітызм пачварным ценем клеіўся да майго земляка, як цяжкае злачынства. У часопісе "Сіён" прафесар Гальперын змясціў артыкул, назваўшы яго "Вашчылаўскія бунты...". Здаецца, так. Урэшце, справа не ў дакладнасці загалоўка. Усё — у змесце. Дык са зместа тое і вынікае зноў, што Вашчыла вораг яўрэйскага народа. За мяжой цэлая кніга выйшла, дзе таксама для кіраўніка антыфеадальнага крычаўскага паўстання не знайшлося месца для літасці.

Тым часам ужо была знойдзена следчая справа Вашчылы. Васіль Мялешка ды Павел Лойка напісалі кніжку. На радыё быў створаны спектакль па маёй п'есе "Следчая справа Вашчылы". Надыходзілі трохсоттадовыя ўгодкі. У Крычаве збіраліся адзначаць іх. Беларускі фонд культуры звярнуўся ў дзяржаўныя інстанцыі за дазволам пачаць конкурс па стварэнні помніка Вашчылу ў Крычаве. Тады, як і цяпер, без дазволу зверху падобныя справы не рабіліся. ЦК КПБ палічыў наша хадайніцтва слушным. І вось у 1990 годзе мы паехалі ў Крычаў святкаваць Вашчылавы ўгодкі. Адбыўся гарадскі вечар, пра Вашчылу і паўстанне 1744 года шмат гаварылася на ім. Было вызначана месца, дзе паўстаць помніку. Праўда, далейшыя падзеі перашкодзілі конкурсу. Але тым не менш ужо здавалася, што хоць з ягоным антысемітызмам скончана. Ды дзе там! Чорная чалавечая памяць, аказваецца, яшчэ даўжэйшая за светлую. Зноў пра Вашчылаў антысемітызм загаварыў наш прафесар Грыцкевіч у штотыднёвіку "Культура". Аказваецца, цяпер ва ўсім вінаваты ЦК КПБ, які ў класавых мэтах рашыў устанавіць помнік ворагу яўрэйскага народа...

Куды ж нам далей рухацца, браткі, у сваіх цяперашніх пошуках будучыні? Няўжо з кляймом антысемітызму?

Не было ў Крычаве ў часе вашчылаўскага паўстання братоў Іцкавічаў! Не было! Ніхто вашых не біў там!..

І толькі цяпер я ўжо зразумеў, чаму адзін з нашых мастакоў, даволі моцна начынены нацыянал-радыкалізмам, даводзіў некалі ў Фондзе культуры, што бронзавая постаць Вашчылы не павінна з'явіцца на зямлі.

— Чаму?

— Ды таму, што гэта асоба ў нашай гісторыі неадназначная.

Тады скажыце, мае харошыя, хто ў нас, якая асоба ў нашай гісторыі адназначная?

Змаўчаць мне цяпер пра так званы антысемітызм Вашчылы ніяк не выпадае. Я ўвогуле не раўнадушны да сваіх землякоў, магіляўчан, а тут жа справа ідзе пра нацыянальнага героя?!.

ДРУГАЯ НЯМІГА

Адзін раз пастух ужо адыграў сваю ролю ў маіх літаратурна-пошукавых вандраваннях. Але я дазволю сабе яшчэ спаслацца на аднаго.

Мне змалку вельмі хацелася пабачыць выток Бесядзі. Гэтая рака — мая калыска. Мяне гушкалі на сабе яе цёплыя хвалі, мяне карміла, можна сказаць, і паіла яна, дарма што ведаюць пра Бесядзь найбольш па вершы Куляшова. Можа, таму, што ён першы азваўся аб ёй.

Нарэшце выбраўся я ў адзін год у вярхоўе сваёй ракі. Але перад тым варта сказаць, што амаль усе рэкі, якія цякуць у нас на паўднёвым усходзе Беларусі, пачынаюцца на смаленскай узвышанасці. Бесядзь таксама там вынікае з зямлі. Дакладней, з балацявіны, парослай аерам і асакой. А мне ў той час край неабходна было пабываць на Смаленшчыне і ў Браншчыне, адкуль прыйшоў да нас у сорак першым годзе разведвальна-дыверсійны атрад Мядзведзева. Так ужо склалася, што без канкрэтнай тапапрывязкі не даюцца мне нават першыя радкі ў творы. Я павінен мець перад вачамі хоць бы план мясцовасці, на якой адбываюцца падзеі. Вось я і паехаў спярша на Смаленшчыну. Пабадзяўся трохі ў Рославе, што таксама некалі належаў да Беларусі, тады падаўся ў Ершыцкі раён. Па карце там недзе нараджалася мая рака.

Лета выдалася дажджлівае, а яшчэ яно мелася адкласціся ў памяць тым, што ў той год ішла нарыхтоўка корму для жывёлы з зялёных галінак. Пачалася гэта сельскагаспадарчая кампанія, калі можна сказаць так, у нас на Беларусі, прыдумалі яе Машэраў з Шавялухам, але суседзі нашы, смаленцы ды браншы, таксама падхапілі беларускую ініцыятыву. Таму дрэвы паўз дарог і ў нас, і ў іх стаялі скалечаныя, усё роўна як кактусы дзе-небудзь на поўдні — і рукі пасечаны, і ногі, не кажучы ўжо пра галовы. Словам, жахлівае відовішча. Аднак усё засланяў неперашчуканы дождж. Часцей ён стаяў сцяной, ехаць на машыне палявымі дарогамі было цяжка, матор увесь час натужна чмыхаў, ажно і цябе прымушаў моцна напружвацца. К канцу дня звычайна балелі мышцы, асабліва на жываце; адчуванне заставалася такое, быццам не матор, а ты сваёй сілай выбаўляў машыну з калдобінаў на сухое. Прынамсі, мне давялося пераапрануцца ва ўсё новае — купіць гумавыя боты, таксама так званую штармоўку, якая хоць з большага, аднак ратавала ад макрэчы, ну і яшчэ сёе-тое. Між тым, неўзабаве высветлілася, што дарэмна было ехаць шукаць выток Бесядзі праз Ершычы. Хапала павярнуць направа пасля моста праз Іпуць, каб апынуцца ў Новай Бесядзі, невялікай вёсачцы, дзе пачатак Бесядзі. Але гэта стала вядома потым, калі я ўжо пагаварыў з мясцовымі людзьмі. "Так, — сказаў адзін з іх, — Бесядзь пачынаецца ў нас"... Але быў здзіўлены, што яна недзе мае і шырыню і даўжыню, упадаючы ў Сож пад самым Гомелем; гэта быў для яго цэлы свет, можа, нават і не зусім зразумелы, маўляў, аказваецца і яшчэ нібы жывуць людзі, акрамя як у нас!.. Падобнай глухамані мне мала калі выпадала бачыць — і па мясцовасці, дзе тулілася вёсачка, і па псіхалогіі яе насельнікаў. Праўда, пад той час у Новай Бесядзі жылі два хлапчукі з Масквы, я ўжо не помню з якой прычыны, але яны і ўзяліся правесці мяне да балацявіны, пасярод якой струменіла з глыбокіх зямных нетраў рака. Гумовыя боты, я ўжо казаў, у мяне былі, заставалася адно ўзброіцца, бо сказалі навабесядцы, што паблізу, у зараснікаx, водзяцца ваўкі. Быў у мяне ў машыне вялікі нож, усё роўна як вайсковы кінжал, і я самым сур'ёзным чынам прыхапіў яго з сабой.

Ваўкоў, вядома, не сустрэў, хоць зараснікі абапал вузенькага рэчышча стаялі густыя. Ісці ўвесь час даводзілася, быццам па тунелі. Нават дождж не меў моцы прабіць зверху ракітавую навісь. Рэчышча Бесядзі тут было роўнае, нагадвала звычайны жалабок, увесь аблеплены глеем, змешаным з чаротавай саломай, і выгляд мела драздовага, хутчэй ластаўчынага гнязда. Вада між тым ледзь струменіла на дне жалабка, дарма што яе хапала паўсюль. Але вось і тая балацявіна, да якой гэтак імкнуўся. Трохі бліжэй да краю стаіць лазовы куст, і каля яго паміж асакі варушыцца, ажно хвалюецца вада. Пры выглядзе гэтага малюнка мне раптам штосьці сціснула сэрца, але я не стаў больш набліжацца да куста. Стаяў пад дажджом з вялікім нажом у руцэ ды глядзеў на выток. Аказваецца, усё проста ў прыродзе. Нічога складанага, прынамсі, на пачатку той альбо іншай з'явы. Другая справа — далей. Некалі я быў моцна здзіўлены, напрыклад, калі ўбачыў за Трасціном, гэта ўжо на мяжы Магілёўшчыны і Смаленшчыны, як са стромага берага ў Бесядзь падалі халодныя ключы, ад якіх, калі пакаштаваць вады, ажно заходзіліся зубы. Іх было мноства, здавалася, быццам хтосьці знарок прарабіў у строме для іх пячуркі. Там сапраўды гэта выглядала загадкай, — што ўтварала тыя ключы высока над краем вады і што іх змушала, быццам іграючы, падаць уніз. Тут жа, на вытоку самой ракі, усё бачылася куды прасцейшым, дарма што ўсхваляванасць была не меншая, можа, нават большая. І ўсё-такі нарэшце да мяне прыйшла тая здаволенасць, якая здараецца рэдка ў жыцці, быццам і праўда давялося пабачыць якраз тое, без чаго мала ўяўлялася далейшае жыццё. Адчуванне ў душы з'явілася, нібыта выйшаў у сваім жыцці на нейкі новы рубеж, з якога можна альбо рухацца яшчэ наперад, альбо павярнуць назад.

Цяпер часта згадваецца тая паездка ў вярхоўе Бесядзі. Адтуль дарога павяла мяне праз Мглін на Ноўгарад-Северскчыну. Патрэбна было трапіць у Красную Гару, што раней мела назву Паповай Гары. Там жыў адзін чалавек, які калісьці, перад прыходам немцаў у Забесяддзе, вывез з касцюковіцкага банка грошы ў мяшках. І мне гэта патрэбна было для рамана. Прынамсі, так я тады думаў, хоць у далейшым нічога з таго і не было скарыстана.

Дажджы між тым не перашчукалі. І на Ноўгарад-Северскчыне паўз дарог стаялі знявечаныя дрэвы — беларускі пачын нарыхтоўкі кармоў для жывёлы распаўсюджваўся ўсё шырэй. Але вось аднаго дня нарэшце суцэльныя хмары расступіліся ў небе, выглянула сонца. Якраз настала пара абеду. Прыпасы, узятыя з дому, тым часам скончыліся. Ну а ў мясцовых крамах адны пернікі ды яшчэ чамусьці каньяк. Не гарэлка, а менавіта каньяк, да якога вясковы чалавек не дужа каб і ахвоту вялікую меў. Гэта цяпер ён не кожнаму даступны, каньяк, а тады мужыкі моршчыліся ад яго не з прычыны дарагоўлі — аказваецца, клапамі пахне. Але я купіў дзеля абароны ад прастуды пляшку. Узяў і пернікаў кілаграмы са два, па прынцыпе — запас бяды не чыніць.

Размясціліся мы з шафёрам на беразе рачулкі, звычайнай сморкаўкі, як іх называюць іншы раз. Прынамсі, мне сапраўды даводзілася чуць ад людзей падобныя ласкава-зневажальныя словы пра свае несамавітыя рэчачкі-раўчукі. Сонца тым часам вызвалілася цалкам ад хмар, угрэла, ажно зрабілася парна. Я скінуў гумовыя боты, у якіх было горача, звесіў ногі ў ваду, якая, нягледзячы на дажджы, зрабілася за вельмі кароткі час, можна сказаць, летнай. Здавалася, даўно гэтакай раскошы не даводзілася адчуваць маім нагам. Да таго ж, каньяк таксама нешта дадаваў да тае раскошы.

Праз рачулку-сморкаўку відна была вёска, трохі на ўзгорку, крытая чамусьці найчасцей дранкай, і туды да яе быў круты пясчаны ўз'езд, расхлістаны калясьмі. На краю вёскі, на высокай хвоі, кідалася вачам буслянка, аднак пустая, дарма што яшчэ не настаў час птушынага выраю. Няйначай, буслянка сям'я недзе знаходзілася ў будзённым адлёце, можа, старыя буслы вучылі маладых мацней трымацца на крылах у паветры. Ды ці мала чаго іншага неабходна ведаць маладым. Дзеля таго, каб стаць самастойнымі, напрыклад, здабываннe той жа ежы. Па гэты бок ракі пасвіліся каровы ў статку. На адной, няйначай збродлівай, вісеў званок, і раз-пораз бомкаў на ўсю ваколіцу. Было чуваць, як у прыбярэжным малінніку пырхалі птушкі, якія таксама ажылі з сонцам. Дзесьці ў гушчары лесу, што пачынаўся адразу за вясковымі дварамі, жаласна "прасіў" піць сіваграк, быццам яму яшчэ не хапала той вады, якой ужо, здавалася, наталілася ўсё ў прыродзе. Пі-і-іць, пі-і-іць!.. Аднекуль прыляцела чубатка, акурат жаваранак, апусцілася на паскубаную траву, паблізу, пачала пахаджваць, ахарошвацца, усё роўна як напаказ.

Між тым, да Краснай Гары яшчэ было ехаць і ехаць. Асабліва калі браць пад увагу дарогі пасля суцэльнага наваднення. І раптам пачулася за спінай кахікахі!.. Я азірнуўся. Трымаючы ў руцэ пугаўё, каля машыны стаяў пастух. Пра гэта няцяжка было здагадацца адразу, бо каму іншаму яшчэ тут апынуцца, як не пастуху, да таго ж, з пугай у руцэ. На бутэльку з пернікамі ён пазіраў з такой прагнасцю, што мне ажно шкада яго стала.

— Добры дзень, — сказаў я.

Тады і ён мне даў дзень добры.

— Што стаў? — спытаў я.

— Дык вось... — зусім нерашуча, а тым больш невыразна, адказаў ён.

Я наліў яму каньяку. Ён падышоў бліжэй, выпіў і сам узяў з распасцёртай газеты пернік. Але знарок адзін і дужа далікатна, усё роўна як моцна саромеючыся. Твар у яго быў худы і бледны, з пачарнелымі кругамі пад вачамі, быццам чалавека тачыла грудная хвароба.

— То сядай, — запрасіў я.

— Не, я пастаю.

Звычайная размова, калі гаварыць няма пра што. Але мне прыйшло раптам у галаву спытаць пра тое, што займела пасля ўвесь сэнс:

— Як завецца гэта рачулка?

— Няміга, — адказаў пастух.

— Няміга? — здзівіўся я.

— Так, Няміга, — пацвердзіў ён. —

ДОБРАСУСЕДСТВА

У Віцебску пры консульстве Латвійскай Рэспублікі адкрылася Нядзельная латышская школа. Яе вучнямі сталі як дзеці латышоў, што жывуць у абласным цэнтры, так і беларусаў і рускіх. За час навучання дзеці змогуць пазнаёміцца з гісторыяй і традыцыямі Латвіі, а таксама навучыцца пісаць і размаўляць па-латышску.

На здымку: заняткі ў Нядзельнай школе вядзе яе дырэктар Вікторыя Шпак.

Фота Аляксандра ХІТРОВА, БЕЛІНФАРМ

ЯПОНСКІЯ ФІЛЬМЫ Ў МІНСКУ

У апошні час культурныя сувязі паміж Японіяй і Беларуссю набываюць размах. Яшчэ адно таму пацвярджэнне: у другой палове лістапада ў мінскім кінатэатры "Піянер" пройдуць Дні японскага кіно. Гэтая дабрачынная акцыя арганізуецца пасольствам Японіі ў Рэспубліцы Беларусь. "Дабрачынная" — бо ўваход у кінатэатр будзе свабодны. У рамках гэтага паказу будуць дэманстравацца як мастацкія — "З таго часу" і "Элегантнае вяселле" (пастаноўка Есіміцу Марыта) і "Сумо достало!" (рэж. Масаюкі Суоі), так і дакументальныя стужкі "Навуковая графіка" (адлюстраваныя цуды прыроды), "Россыпы дарагіх камянёў у небе" (японскія феерверкі), "Майстар Зямлі і Агню Уйці Семідзу". Дзецям адрасаваны мультыплікацыйныя фільмы "Сусед Татора", "Экспрэс "Галактыка-999", "Юніка".

Р. КОСЦІКАЎ

НЕ ЧУЛІ ПРА ГАЗЕТУ "АЙЧЫНА"?

Магчыма, і не чулі, бо, уласна кажучы, гэта газета ў газеце. У якой, спытаеце? У "Настаўніцкай...". Нядаўна з'явіўся першы выпуск. Дэвізам да яго ўзяты словы з рэдакцыйнага звароту: "Мы не пыл, што разносіцца ветрам. Нам ёсць чым ганарыцца: у нас вялікая гераічная гісторыя, найбагацейшая духоўная спадчына, працавіты, мужны, таленавіты народ. У нас свая дзяржава ў цэнтры Еўропы".

У "Айчыне" змешчаны артыкул Я. Купалы "Больш самачыннасці", напісаны яшчэ ў 1919 годзе, але надзіва сугучны сённяшняму дню. В. Протчанка ("Роднае слова — крыніца развіцця асобы, нацыянальнай культуры і духоўнасці народа") разважае аб тым, да чаго нельга не прыслухацца. Уратаванне нас у нас саміх. Пра гэта ўрэшце і матэрыялы рубрыкі "Адкуль мы родам". У ёй выступае народны дэпутат Рэспублікі Беларусь А. Трусаў — "Што атуліла агеньчык".

Я. Крук у развагах "Эталон духоўнасці, які ўратуе нас ад кітчу" звяртаецца да свята беларускага фальклору і разглядае яго "вачыма зацікаўленага чалавека".

Рубрыка "Постаці Беларусі" ў "Настаўніцкай газеце" пастаянная, але ў "Айчыне" яна асабліва да месца! Гэтым разам У. Кіслёў расказвае пра чалавека, які намнога раней за знакамітага Папова адкрыў... радыё. Але пра Папова ведаюць усе, а пра яго... Прачытайце артыкул "Наш сучаснік Якуб Наркевіч-Ёдка".

Мяркуецца, што "Айчына" будзе з'яўляцца адзін раз у два месяцы.

А. М.

Але вось здрабнела. Беларусы нам тут правялі меліярацыю, дык усё цяпер чэзне. Сабе папсавалі рэкі, цяпер — нам. Хутка ад яе нічога не застанецца.

І трэба ж было ехаць за столькі кіламетраў, каб трапіць з аднае, мінскае, Нямігі на другую?!. Словам, гэта нібыта аглавушыла мяне, хоць і ведаў, што нярэдка трапляюцца на зямлі рэкі з адной і той жа назвай. Напрыклад, ёсць дзве Проні, адна цячэ па зямлі былых радзімічаў, другая — па зямлі былых вяцічаў. Калі верыць гісторыі, то некалі з прапольскіх земляў прыйшлі да нас са сваімі абозамі і людзьмі браты Радзім і Вятка. Першы застаўся ў Пасожжы, другі падаўся далей, ажно да Акі. А вось як яны разабраліся з Проняй, невядома. Прынамсі, з таго часу цякуць па зямлі далёка адна ад адной дзве Проні. Мусіць, прыгожая была тая Проня, што ажно не здолелі падзяліць яе паміж сабой браты.

Але ж Няміга?! Для нас, беларусаў, гэта, апроч усяго, яшчэ і гісторыя. Памятаеце?

Падзеі, што апісаны ў "Слове пра паход Ігараў", якраз і адбываліся найперш тут, на зямлі Ноўгарад-Северскай, блізка ад старажытнага Чарнігава. Гэта няважна, што тутэйшую зямлю Кіеўскай Русі дзялілі і перадзельвалі — то яна даставалася Вялікаму княству Літоўскаму, рускаму ды жамойцкаму, то адыходзіла да Маскоўскай дзяржавы. Ішлі частыя войны, пакуль мясцовыя гарады, такія, як Папова Гара, Навазыбкаў, Сураж, Клінцы, Старадуб, Дарагабуж, канчаткова не адваявала Масква.

Сваю Нямігу мы ведаем найперш па "Слову..." Бо сёння яна цячэ недзе пад асфальтам. А гэтая вось па-ранейшаму адкрыта струменіла ў сваім вузенькім рэчышчы на паверхні, што высыхаючы ў спёку, то напаўняючыся зноў пры дажджах. Між тым, мне заўсёды чамусьці здавалася, што мала верагодна, каб наша Няміга з-за вялікай адлегласці ад Чарнігаўшчыны мела падставу трапіць у выдатны твор старажытнага пісьменства. І толькі тады, як узяўся за пераклад "Слова пра паход Ігараў", зразумеў загадку. Прынамсі, мне так хочацца думаць. Справа ў тым, што ў асноўны тэкст "Слова..." пазней былі зроблены кімсьці ўстаўкі. Можа, тым жа Кірылам Тураўскім. Іх лёгка заўважыць, калі добра ўчытацца. Дык ці не ў выніку дадаткаў у "Слове..." з'явілася і наша Няміга? Калі гэта сапраўды наша?

Некалі я расказаў Максіму Танку, што ёсць на свеце другая Няміга. Тая, што яшчэ бліжэй і да Чарнігава, і да Пуціўля, і да Ноўгарад-Северска. Яўген Іванавіч засмяяўся, сказаў, нібыта з папрокам:

— А табе вельмі хочацца адбіраць у нашых беларусаў казку?

Канечне ж, не. Але мінулі гады, меліярацыя, як і казаў той пастух, дала свае вынікі. А тут у дадатак яшчэ радыяцыя чарнобыльская. Як і мая малая радзіма, тая зямля, дзе некалі ўбачыў я другую Нямігу, таксама атручана. Людзі яе пакінулі. І калі я пазалетась паехаў туды, то не пазнаў былых краявідаў. Не стала і Нямігі... Калі б не гэтая акалічнасць, наўрад ці згадаў бы я тут пра другую Нямігу.

А ў старых кнігах, дзе друкавалася некалі "Словы пра паход Ігараў", у самым нізе, сярод розных спасылак, можна і цяпер прачытаць: Няміга — рака на Чарнігаўшчыне.

ПОПЕЛ КУПАЛЫ

У дамашнім архіве маім ёсць фотакартка, дзе мы невялікай калонай, якая нагадвае хутчэй звычайны натоўп, пераносім на вайсковыя могілкі ў Мінску скрыню з Купалавым попелам...

Я ўжо не ведаю цяпер, хто ездзіў тады ў Маскву раскопваць магілу бацькі нашае нацыі. Зрэшты, справа не ў тым. Галоўнае, што народны паэт нарэшце меў магчымасць легчы ў родную зямельку.

На той фотакартцы я іду апошнім у калоне. Побач — Мікола Прашковіч, які потым спаліў сябе, зацкаваны людзьмі і ўладамі, у вясковым пограбе... Між тым, я не быў яшчэ тады членам Саюза пісьменнікаў, але не мог не з'явіцца на перанос праху Купалы. І вось мы ідзём з вуліцы Энгельса, дзе знаходзіўся СП, мінаем Круглую плошчу, ужо ў той час, здаецца, перайменаваную ў плошчу Перамогі, скіроўваем на Даўгабродскай вуліцы да вайсковых могілак. У Саюзе пісьменнікаў казалі, што на могілках збярэцца шмат народу, нібыта гарадскія ўлады знарок апавяшчалі інтэлігенцыю, працоўныя калектывы... А мы ўсё адны ідзём. На могілках таксама няма людзей. Але далакопы ўжо падрыхтавалі яму, па краях яе ўзвышаюцца горбікі жвіру. Навокал — ціха, як у склепе. Нарэшце, гучаць развітальныя словы. Скрыню з прахам паэта апускаюць у яму, якая нарэшце становіцца Купалавай магілай. А людзей з працоўных калектываў, якія павінны былі б таксама аддаць апошнюю ўвагу вялікаму песняру, па-ранейшаму няма. І толькі калі мы разыходзіліся з могілак, прыйшла да расчыненых варотаў яшчэ адна невялікая калона з жалобнымі вянкамі. Потым казалі, што людзі ўсё ж ішлі на вайсковыя могілкі ўвесь той дзень, бо кожнаму калектыву ў гарсавеце быў устаноўлены свой час. Камусьці вельмі не хацелася, каб каля Купалавай магілы сабралася шмат народу. Хтосьці баяўся і таго ж народа, і Купалы.

У нашыя дні шмат пішуць пра Івана Дамінікавіча, усё спрабуюць высветліць, як і чаму загінуў ён. Я не бяруся рабіць адкрыццё ў гэтым сэнсе, аднак у жыцці маім выдалася адна сустрэча з чалавекам, які, можна сказаць, быў пры апошніх хвілінах Купалы. Вось яго сведчанне.

— Я тады служыў у Кузьмы Кісялёва ў чыне капітана, — прыпомніў ён свядома, калі ўзнікла гаворка. — Многія беларусы ў часе вайны жылі ў сталіцы ў гасцініцы "Масква". Кузьма Венядзіктавіч таксама меў там апартаменты, але пастаянна жыў у другім месцы, займаў у Маскве службовую кватэру. Дарэчы, як і Панамарэнка, як і некаторыя іншыя кіруючыя таварышы, што апынуліся ў эвакуацыі. Таго дня знаходзіўся ў гасцініцы таксама і Янка Купала. Ён прыехаў з Татарыі, здаецца, на свой дзень нараджэння. Якраз спаўнялася шэсцьдзесят гадоў. Ад Кісялёва я чуў, што вечар урачысты збіраліся ладзіць на Герцэна, у Саюзе пісьменнікаў СССР, Кузьма Венядзіктавіч чамусьці быў пахмуры, усё роўна як не знаходзіў сабе месца. Але ўвечары раптам сказаў мне:

— Падрыхтуй стол. Лёгкі такі. На дзве персоны.

Я тут жа выканаў даручэнне. Паставіў бутэльку дарагога каньяку, парэзаў лімон, напластаваў чырвонай рыбы, паставіў дзве крышталёвыя чаркі на высокіх ножках.

— Ну, ідзі, — сказаў Кісялёў. — Мы тут самі ўжо справімся.

— А хто, калі не сакрэт, мае быць? — спытаў я, бо меў такое права, як ад'ютант-ахоўнік.

— Купала, — адказаў бос. — Панамарэнка прасіў, каб я з ім перагаварыў. Гэта ж мы тут збіраемся адзначаць ягоныя ўгодкі, а там, у Мінску, немцы разам з беларускімі калабарацыяністамі, кажуць, ужо вуліцу ў яго гонар назвалі, па радыё вершы чытаюць. Словам, пачалася барацьба за Купалу. Аказваецца, усім ён патрэбны.

Кісялёў узяўся за тэлефон, а я, як і было загадана, выйшаў. У гасцініцы ў мяне жылі знаёмыя, аднак я не стаў спяшацца да іх. Адышоўся трохі ад дзвярэй, што вялі ў апартаменты Кісялёва, пачакаў. Сапраўды, неўзабаве пачуліся крокі ў калідоры. На дыванах яны чуліся нягучна. Купала нямоцна кульгаў, але на кавеньку сваю не апіраўся, нёс у руцэ. Мяне ён, відаць, не заўважыў. Ды і наўрад ці ведаў. Дзверы за ім у апартаменты зачыніліся, і я пайшоў на ніжэйшы паверх да сваіх знаёмых. Але ў нумары іх не аказалася. Давялося бавіць час у калідоры. І вось праз нейкі час, зусім нядоўгі, па гасцініцы раптам пайшоў погалас:

— Купала, Купала... Разбіўся Купала, беларускі паэт!..

Я стрымгалоў кінуўся наверх. Каля нізкай парэнчы ляжала пантофля. Адна. Я глянуў праз пярэнчу ўніз, як у калодзеж. Унізе сапраўды ляжаў чалавек, вакол яго віраваў натоўп. Аднекуль з'явілася знаёмая жанчына, таксама заглянула ў "калодзеж". Яна была спалоханая, але нічога не гаварыла. Я рушыў у апартаменты да Кузьмы Венядзіктавіча. Купалы ў пакоі не было. Бос мой сядзеў за сталом, выгляд меў яшчэ больш змрочны, чым раней. Першае, што кінулася мне ў вочы на стале, гэта заліты каньяком абрус і зламаная ножка аднае крышталёвае чаркі. Няйначай, Купалавай. Бо Кісялёвая стаяла перад ім і была зусім некранутая. У бутэльцы таксама хапала каньяку. Можа, яны толькі і налілі з яе гэтыя дзве чаркі.

— Купала разбіўся! — сказаў я.

— Як разбіўся? — амаль ці не зверавата глянуў на мяне Кузьма Венядзіктавіч.

— Зляцеў праз парэнчу на цокальны паверх.

Кісялёў ускочыў, але ў калідор не пабег. Колькі часу стаяў, усё роўна як здранцвелы, тады сказаў мне ціха:

— Каб ніхто ніколі не ведаў, што ён тут быў!..

Няйначай, што паміж Кісялёвым і Купалам у той вечар адбылася нейкая сварка. І ўзлаваны Купала з такім націскам паставіў на стол сваю непачатую чарку, што ажно адвалілася ножка, а на абрусе засталася пляма ад каньяку. Хутчэй за ўсё, што народны паэт рашыўся на самагубства. Тым больш, што ў яго гэта была другая спроба. Першы раз ён рабіў сабе так званыя харакіры.

— З кім жа ён дагэтуль быў? — спытаў я адстаўнога капітана.

— Дакладна не ведаю. Лішняя цікаўнасць для мяне тады магла б абярнуцца пагрозай. Але чуў, што з ім перад ягоным прыходам да Кісялёва знаходзіліся ў нумары вашыя пісьменнікі Лынькоў, Броўка, Глебка, Крапіва... Словам, яны таксама нешта ведаюць пра Купалаву смерць у гасцініцы "Масква".

— Але маўчаць, — сказаў я. — Адзін па адным адыходзяць на той свет, аднак маўчаць.

— Так, маўчаць, — згадзіўся чалавек, — а я вось з вамі парушыў слова, якое даў Кісялёву.

— Тае бяды, — супакоіў я, — часы няўхільна мяняюцца...

Сапраўды, часы мяняюцца. Але паранейшаму ў нашыя сэрцы стукаецца попел Купалы!..

(Працяг будзе)

Аб'явы

БЕЛАРУСКАЯ АКАДЭМІЯ МАСТАЦТВАЎ

АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС

на замяшчэнне пасад прафесарска-выкладчыцкага складу (для тых, хто валодае беларускай мовай):

— загадчык кафедры скульптуры, дацэнт — 1
— загадчык кафедры графікі, дацэнт — 1
— прафесар кафедры майстэрства акцёра і рэжысуры — 1
— дацэнт кафедры скульптуры — 1
— дацэнт кафедры інтэр'ера і абсталявання— 1
— дацэнт кафедры грамадскіх дысцыплін — 1
— дацэнт кафедры графікі — 1
— дацэнт кафедры малюнка — 1
— старшы выкладчык кафедры скульптуры — 1
— старшы выкладчык кафедры праектавання выстаў і рэкламы — 1

Тэрмін падачы заяў — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Заявы і дакументы, згодна Палажэнню аб конкурсах, падаваць на імя рэктара Акадэміі па адрасе: 220012, г. Мінск, пр. Ф. Скарыны, 81, аддзел кадраў: тэл. 32-77-34.

БЕЛАРУСКАЯ АКАДЭМІЯ МУЗЫКІ

АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС

на замяшчэнне пасад прафесарска-выкладчыцкага саставу (для тых, хто мае мінскую прапіску):

кафедра баяна-акардэона — прафесар — 1
кафедра канцэртмайстарскага майстэрства — дацэнт — 0,5
ст. выкладчык — 1
кафедра медных духавых і ўдарных інструментаў — дацэнт — 0,5
кафедра фартэпіяна — дацэнт — 0,25
кафедра агульнага фартэпіяна — ст. выкладчык — 1

Тэрмін падачы заяў — адзін месяц з дня апублікавання.

Заявы і дакументы, згодна Палажэнню аб конкурсах, накіроўваць на імя рэктара на адрас: 220030, г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 30.

Даведкі па тэл. 27-42-42, 26-06-70.

Саюз пісьменнікаў Беларусі выказвае глыбокае спачуванне пісьменніку Анатолю СУЛЬЯНАВУ з прычыны напаткаўшага яго горя — смерці маці.

ЛіМ ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

Заснавальнікі:
Саюз пісьменнікаў Беларусі і Міністэрства культуры і друку Рэспублікі Беларусь

Выходзіць з 1932 года

Газету рэдагавалі

Х.Дунец	(1932-35)
І.Гурскі	(1935-41)
А.Куляшоў	(1945-46)
М.Горцаў	(1947-49)
П.Кавалёў	(1949-50)
В.Вітка	(1951-57)
М.Ткачоў	(1957-59)
Я.Шарахоўскі	(1959-61)
Н.Пашкевіч	(1961-69)
Л.Прокша	(1969-72)
Х.Жычка	(1972-76)
А.Асіпенка	(1976-80)
А.Жук	(1980-86)
А.Вярцінскі	(1986-90)

Галоўны рэдактар Мікола ГІЛЬ

РЭДАКЦЫЙНАЯ РАДА:
Святлана БЕРАСЦЕНЬ
Андрэй ГАНЧАРОЎ
першы намеснік галоўнага рэдактара
Юрась ЗАЛОСКА
Міхась ЗАМСКІ
Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ
Барыс ПЯТРОВІЧ
намеснік галоўнага рэдактара
Юрась СВІРКА

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220600, ГСП, Мінск,
вул. Захарава, 19

ТЭЛЕФОНЫ:
прыёмная рэдакцыі *332-461*
намеснікі галоўнага рэдактара *332-525, 331-985*
аддзелы:
публіцыстыкі *332-525*
пісьмаў і грамадскай думкі *331-985*
літаратурнага жыцця *332-462*
крытыкі і бібліяграфіі *332-204*
паэзіі і прозы *332-204*
музыкі *332-153*
тэатра, кіно і тэлебачання *332-153*
выяўленчага мастацтва і аховы помнікаў *332-462*
навін *332-462*
мастацкага афармлення *332-204*
фотакарэспандэнт *332-462*
бухгалтэрыя *268-640*

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".
Рукапісаў рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з думкамі і меркаваннямі аўтараў публікацый.

Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра «ЛіМа»
Апаратныя сродкі і тэхнічная падтрымка — фірма «Дайнова»

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах
Друкарня "Беларускі Дом друку" (г.Мінск, пр. Ф.Скарыны, 77)
Індэкс 63856. Наклад 11534.
Нумар падпісаны 17.11.1994 г.

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Тэлетыдзень

ПАНЯДЗЕЛАК, 21.11

Беларускае тэлебачанне
8.05 Дзелавы веснік
8.20 Пяць хвілін на жарты
8.30 Беларускі тур
8.50 "Вылет затрымліваецца", м/ф
10.05 "Чарапашкі ніндзя"
10.55 "АВС-клуб" у Амерыцы
11.10 "Добрая казка", мульт
11.25 Планета людзей
12.10 На атраманне Дзяржпрэміі Беларусі Л. Захлеўны
13.15 "Еўрапейскі калейдаскоп"
13.45 "Банка комікса?"
14.15 "Буслянка", м/ф
14.55 "Етвызь-94", ч. 1
16.00 "Зорка Максіма", д/ф
16.10 Тэлебачанне — школе. "Полацкае княства — першая дзяржава на беларускай зямлі"
16.30 "Бімбат"
17.00 Навіны
17.10 "Атракцыён", мульт
17.20 Па слядах аднаго пісьма
17.40 Праспект
18.10 Навіны (Брэст)
18.25 Кантакт
18.35 Навіны ВВС
19.10 Аэробіка
19.40 Варыянты
20.25 Пяць хвілін на жарты
20.30 Кальханка
21.00 Панарама
21.40 Імгненне шчырасці
21.45 Вертыкаль
22.15 Спартыўны тэлекур'ер
22.35 Тэлевізійны Дом кіно
23.15 НІКа
23.30 Дайджэст
23.40 Пад купалам Сусвету
23.50 "Паласа Сімарона", с. 17

Канал "Астанкіна"
16.50 Свет сёння
17.00 Ва ўсіх на вуснах
17.25 Хакей. ЦСКА — "Тарпеда" (Яраслаўль). У перапынках: (18.05) — "Хто ёсць хто. XX стагоддзе". Л. Аліўе; Надвор'е; (18.50) — Добрай ночы, малышы!
20.00, 22.50 Навіны
20.30 Надвор'е
20.40 Мужчына і жанчына
21.20 Гол
21.50 Сенсацыі рускага тэатра
23.05 Сустрэча для вас
23.40 Мультфільм
23.50 Прэс-экспрэс
24.00 Тэлемемуары

Канал "Расія"
6.30 Формула-730
7.00, 11.00, 13.00, 15.00, 19.00, 22.00 Вестні
7.20 Патрабуюцца... патрабуюцца...
7.30 Час дзелавых людзей
8.00 Навіны АВС
8.25 Кліп-антракт
8.35 Дапеша
9.05 "Язычніцкая мадонна", м/ф (Венгрыя)
10.35 Тэлегазета
10.40 Сялянскае пытанне
12.10, 13.20 "Дзелавая Расія"
14.00 "Сустрэча", "Шаўкавіца", к/ф
15.20 Мульці-пульці
15.50 Там-там навіны
16.05 Свята кожны дзень
16.15 Навука сёння
16.55 Расійская энцыклапедыя
17.25 Выратаванне 911
18.20 Вуснамі дзіцяці
19.25 Падрабязнасці
19.35 "Спрут-6"
20.40 Рэпарцёр
21.00 Без рэтушы
22.20 Рака часу
22.25 Аўтаімгненне
22.30 Спартыўная карусель
22.35 Ніхто не забыты
22.40 ЭКП
22.50 Аніматэка
23.20 Зорны дождж
0.20 Зоркі гавораць

Санкт-Пецярбург
16.40 "Запомні, прынцэса", тэлеспектакль, ч. 1
17.10 "Спячая прыгажуня", рок-опера
17.30 Будні
17.50, 19.25 Музычны момант
17.55 Крыжыкі-нулікі
18.30, 21.30 Інфарм ТБ
18.50 Спорт, спорт, спорт...
19.10 Вялікі фестываль
19.30 "Атэла", м/ф
21.00 Тэлемагазін
21.05 Тэлеслужба бяспекі
21.15 "Золата "Зеніта", д/ф
21.45 Спартыўныя навіны
22.00 Ваш стыль
22.10 "Глушак", м/ф, с. 1
22.40 Ад першай асобы
22.55 "Поль Персан", муж. фільм

АЎТОРАК, 22.11

Беларускае тэлебачанне
8.00 Навіны
8.10 Дайджэст
8.20 Пяць хвілін на жарты
8.25 "Дзень нараджэння", мульт
8.40 "Напярэдадні"
9.00 Тэлебачанне — школе. "Полацкае княства — першая дзяржава на беларускай зямлі"
9.20 "Паласа Сімарона", с. 17
10.35, 16.05 "Бімбат"
11.05 "Дыназаўрыкі"
11.40 "Джон Рос. Афрыканскія прыгоды"
12.15 "Пасля 2000 года"
13.10 "Нов і К"-топ-10
14.10 "Етвызь-94", ч. 2
15.20 "Пад ліванскім кедрам"
15.35 "Часцінка", д/ф
15.45 Тэлебачанне — школе. Выяўленчае мастацтва
16.25 Як нараджаецца музыка?
17.00 Навіны
17.10 "Маё каханне, мой смутак"
18.10 Навіны (Віцебск)
18.35 Навіны ВВС
19.10 Эканамікст
19.20 Мост
19.50 Кантакт
19.55 Свет і чалавек
20.25 Пяць хвілін на жарты
20.30 Кальханка
21.00 Панарама
21.40 Пад купалам Сусвету
21.50 "Комікі", м/ф (Вялікабрытанія), с. 1
22.50 Паэтычная гасцёўня. Г. Страдаў
23.15 НІКа
23.30 Фаварыты года, ч. 2
0.40 Дайджэст

Канал "Астанкіна"
5.30, 7.00 Раніца
6.50, 7.50, 8.50, 9.50, 14.50, 15.50, 17.50, 20.00, 22.50 Навіны
8.00 "Топа Джыджыа", мультсерыял (Японія)
8.25, 18.30 "Дзікая Роза"
9.00 Ты памятаеш, таварыш...
9.30 Канцэрт народнай музыкі
14.00 "Гарачаў і іншыя"
14.25 Хроніка дзелавога жыцця
14.30 Дзверы ў малы бізнес
14.45 Тэлетур
15.00 Дамісолька
15.30 Чароўны свет, ці Сінема
16.00 Джэм
16.20 "Элен і хлопцы"
16.50 Свет сёння
17.00 Сітуацыя
17.30 Загадка СБ
17.40, 20.30 Надвор'е
17.45 "Хто ёсць хто. XX стагоддзе". К. Адэнаўэр
18.00 Гадзіна пік
18.55 Мы
19.40 Добрай ночы, малышы!
20.40 З першых рук
20.50 Залаты шлягер
21.35 Прэс-клуб
23.00 "Авацыя" прадстаўляе...
23.50 Прэс-экспрэс

Канал "Расія"
6.30 Формула-730
7.00, 11.00, 13.00, 15.00, 19.00, 22.00 Вестні
7.20 Патрабуюцца... патрабуюцца...
7.30 Час дзелавых людзей
8.00 Навіны АВС
8.25 Гандлёвы дом
8.40 Тэлегазета
10.40 Сялянскае пытанне
11.10, 13.20 Дзелавая Расія
14.00 Выратаванне 911
15.00 "Жарабец-хітрун", м/ф с. 2
15.45 Там-там навіны
16.00 Свята кожны дзень
16.10 Новая лінія
16.50 Кліп-антракт
16.55 Ваша права
17.10 Тэледэбаты
18.05 L-клуб
19.25 Падрабязнасці
19.35 "Расемон", м/ф (Японія)
21.30 Я — лідэр
23.20 Рака часу
22.25 Аўтаімгненне
22.30 Спартыўная карусель
22.35 "Высокая мода" ў Маскве
22.45 Канцэрт Д. Русаса
23.45 Зоркі гавораць

Санкт-Пецярбург
12.00, 14.30, 18.30, 21.30 Інфарм ТБ
12.10 "Баявы конік", мульт
12.30, 14.45, 17.30, 19.25 Музычны момант
12.25 "Нямецкая хваля"
13.00 Хуткая дапамога
13.30, 22.10 "Глушак", с. 2
14.00 "Казацкі круг", т/ф
14.50 "Я аб'яўляю вам вайну", м/ф
16.15 Чароўная лінія
16.30 "Бачу", д/ф (Польшча)
16.55 "Запомні, прынцэса", ч. 2
17.20 Паласатая музыка
17.35 Там, дзе жыве Павуціньч
17.55 Па ўсёй Расіі
18.50 Спорт, спорт, спорт...
19.10 Вялікі фестываль
19.30 "Алека", м/ф
20.35 "Свет мастацтва"
21.05 Тэлемагазін
21.10 Тэлеслужба бяспекі
21.20 Спяваё Р. Барысава
21.45 Спартыўныя навіны
22.00 Ваш стыль
22.40 "Эсмеральда", т/ф

СЕРАДА, 23.11

Беларускае тэлебачанне
8.00 Навіны
8.10 Эканамікст
8.20 Пяць хвілін на жарты
8.25 Дайджэст
8.35 Мультфільмы
9.00 Тэлебачанне — школе. Выяўленчае мастацтва
9.20, 17.10 "Маё каханне, мой смутак"
10.20 Тэлевізійны Дом кіно
10.55, 21.40 "Комікі", м/ф, с. 1, 2
11.55, 16.30 "Бімбат"
12.15 "Дыназаўрыкі"
12.50 "Джон Рос. Афрыканскія прыгоды", с. 6
13.25 "Пасля 2000 года"
14.20 "Кароль і дыня", мульт
14.35 Відзьма-нявідзьма
15.35 Культурызм
16.10 Дабрадзея
17.00 Навіны
18.10 Навіны (Гомель)
18.25 Кантакт: адрасы, прапановы, інфармацыя
18.35 Навіны ВВС
19.10 Тэлеклуб "Удача"
19.30 "Крок": "Карамболь"
20.00 Пяць хвілін на жарты
20.05 Хакей. "Цівалі" (Мінск) — ЦСКА (Масква)
20.40 Кальханка
21.00 Панарама
22.40 Пад купалам Сусвету
22.50 НІКа
23.05 "Аглантык-сіці", м/ф (Канада-Францыя)
0.45 Дайджэст
0.55 "Славянскі базар-94", ч. 1

Канал "Астанкіна"
5.30, 7.00, Раніца
6.50, 7.50, 8.50, 9.50, 14.50, 15.50, 17.50, 20.55, 23.00 Навіны
8.00 "Топа Джыджыа"
8.25, 18.25 "Дзікая Роза"
9.00 Клуб падарожнікаў
14.00 "Гарачаў і іншыя"
14.20 Хроніка дзелавога жыцця
14.30 Грошы і шчасце
14.45 Партрэт дзелавога чалавека
15.00 Паглядзі, паслухай...
15.20 "Лятаючы дом"
16.00 Цін-тонік
16.20 "Элен і хлопцы"
16.50 Свет сёння
17.00 Кампанія "Мір"
17.40, 21.25 Надвор'е
17.45 "Хто ёсць хто. XX стагоддзе". А. Калчак
18.00 Гадзіна пік
18.50 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. "Спартак" (Масква) — "Дынамо" (Кіеў). У перапынку (19.45) — Добрай ночы, малышы!
21.30 Маналог
21.40 А. Шнітке. "Менуэт на біс"
23.15 Мультфільм
23.20 Прэс-экспрэс
23.30 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Агляд

Канал "Расія"
6.30 Формула-730
7.00, 11.00, 13.00, 15.00, 19.00, 22.00 Вестні
7.20 Патрабуюцца... патрабуюцца...
7.30 Час дзелавых людзей
8.00 Навіны АВС
8.25 Кліп-антракт
8.35 Дапеша
9.05 "Язычніцкая мадонна", м/ф (Венгрыя)
10.35 Тэлегазета
10.40 Сялянскае пытанне
12.10, 13.20 "Дзелавая Расія"
14.00 "Сустрэча", "Шаўкавіца", к/ф
15.20 Мульці-пульці
15.50 Там-там навіны
16.05 Свята кожны дзень
16.15 Навука сёння
16.55 Расійская энцыклапедыя
17.25 Выратаванне 911
18.20 Вуснамі дзіцяці
19.25 Падрабязнасці
19.35 "Спрут-6"
20.40 Рэпарцёр
21.00 Без рэтушы
22.20 Рака часу
22.25 Аўтаімгненне
22.30 Спартыўная карусель
22.35 Ніхто не забыты
22.40 ЭКП
22.50 Аніматэка
23.20 Зорны дождж
0.20 Зоркі гавораць

Санкт-Пецярбург
16.40 "Запомні, прынцэса", тэлеспектакль, ч. 1
17.10 "Спячая прыгажуня", рок-опера
17.30 Будні
17.50, 19.25 Музычны момант
17.55 Крыжыкі-нулікі
18.30, 21.30 Інфарм ТБ
18.50 Спорт, спорт, спорт...
19.10 Вялікі фестываль
19.30 "Атэла", м/ф
21.00 Тэлемагазін
21.05 Тэлеслужба бяспекі
21.15 "Золата "Зеніта", д/ф
21.45 Спартыўныя навіны
22.00 Ваш стыль
22.10 "Глушак", м/ф, с. 1
22.40 Ад першай асобы
22.55 "Поль Персан", муж. фільм

ЧАЦВЕР, 24.11

Беларускае тэлебачанне
8.00 Навіны
8.10 Пяць хвілін на жарты
8.15 Дайджэст
8.25, 17.10 "Маё каханне, мой смутак"
9.25 Рок-айленд
10.25, 21.50 "Комікі", с. 23
11.25, 16.40 "Бімбат"
11.55 "Дыназаўрыкі"
12.30 "Джон Рос. Афрыканскія прыгоды", с. 7
13.05 "Пасля 2000 года"
14.00 "Крок: "Карамболь"
14.30 "Пра павучка, з якім ніхто не сябраваў", мульт
14.45 "Зорка з зоркаю гаворыць"
15.50 "Абразы", д/ф
16.10 Тэлебачанне — школе. Геаграфія
17.00 Навіны
18.10 Навіны (Гродна)
18.35 Навіны ВВС
19.10 Урокі беларускай мовы
19.25 Родам з дзяцінства
20.05 Кантакт
20.10 Крымінальная хроніка
20.30 Пяць хвілін на жарты
20.35 Кальханка
21.00 Панарама
21.40 Пад купалам Сусвету
22.50 "Крок"
23.55 НІКа
0.10 Дайджэст
0.20 "Славянскі базар-94", ч. 2

Канал "Астанкіна"
5.30, 7.00 Раніца
6.50, 7.50, 8.50, 9.50, 14.50, 15.50, 17.50, 20.00, 22.50 Навіны
8.00 "Топа Джыджыа"
8.25, 18.30 "Дзікая Роза"
9.00 Баскетбол. ЦСКА — "Панаціналкас" (Грэцыя)
14.00 "Гарачаў і іншыя"
14.25 Хроніка дзелавога жыцця
14.30 Гульня па правілах
14.45 Дазвольце прадставіць
15.00 Мульцітролія
15.30 На балі ў Папялушкі
16.00 Камп'ютар-хол
16.20 "Элен і хлопцы"
16.50 Свет сёння
17.00 ...Да 16 і старэйшым
17.30 Чалавек і закон
17.40, 20.30 Надвор'е
17.45 "Хто ёсць хто. XX стагоддзе". І. Судзк
18.00 Гадзіна пік
18.55 Праграма Э. Разанава
19.40 Добрай ночы, малышы!
20.40 Масква—Крэмль
21.00 Лато "Мільён"
21.30 "Альфрад Шнітке і яго сябры", д/ф, прэм'ера
22.20 "Мір пра Леаніда", м/ф
0.05 Прэс-экспрэс

Канал "Расія"
6.30 Формула-730
7.00, 11.00, 13.00, 15.00, 19.00, 22.00 Вестні
7.20 Патрабуюцца... патрабуюцца...
7.30 Час дзелавых людзей
8.00 Навіны АВС
8.25 Кліп-антракт
8.30 Паехалі
8.40 Ваенны кур'ер
8.55 Зусім сакрэтна
9.45, 19.35 "Санта-Барбара"
10.35 Тэлегазета
10.40 Сялянскае пытанне
11.10, 13.20 Дзелавая Расія
14.00 Выратаванне 911
15.20 Студыя "Рост"
15.50 Там-там навіны
16.05 Свята кожны дзень
16.15 "Гледзячы з Нікіта"
16.55 Жывем і кахаем
17.10 Будні
17.50 У свеце аўта- і мотаспорту
18.20 Пяць хвілін пра добрае жыццё
18.25 Свая гульня
19.25 Падрабязнасці
20.30 Праграма В. Вульфа
21.05 На палітычным Алімпе
22.20 Рака часу
22.25 Аўтаімгненне
22.30 Спартыўная карусель
22.35 "Высокая мода" ў Маскве
22.45 Цікі дом
23.40 Зоркі гавораць

Санкт-Пецярбург
12.00, 14.30, 18.30, 21.30 Інфарм ТБ
12.10 "Таямнічы Ка...", мульт
12.30, 14.45, 17.50, 19.25 Музычны момант
12.25 "Нямецкая хваля"
13.00 Хуткая дапамога
13.30, 22.10 "Глушак", с. 4
14.00 Урок нямецкай мовы
14.15 "Камарыкі", канцэрт
14.50 "Паданне пра зямлю сібірскую", м/ф
16.25 Чароўная лінія
16.40 "Запомні, прынцэса", ч. 4
17.00 "Капрыка", мульт
17.20 Мы і банк
17.55 Гістарычны альманах
18.50 Спорт, спорт, спорт...
19.10 Вялікі фестываль
19.30 "Каўказская палонніца, ці Новыя прыгоды Шурыка", м/ф
20.55 Тэлемагазін
21.05 Тэлеслужба бяспекі
21.15 Фільм-хвілінка
21.45 Спартыўныя навіны
22.00 Ваш стыль
22.40 "Парад парадаў"

ПЯТНІЦА, 25.11

Беларускае тэлебачанне
8.00 Навіны
8.10 Пяць хвілін на жарты
8.15 Дайджэст
8.25 "Кошчын дом", мульт
8.40 Аўта-парк
9.00 Тэлебачанне — школе. Геаграфія
9.30 "Маё каханне, мой смутак"
10.30 "Сёння ў праграме", канцэрт
10.50, 21.40 "Комікі", с. 3, 4
11.50 "Бімбат"
12.10 "Дыназаўрыкі"
12.45 "Джон Рос. Афрыканскія прыгоды", с. 8
13.20 "Пасля 2000 года"
14.15 "Пап-Ці" TV
15.00 "Партрэт у доўг", д/ф
15.25 "Неруш", д/ф
15.35 "Будзь маім сланом", мульт
15.50 Закон і мы
16.30 Шукаем ініцыятыўных
17.00 Навіны
17.10 Тэквандо ў Беларусі
17.35 Дзедка за рэпку
18.10 Навіны (Магілёў)
18.25 Кантакт
18.35 Навіны ВВС
19.10 Эканамікст
19.20 "Ой, у полі азярэчка!.."
19.50 Пяць хвілін на жарты
19.55 У нас дома
20.30 Кальханка
21.00 Панарама
22.40 Пад купалам Сусвету
22.55 НІКа
23.10 "Расстанемся, пакуль добрыя", с. 2
0.20 "Славянскі базар-94", ч. 3
0.50 Дайджэст
1.00 Фестываль джазавай музыкі

Канал "Астанкіна"
5.30, 7.00 Раніца
6.50, 7.50, 8.50, 9.50, 14.50, 17.50, 20.00, 22.50 Навіны
8.00 Сарока
8.25, 18.20 "Дзікая Роза"
9.00 Агарод круглы год
9.30 Іграе Смаленскі аркестр рускіх народных інструментаў
14.00 "Гарачаў і іншыя"
14.25 Хроніка дзелавога жыцця
14.30 Улада і рэформа
14.45 Наш прагноз
15.00 "Не пакідай", м/ф, с. 1
16.25 Рок-урок
16.50 Свет сёння
17.00 Чалавек і закон
17.30 Спяваё Н. Салахава
17.40, 20.30 Надвор'е
17.45 "Хто ёсць хто. XX стагоддзе". Пеле
18.00 Бэмонд
18.50 Поле цудаў
19.40 Добрай ночы, малышы!
20.40 Чалавек тыдня
21.00 "Вуліцы Сан-Францыска"
22.05 "Погляд"
23.05 50 х 50
23.50 Прэс-экспрэс

Канал "Расія"
6.30 Формула-730
7.00, 11.00, 13.00, 15.00, 19.00, 22.00 Вестні
7.20 Патрабуюцца... патрабуюцца...
7.30 Час дзелавых людзей
8.00 Навіны АВС
8.25 Паехалі
8.35 Без рэтушы
9.30 Музыка на дасэрт
9.45, 19.35 "Санта-Барбара"
10.35 Тэлегазета
10.40 Сялянскае пытанне
11.10, 13.20 Дзелавая Расія
14.00 "Калі іграла Баха", "Манька", к/ф
15.20 Студыя "Рост"
15.50 Там-там навіны
16.05 Свята кожны дзень
16.15 Новая лінія
16.55 Дысней па пятніцах
18.40 Відэапазэзія. З. Гіпіус
18.50 Ніхто не забыты
19.25 Падрабязнасці
20.30 Джэнтльмен-шоу
21.05 "К-2": "Пацалунак у дыяфрагму"
22.20 Рака часу
22.35 Аўтаімгненне
22.30 Спартыўная карусель
22.35 "Высокая мода" ў Маскве
22.45 Зоркі гавораць
22.50 "Бальвізэр", м/ф (Германія)

Санкт-Пецярбург
12.00, 14.30, 18.30, 21.30 Інфарм ТБ
12.10 Чароўная лінія
12.25 "Нямецкая хваля"
12.50, 14.45, 17.50, 19.25 Музычны момант
13.00 Хуткая дапамога
13.30, 22.10 "Глушак", с. 5
14.00 "Горад упадарунак", муз. фільм
14.50 "Каўказская палонніца, ці Новыя прыгоды Шурыка", м/ф
16.10 "Такая далёкая блізкая мешчара", д/ф
16.20 "Дзмітрый Гнацюк"
17.20 Па ўсёй Расіі
17.30 Рознакаляровы сабака
17.55 Храм
18.50 Спорт, спорт, спорт...
19.10 "Чао, Федэрыка", прэм'ера фільма пра Ф. Феліні
21.05 Тэлемагазін
21.10 Тэлеслужба бяспекі
21.20 "Вяртанне залатой рыбкі", мульт
21.45 Спартыўныя навіны
22.00 Ваш стыль
22.40 "Добрыя дзеці", м/ф (ЗША)

СУБОТА, 26.11

Беларускае тэлебачанне
8.00 Навіны
8.10 Эканамікст
8.20 Пяць хвілін на жарты
8.25 Аэробіка
8.55 Дайджэст
9.05 "Таміра" прапануе: рэтраспектыва фільмаў У. Матыля. "Расстанемся, пакуль добрыя", с. 2
10.15 Здароўе
10.50 Паказвае Магілёў
11.20 20 мінут рэдактара
11.40 Белыя і чорныя
12.10 Шматгалоссе
13.10 Архіварыус
13.35 Белая Русь...чорная быль
14.05 "Лулу—анёл кветак"
14.40 "Званы пекла"
15.10 Сітуацыя
15.50 Сваімі рукамі
16.00 Памяць намі, жанчынамі
16.45 "Песню бярыце з сабою", ч. 2
17.55 Тэлекрама
18.05 "Чарапашкі ніндзя"
18.30 Фаварыты года
18.45 Пяць хвілін на жарты
19.00 "Нов і К"-топ-10
20.00 Міжнародныя спартыўныя навіны
20.30 Кальханка
21.00 Панарама
21.35 "Драпежнікі", м/ф
23.05 Пад купалам Сусвету
23.15 Валейбол. Беларусь — Славенія
23.55 "Баль", м/ф (Францыя—Італія)
1.40 "Каскад"
2.00 Відзьма-нявідзьма

Канал "Астанкіна"
6.30 Раніца дзелавога чалавека
7.15 У свеце матораў
7.45 Слова пастыра
8.00 "Марафон-15"
8.30 Кампанія "Мір"
10.00 Раніцная пошта
10.30 Авіякасмічны салон
10.45 Без паўзы
10.55 Смак
11.10 Пераадоленне
11.40 "Гісторыя Асі Клячкінай, якая кахала, ды не выйшла замуж", м/ф
13.50, 22.50, 23.50 Навіны
14.00 Дыялог у прамым эфіры
14.40 "Спасціжэнне дэмакратыі", ч. 8
15.40 "Служэнне муз не церпіць мітусні"
16.15 У свеце жывёл
16.55 Брэйн-рынг
17.50 Да і пасля...
18.40, 20.45 "Каманда ў капелюшах"
19.40 Добрай ночы, малышы!
20.00 Навіны плюс
20.35, 23.00 Надвор'е
21.45 Што? Дзе? Калі?
23.05 Хіт-парад у Астанкіна

Канал "Расія"
7.00, 13.00, 19.00, 22.00 Вестні
7.25 Мульці-пульці
7.40 Студыя "Рост"
8.10 Расійскае бюро падарожжаў
8.55 Парламенцкі тыдзень
9.40 Рэтра-шлягер
10.10 Да Масквы — далёка
10.55 "Лялька", м/ф (Польшча), с. 1
12.15 Гаіці: рэспубліка — дыктатура
12.35 Тэлеэрудыт
12.40 Сялянскае пытанне
13.20 Дэ факта
13.35 "Эдэра"
14.30 Футбол без межаў
15.15 Тэлеэрудыт
15.20 Парк-ТБ
16.10 "Тацяна і зямля Рэйнгаў", д/ф
16.40 Інтэрв'ю прэзідэнта ФРГ Р. Херцага
16.45 "Карлік Нос", мульт
17.10 "Вінаваты", м/ф
18.45 Свята кожны дзень
19.25 "Пілат і іншыя", м/ф
21.05 Двайны партрэт
22.20 Рака часу
22.25 Аўтаімгненне
22.30 Спартыўная карусель
22.35 "Высокая мода" ў Маскве
22.45 Праграма "А"
23.45 Зоркі гавораць
23.50 "Я хачу толькі, каб вы мяне кахалі", м/ф (Германія)

Санкт-Пецярбург
8.55 "Гадзіна Фрэйзера"
9.30 Чароўная лінія
9.45 "Шлях на Паўднёвы Захад", м/ф
11.05 Мультфільмы
11.30 "Падарожжа ў краіну Чаянава", д/ф
12.25 "Рандэву". С. Галанін
13.00 Хуткая дапамога
13.30 "Тугі вузел", м/ф
15.10 Я і мой сабака
15.25 "Саліст", канцэрт
15.55 "1244, 1245, 1246", "Канцэрт па заяўках", д/ф
16.50 "Паўночная казка", мульт
16.55 "Сем пятніц на тыдні"
17.10 Казка за казкай
17.40 Экспрэс-кіно
17.55, 21.15 "Уік-энд з дэтэктывам"
18.30, 21.30 Інфарм ТБ
18.50 "Фіеста", т/ф
19.10 Вялікі фестываль
19.30 "Страсці", м/ф
21.05 "Вулічныя музыканты", т/ф
21.45 Ваш стыль
21.55 "Не хочаш — не глядзі"
23.05 "Цыганскі барон", муз. фільм

НЯДЗЕЛЯ, 27.11

Беларускае тэлебачанне
8.00 Аэробіка
8.30 Добрыя весткі
8.40 Пяць хвілін на жарты
8.45 Слова да чалавека
9.15 Урокі здароўя
9.35 Беларускі тур
9.55 Пра шахматы і шахматыстаў
10.15 "АВС-клуб"
10.30 Тэлекафэ "Мая мама"
11.00 Мультклуб
11.30 "Тэлебом-біс"
12.10 Прэм'ера сімфоніі N 9 Д. Смольскага
13.00, 14.10 "Мядовы месяц"
13.40 "Тэатральны раман", к/ф
14.55 Праспект
15.25 Тэлеклуб "Гаў-гаў"
15.50 Дзелавы веснік
16.05 "Радавод"
17.05 "Чарапашкі ніндзя"
17.30 "Усё за ўсмешку"
18.05 "Мужчына і жанчына", м/ф (Францыя)
19.45 "Фаварыты года"
20.00 Панарама
20.40 Кальханка
21.00 Пяць хвілін на жарты
21.10 Пад купалам Сусвету
21.20 Вячэрні роздум
21.30 "Шоу-Пілігон"
21.55 "Шок", м/ф (ЗША)
23.35 Фестываль джазавай музыкі

Канал "Астанкіна"
7.15 Алімпійская раніца
7.50 Спортлато
8.00 Марафон-15
8.30 Раным-рана
9.00 Пілігон
9.30 Пакуль усе дома
10.00 Хрустальны чаравічак
10.50 Экстра-НЛА
11.20 Люстэрка
11.55 "Вясёлка"
12.30 Эканоміка і рэформы
13.00 "Падводная адысея каманды Кусто"
13.50, 17.00, 22.50, 23.50 Навіны
14.00 "Стратэгія Перамогі", ч. 9
14.55 "Шпаргалка" з падарункам
15.10 Клуб падарожнікаў
16.00 Трамвай-жаданне
16.30 Амерыка з М. Таратутам
17.10 Тэлелоцыя
17.25 Мультсэрыялы (ЗША)
18.25 Надвор'е
18.30 Уся Расія
19.05 "Слова паліцэйскага", м/ф (Францыя)
21.00 Нядзеля
21.50 Спартыўны ўік-энд
22.05 Музыка ў эфіры
23.00 Сёння
24.00 Музагляд

Канал "Расія"
7.00, 13.00, 19.00, 22.00 Вестні
7.30 Студыя "Рост"
8.00 Непазнаны Сусвет
8.30 Добрай раніцы, Еўропа
9.00 Аміка верытас
9.45 Аты-баты...
10.15 Рускае лато
11.00 "Лялька", с. 2
12.25 Людзі
12.40 Шэсць сотак
13.20 "Не высечы..."
13.35 "Эдэра"
14.30 Тэатр аднаго мастака
14.50 Лепшыя гульні НБА
15.50 Свята кожны дзень
16.00 У свеце жывёл
17.00 Чароўны свет Дысней
18.00 Каробка перадач
18.15 У пошуках літаратуры
19.25 "Усплёск", м/ф (ЗША)
21.25 У Ксюшы
22.20 Рака часу
22.25 Аўтаімгненне
22.30 Спартыўная карусель
22.35 "Высокая мода" ў Маскве
22.45 Поўня
23.45 Зоркі гавораць

Санкт-Пецярбург
8.55 "Гаючае слова"
9.30 Чароўная лінія
9.45 "Дзень нараджэння", мульт
10.00 Экспрэс-кіно
10.15, 21.55 "Паглядзім..."
10.30 "Дачыненне", т/ф
11.00 Нядзельны лабірынт
12.30 "Музей Д'Орса", д/ф (Францыя)
13.30 "Хто раскажа небыліцу", мульт
13.40 "Тэлеклуб "Класіка"
15.25 Чэмпіянат Італіі па футболе
17.20 "Мой бацька гаварыў мне...", т/ф
18.15 "Сінюшчын калодзеж", мульт
18.45 Залаты ключ
18.55 Тэатральная правінцыя
19.30 Інфарм ТБ
19.50 "Коні ў акіяне", м/ф
21.25 Ваш стыль
21.50 Адамаў яблык
22.50 "Адкрыццё Івана Яфрэмава", д/ф

21-27 лістапада